# Кіраўніцтва па выкарыстанні Еўрапейскай сістэмы пераносу і назапашвання крэдытаў (ECTS)
# 2015 г.

*Еўрапейская прастора вышэйшай адукацыі (EHEA)*

*Балонскі працэс*

*Еўрапейская камісія*

## Змест


Уводзіны……………………………………………………………………………………………………………………..4

Раздзел 1. Асноўныя характарыстыкі Еўрапейскай сістэмы назапашвання і пераносу крэдытаў (ECTS)……………………………………………………………………………………………………………6

Раздзел 2. ECTS і Еўрапейская прастора вышэйшай адукацыі (EHEA)………………………….…..8

Раздзел 3. Выкарыстанне ECTS пры праектаванні, рэалізацыі і маніторынгу праграм..10

3.1. Кантэкст праграмы ...............................................................................................11

3.2 Профіль праграмы ..................................................................................................13

3.3. Рэзультаты навучання па праграме ....................................................................15

3.4. Структура праграмы і размеркаванне крэдытаў………………………………………………..16

3.5 Навучанне, выкладанне і ацэнка ..........................................................................18

3.6 Маніторынг размеркавання крэдытаў……………………………………………………………….20

Раздзел 4. ECTS для праграм мабільнасці. Прызнанне крэдытаў ....................................21

4.1 Мабільнасць ў рамках праграм, якія вядуць да атрымання ступеняў …………………..21

4.2 Крэдытная (акадэмічная) мабільнасць...................................................................24

4.2.1 Напярэдадні крэдытнай (акадэмічнай) мабільнасці ...............................................25

4.2.2 Перыяд пасля крэдытнай мабільнасці………………………………………………………………..26

4.2.3 Інстытуцыйныя правілы і палажэнні………………………………………………………………….27

4.3 Размеркаванне адзнак .............................................................................................29

4.4 Канвертацыя адзнак ........................................... ...................................................31

Раздзел 5. ECTS і навучанне на працягу ўсяго жыцця .....................................................32

5.1 Навучанне на працягу ўсяго жыцця - магчымасці адкрытага навучання……………...32

5.2 Прызнанне папярэдняга навучання і досведу………………………………………………………..34

Раздзел 6. ECTS і забеспячэнне якасці ............................................................................37

Раздзел 7. Ключавыя дакументым ECTS..............................................................................40

7.1 Каталог курсаў...........................................................................................................40

7.2 ECTS і суправаджальныя дакументы па акадэмічнай мабільнасці……………………….43

7.2.1 Пагадненне пра навучанне для праграм акадэмічнай мабільнасці. ....................44

7.2.2 Падпісанне Пагаднення пра навучанне для праходжання працоўнай стажыроўкі…………………………………………………………………………………………………………. 44

**7.3 Акадэмічная даведка……………………………………………………………………………………….47**

**7.4 Сертыфікат пра праходжанне стажыроўкі………………………………………………………….49**

**Удзячнасць……………………………………………………………………………………………………………..50**

**Дадатак 1: Гласарый ..........................................................................................51**

**Дадатак 2: Прыклады канвертацыі адзнак ......................................................63**

**Дадатак 3: Бібліяграфія ......................................................................................65**

**Дадатак 4: Профілі адукацыйных праграм.......................................................70**

**Дадатак 5: Прыклады рэзультатаў навучання……………………………………………………...81**

## Уводзіны

*Еўрапейская сістэма пераносу і назапашвання крэдытаў (ECTS) з'яўляецца інструментам Еўрапейскай прасторы вышэйшай адукацыі (ЕНЕА/ЕПВА), накіраваным на павышэнне празрыстасці навучальнага працэсу і курсаў, што садзейнічае павышэнню якасці вышэйшай адукацыі.*

Еўрапейская сістэма пераносу і назапашвання крэдытаў была ўведзена ў 1989 годзе ў рамках праграмы “Эразмус” як спосаб пераносу крэдытаў, атрыманых студэнтамі падчас вучобы за мяжой, для іх прызнання ў ВНУ, якія накіравалі іх за мяжу. У наступныя гады сістэма стала выкарыстоўвацца не толькі для пераносу крэдытаў (на аснове працавыдаткаў і дасягнутых рэзультатаў навучання), але і для іх назапашвання ў рамках праграм вышэйшай адукацыі. ECTS дапамагае распрацоўваць, апісваць і рэалізоўваць праграмы, дазваляючы інтэграваць розныя тыпы навучання ў працэс адукацыі на працягу ўсяго жыцця, а таксама спрыяе развіццю мабільнасці студэнтаў шляхам спрашчэння працэсу прызнання кваліфікацыяў і перыядаў навучання. Сістэма можа быць прыменена да ўсіх праграм, незалежна ад спосабу рэалізацыі адукацыйнага працэсу (аўдыторнае навучанне, навучанне на працоўным месцы, дыстанцыйнае навучанне), формы навучання (вочна-завочнай і завочнай) або тыпу навучання (фармальнае, нефармальнае і спантаннае).

Кіраўніцтва па выкарыстанні Еўрапейскай сістэмы пераносу і назапашвання крэдытаў змяшчае рэкамендацыі па выкарыстанні дадзенай сістэмы, а таксама спасылкі на карысныя суправаджальныя дакументы. Па запыту міністраў адукацыі краін Балонскага працэса, выкладзеным у Бухарэсцкім камюніке ў 2012г[1]., Кіраўніцтва па выкарыстанні Еўрапейскай сістэмы пераносу і назапашвання крэдытаў (ECTS) 2009 года было перагледжана з мэтай узмацнення "паўнавартаснага выкарыстання рэзультатаў навучання” у краінах Еўрапейскай прасторы вышэйшай адукацыі. Новае Кіраўніцтва адказвае на заклік міністраў да адукацыйных арганізацыяў па “узмацненні ўзаемасувязі паміж акадэмічнымі крэдытамі, рэзультатамі навучання і працавыдаткамі студэнтаў, а таксама ўключэнні рэзультатаў навучання ў працэдуры ацэнкі”. Абноўленая версія грунтуецца на рэзультатах вялікай працы, праведзенай цягам апошніх гадоў у рамках Балонскага працэса і ў асобных краінах, і мае сваёй мэтай аказанне дапамогі акадэмічнай супольнасці і іншым зацікаўленым бакам у сферы вышэйшай адукацыі ў іх прасоўванні ў напрамку змяненняў у рамках Балонскага працэса.

Абноўленае Кіраўніцтва ўлічвае такія апошнія дасягненні Балонскага працэса, як стварэнне Еўрапейскай прасторы вышэйшай адукацыі (ЕНЕА), укараненне і замацаванне навучання на працягу ўсяго жыцця, змяненне парадыгмы вышэйшай адукацыі з арыентаванай на выкладчыка на парадыгму, арыентаваную на студэнта, больш шырокае выкарыстанне рэзультатаў навучання і развіццё новых форм навучання і выкладання. Асаблівая ўвага нададзена распрацоўцы і рэалізацыі адукацыйных праграм, з улікам досведу вышэйшых навучальных установаў у сферы выкарыстання рамак кваліфікацыяў і прымянення прынцыпаў ECTS у акадэмічнай практыцы.

---

[1] 1 http://www.ehea.info/uploads/(1)/bucharest%252520communique%2525202012(2).pdf

Кіраўніцтва прызначана для студэнтаў, акадэмічнага і адміністрацыйнага персаналу адукацыйных арганізацыяў, а таксама пастаўшчыкоў адукацыйных паслуг, працадаўцаў і іншых зацікаўленых бакоў. Для зручнасці чытання, тэрмін “студэнт” выкарыстоўваецца для пазначэння ўсіх асобаў, якія навучаюцца ў вышэйшай школе (па вочнай або завочнай форме, дыстанцыйна, аўдыторна або на працоўным месцы з мэтай атрымання кваліфікацыі або засваення асобных частак адукацыйнай праграмы альбо курсаў).

Абноўленае Кіраўніцтва было падрыхтавана рабочай групай практыкуючых спецыялістаў, прызначаных краінамі-удзельніцамі Балонскага працэсу і аб'яднаннямі зацікаўленых бакоў. Яно было пададзена для ўзгаднення аб'яднанням зацікаўленых бакоў, экспертам краін Еўрапейскай прасторы вышэйшай адукацыі, а таксама Назіральнай групе па Балонскім працэсе.

Каардынатарам працэсу распрацоўкі і кансультацый выступіла Еўрапейская камісія. У выніку, Кіраўніцтва было зацверджана міністрамі адукацыі краін Еўрапейскай прасторы вышэйшай адукацыі на Ерэванскай канферэнцыі на ўзроўні міністраў у 2015 годзе. Такім чынам, дадзенае Кіраўніцтва па прымяненні Еўрапейскай сістэмы назапашвання і пераносу крэдытаў (ECTS) з'яўляецца афіцыйным дакументам.

## Раздзел 1. Асноўныя характарыстыкі Еўрапейскай сістэмы назапашвання і пераносу крэдытаў (ECTS)

***Еўрапейская сістэма назапашвання і пераносу крэдытаў (ECTS)*** *з'яўляецца арыентаванай на студента сістэмай назапашвання і пераносу крэдытаў, заснаванай на прынцыпе празрыстасці навучання, выкладання і ацэнкі. Яе мэта - спрыяць планаванню, рэалізацыі і ацэнцы адукацыйных праграм і мабільнасці студэнтаў праз прызнанне іх дасягненняў у навучанні, кваліфікацыяў і перыядаў навучання.*

**Крэдыты ECTS** выражаюць аб'ём навучання на аснове пацверджаных рэзультатаў навучання і звязаных з імі працавыдаткаў. 60 крэдытаў ECTS адпавядаюць рэзультатам навучання і працавыдаткам поўнага года навучання па вочнай форме або іх эквіваленце, які звычайна ўключае шэраг адукацыйных кампанентаў, якім прысвойваюцца крэдыты на аснове рэзультатаў навучання і працавыдаткаў. Крэдыты звычайна выражаюцца ў цэлых лічбах.

**Рэзультаты навучання** - гэта зацвярджэнне ведаў, разумення і здольнасцяў, якія можа прадэманстраваць студэнт пасля завяршэння працэсу навучання. Дасягненне рэзультатаў навучання павінна ацэньвацца з дапамогай працэдур, заснаваных на дакладных і празрыстых крытэрах. Рэзультаты навучання адносяцца як да асобных кампанентаў праграмы, так і да праграмы ў цэлым. Яны таксама выкарыстоўваюцца ў еўрапейскіх і нацыянальных рамках кваліфікацыяў для апісання ўзроўню кваліфікацыі навучэнца.

**Працавыдаткі** - гэта прыблізная ацэнка часу, які патрабуецца стандартнаму навучэнцу для выканання ўсіх відаў навучальнай дзейнасці, такіх як лекцыі, семінары, праекты, практычныя заданні, стажыроўкі на працоўным месцы[2] і самастойная праца, неабходных для дасягнення верагодных рэзультатаў навучання ў рамках фармальнай адукацыі. Адпаведнасць працавыдаткаў у аб'ёме 60 крэдытаў ECTS аднаму году поўнай формы навучання ў рамках фармальнай адукацыі звычайна заканадаўча замацавана на нацыянальным узроўні. У большасці выпадкаў працавыдаткі студэнтаў вар'іруюць паміж 1500 - 1800 гадзінамі акадэмічнага года і, такім чынам, адзін крэдыт адпавядае 25 - 30 гадзінам. Варта разумець, што гаворка ідзе пра тыповыя працавыдаткі; пры гэтым працавыдаткі кожнага студэнта па дасягненні рэзультатаў навучання будуць адрознівацца.

**Размеркаванне крэдытаў** - гэта працэс прыпісвання пэўнай колькасці крэдытаў кваліфікацыям, адукацыйнай праграме або асобным кампанентам праграмы. Крэдыты размяркоўваюцца па цэласных кваліфікацыях або праграмах у адпаведнасці з нацыянальным заканадаўствам або практыкай, дзе гэта магчыма, і са спасылкай на нацыянальныя і/або еўрапейскія рамкі кваліфікацыяў. Яны размяркоўваюцца па асобных адукацыйных кампанентах (частка курса, дысертацыя, навучанне на працоўным месцы, стажыроўка), зыходзячы з таго, што 60 крэдытаў роўныя аднаму акадэмічнаму году поўнай формы навучання, у адпаведнасці з намінальнымі працавыдаткамі, неабходнымі для дасягнення ўстаноўленых рэзультатаў навучання па кожным кампаненце.

---

[2] У арыгінальным тэксце Кіраўніцтва тэрміны “стажыроўка на працоўным месцы” ці “прыём на працу” (*work placement* or *placement*), “перыяд навучання” (*training period*), “навучальная стажыроўка, інтэрнатура” (*internship*) і “вучнёўства” (*traineeship*) ужываюцца як сінонімы.

**Прысуджэнне крэдытаў ECTS** - гэта акт фармальнага надання крэдытаў, прызначаных для кваліфікацыі і/або яе кампанентаў, студэнтам і іншым навучэнцам, калі яны дасягаюць вызначаных рэзультатаў навучання. Нацыянальныя органы ўлады павінны пазначыць, якія ўстановы маюць права прысуджаць крэдыты. Крэдыты прысуджаюцца кожнаму студэнту пасля завяршэння ім неабходнай навучальнай дзейнасці і дасягнення зададзеных рэзультатаў навучання, што пацвярджаецца адпаведнай адзнакай. Калі студэнты і іншыя навучэнцы дасягаюць рэзультатаў навучання ў іншым фармальным, нефармальным або спантанным адукацыйным кантэксце або ў іншыя тэрміны, крэдыты могуць быць прысуджаны праз ацэнку і прызнанне гэтых рэзультатаў навучання.

**Назапашванне крэдытаў ECTS** - гэта працэс набору крэдытаў, якія прысуджаюцца за дасягненне рэзультатаў навучання па адукацыйных кампанентах у фармальным кантэксце і за іншую навучальную дзейнасць у нефармальным і спантанным кантэксце. Студэнт[3] можа назапашваць крэдыты для:

- атрымання кваліфікацыі ў адпаведнасці з патрабаваннямі адукацыйнай установы, якая выдае дыпломы;

- пацверджання асабістых дасягненняў у рамках навучання на працягу ўсяго жыцця.

**Перанос крэдытаў** - гэта працэс прызнання крэдытаў, атрыманых у адным кантэксце (праграма, адукацыйная арганізацыя), у іншым фармальным кантэксце з мэтай атрымання кваліфікацыі. Крэдыты, атрыманыя студэнтам па адной праграме, могуць быць перанесены для іх назапашвання ў рамках іншай праграмы, якая рэалізуецца той жа або іншай адукацыйнай установай. Перанос крэдытаў з'яўляецца ключавым момантам паспяховай акадэмічнай мабільнасці. ВНУ, факультэты, кафедры і падраздзяленні могуць заключаць пагадненні, якія гарантуюць аўтаматычнае прызнанне і перанос крэдытаў.

**Дакументацыя Еўрапейскай сістэмы пераносу і назапашвання крэдытаў**

Выкарыстанне сістэмы назапашвання крэдытаў ECTS і забеспячэнне яе якасці абапіраецца на шэраг ключавых дакументаў: Каталог курсаў, Пагадненне пра навучанне, Акадэмічная даведка і Пагадненне пра праходжанне стажыроўкі на працоўным месцы. Карыстанне сістэмай ECTS таксама спрыяе большай празрыстасці іншых дакументаў, такіх як Дадатак да дыплома.

[3] Пытанне пра тое, ці павінна ісці гаворка пра "студэнтаў" або "навучэнцаў", падрабязна абмяркоўвалася рабочай групай і з зацікаўленымі бакамі. Узгодненая пазіцыя заключаецца ў прызнанні і вітанні таго факту, што вышэйшая адукацыя рухаецца ў напрамку больш гнуткіх форм рэалізацыі, а таксама ў прызнанні таго, што большасць сістэм вышэйшай адукацыі сфармаваліся на базе забяспечвання фармальнай адукацыі для выразна акрэсленага кантынгенту студэнтаў. Паколькі выкарыстанне ў Кіраўніцтве аднаго толькі тэрміна "навучэнец" было палічана заўчасным, тэрмін "студэнт" таксама выкарыстоўваецца для абазначэння ўсіх навучэнцаў у ВНУ (па поўнай ці няпоўнай форме навучання, на дыстанцыйным навучанні, аўдыторна ва ўніверсітэце або на працоўным месцы для атрымання кваліфікацыі, або для засваення асобных частак праграмы або курсаў).

## Раздзел 2. ECTS і Еўрапейская прастора вышэйшай адукацыі (EHEA)

*У 1999 годзе Балонская дэкларацыя ўключыла Еўрапейскую сістэму пераносу і назапашвання крэдытаў (ECTS) у шэраг асноўных мэтаў, якія павінны быць дасягнутыя краінамі - членамі Балонскага працэса. Дзякуючы рэформам, праведзеным у рамках гэтага працэсу, ECTS стала ключавым інструментам Еўрапейскай прасторы вышэйшай адукацыі (EHEA).*

ECTS прынятая ў якасці нацыянальнай сістэмы крэдытаў у большасці краін Еўрапейскай прасторы вышэйшай адукацыі. У іншых рэгіёнах свету яна ўсё часцей выкарыстоўваецца ўстановамі адукацыі або паспяхова ўзаемадзейнічае з нацыянальнымі крэдытнымі сістэмамі[4], заснаванымі на параўнальных крытэрах, і, такім чынам, адыгрывае важную роль у сферы адукацыі на міжнародным узроўні.

На Еўрапейскай прасторы вышэйшай адукацыі, сістэма назапашвання крэдытаў дапамагае рабіць адукацыйны працэс празрыстым і зразумелым для навучэнцаў. Такім чынам, сістэма ECTS адыгрывае эфектыўную ролю ў стымуляванні змяненняў і працэсе мадэрнізацыі, паколькі яе прымяненне спрыяе змене парадыгмы адукацыі ад арыентаванага на выкладчыка падыходу да падыходу, арыентаванага на студэнта. Гэты падыход выражаецца тэрмінам “навучанне, арыентаванае на студэнта” (SCL) і прызнаны ў якасці асноватворнага прынцыпу Еўрапейскай прасторы вышэйшай адукацыі.

Выкарыстанне ў ECTS рэзультатаў навучання і працавыдаткаў пры распрацоўцы і рэалізацыі праграм змяшчае студэнта ў цэнтр адукацыйнага працэсу. Больш за тое, выкарыстанне крэдытаў палягчае стварэнне і замацаванне гнуткіх траекторыяў навучання, што павышае самастойнасць і адказнасць студэнтаў.

Дзякуючы падыходу, заснаванаму на дасягненні рэзультатаў, выкарыстанне сістэмы ECTS праследуе і іншыя мэты ў рамках адукацыйнай прасторы EHEA. А менавіта:

- садзейнічае прызнанню папярэдне атрыманай адукацыі і досведу і з'яўляецца стымулам для засваення і ўдзелу ў адукацыйных праграмах з мэтай пашырэння навучання на працягу ўсяго жыцця;

- умацоўвае сувязь паміж адукацыйнымі праграмамі і патрэбамі грамадства, і паляпшае ўзаемадзеянне ўсіх зацікаўленых бакоў, уключаючы сферу працы і грамадства ў цэлым;

- садзейнічае мабільнасці ў рамках адукацыйнай арганізацыі або краіны, паміж адукацыйнымі арганізацыямі, краінамі, або паміж рознымі сектарамі сістэмы адукацыі і навучальнымі кантэкстамі (фармальным, нефармальным, спантанным або навучаннем на працоўным месцы) дзякуючы прызнанню і пераносу крэдытаў.

[4] Сістэма ECTS стымулявала развіццё сістэмы крэдытаў у іншых рэгіёнах: у Паўднёва-Усходняй Азіі і ў Лацінскай Амерыцы, і зусім нядаўна ў Афрыцы.

У нацыянальным заканадаўстве выкарыстанне ECTS можа быць патрабаваннем для акрэдытацыі праграм або кваліфікацыяў вышэйшай адукацыі.

**Nota Bene**

Навучанне, арыентаванае на студэнта (SCL) - гэта працэс якаснай трансфармацыі студэнтаў і іншых навучэнцаў, накіраваны на ўзмацненне іх здольнасцяў незалежнага і крытычнага мыслення за кошт выкарыстання падыходу, заснаванага на дасягненні рэзультату.

Канцэпцыя SCL можа быць коратка ахарактарызавна наступным чынам:

- апора на актыўны ўдзел студэнта ў адукацыйным працэсе
- акцэнт на крытычным мысленні студэнта, аналітычным засваенні і разуменні матэрыяла
- павышэнне адказнасці і падсправаздачнасці студэнта
- рост самастойнасці студэнта
- рэфлексіўны падыход да працэсу навучання і выкладання, як з боку выкладчыка, так і з боку студэнта

## Раздзел 3. Выкарыстанне ECTS пры праектаванні, рэалізацыі і маніторынгу праграм

*У гэтым раздзеле разглядаецца распрацоўка адукацыйных праграм вышэйшымі навучальнымі ўстановамі або іншымі  пастаўшчыкамі адукацыйных паслуг. Выкарыстанне крэдытаў ECTS дапамагае ў распрацоўцы праграм дзякуючы інструменту павышэння празрыстасці навучання і, такім чынам, спрыяе больш гнуткаму падыходу да праектавання і распрацоўкі адукацыйных праграм.*

З інстытуцыйнага пункту гледжання, распрацоўка праграмы азначае планаванне адукацыйнай праграмы і яе кампанентаў у крэдытах, з пазначэннем рэзультатаў навучання і адпаведных працавыдаткаў, відаў навучальнай дзейнасці, метадаў навучання і працэдур/крытэраў ацэнкі. Інстытуцыйная крэдытная рамка павінна адказваць патрэбам розных праграм і адпавядаць паміж- і мульцідысцыплінарным падыходам.

Прымяненне ECTS у адукацыйных арганізацыях патрабуе выкарыстання інстытуцыйнай крэдытнай рамкі, заснаванай на палажэннях адукацыйнай установы, і глыбокага разумення сістэмы кожным членам акадэмічнага калектыву. Некаторыя ўстановы забяспечваюць такое разуменне шляхам рэгулярных курсаў павышэння кваліфікацыі супрацоўнікаў. Камандныя рашэнні пры распрацоўцы праграмы павышаюць цэласнасць праграмы.

**Nota Bene**

**Незалежны навучэнец** можа назапашваць крэдыты, неабходныя для прысуджэння кваліфікацыі, з дапамогай розных форм навучання. Яна/Ён можа набываць неабходныя веды, уменні і кампетэнцыі ў фармальным, нефармальным і спантанным кантэксце, у выніку наўмыснага рашэння або як рэзультат розных навучальных мерапрыемстваў на працягу пэўнага часу. Навучэнец можа выбіраць адукацыйныя кампаненты без непасрэднай мэты атрымання афіцыйнай кваліфікацыі. ECTS падтрымлівае гэты працэс, як апісана ў Раздзеле 5.

Наступныя меры рэкамендуюцца для забеспячэння працэсаў распрацоўкі адукацыйных праграм.

## 3.1. Кантэкст праграмы

Пры распрацоўцы новай праграмы, перш за ўсё вызначаецца ўзровень кваліфікацыі, якая прысуджаецца. Узровень кваліфікацыі вызначаецца на аснове адпаведнага нацыянальнага заканадаўства і існуючых рамак кваліфікацыяў (еўрапейская, нацыянальная, галіновая, інстытуцыйная).

Відавочна, не ўсе рэзультаты навучання будуць на адным узроўні - а значыць, паўнавартаснае ўкараненне сістэмы крэдытаў патрабуе дэскрыптараў узроўняў.

**Nota Bene**

Існуе дзве еўрапейскіх рамкі кваліфікацыяў: Рамка кваліфікацыяў Еўрапейскай прасторы вышэйшай адукацыі (QF-EHEA) і Еўрапейская рамка кваліфікацыяў Еўрапейскага саюза для навучання на працягу ўсяго жыцця (EQF-LLL). Абедзве рамкі выкарыстоўваюць рэзультаты навучання для апісання кваліфікацыі (напрыклад, бакалаўр, магістр, доктар) і сумяшчальныя адна з адной у тым, што датычыць вышэйшай прафесійнай адукацыі (узроўні 1, 2 і 3 Рамкі кваліфікацыяў QF-EHEA адпавядаюць узроўням 6, 7 і 8 Еўрапейскай рамкі кваліфікацыяў EQF-LLL) і ахопліваюць кваліфікацыі 6, 7, 8 узроўняў Міжнароднай стандартнай класіфікацыі адукацыі ISCED.

Рамка кваліфікацыяў **QF-EHEA** вызначае і апісвае тры асноўныя цыклы адукацыі, гэтаксама як і кароткі адукацыйны цыкл. Асноўныя цыклы апісаны з дапамогай так званых Дублінскіх дэскрыптараў, якія ўключаюць у сябе такія здольнасці і веды, як прымяненне ведаў і разумення, аргументацыя і ўменне рабіць высновы, камунікатыўныя навыкі і ўменне вучыцца. Кароткі, першы і другі цыклы таксама характарызуюцца наступнымі дыяпазонамі крэдытаў:

- Кваліфікацыі кароткага цыкла звычайна ўключаюць у сябе прыблізна 120 крэдытаў
- Кваліфікацыі першага цыкла звычайна ўключаюць у сябе 180 або 240 крэдытаў
- Кваліфікацыі другога цыкла звычайна ўключаюць 90 або 120 крэдытаў, уключаючы мінімум 60 крэдытаў на ўзроўні другога цыкла
- Прымяненне сістэмы крэдытаў на трэцім цыкле можа адрознівацца.

**EQF-LLL** апісвае "узроўні кваліфікацыі" (без пазначэння дыяпазонаў крэдытаў) і забяспечвае агульную рамку для параўнання нацыянальных сістэм кваліфікацыяў, рамак і іх узроўняў. Дадзеная рамка кваліфікацыяў складаецца з васьмі узроўняў.

- Будучы інструментам для падтрымкі навучання на працягу жыцця, рамка EQF ахоплівае агульную адукацыю і навучанне дарослых людзей, якія не атрымалі сярэднюю адукацыю, прафесійную адукацыю і навучанне, а таксама вышэйшую адукацыю.
- Восем узроўняў ахопліваюць увесь дыяпазон кваліфікацыяў: ад тых, якія атрымліваюць у канцы ўсеагульнай абавязковай адукацыі да тых, якія выдаюцца на самым высокім узроўні акадэмічнай і прафесійна-тэхнічнай або прафесійнай адукацыі і навучання.

- Кожны ўзровень адукацыі павінен быць у прынцыпе дасягальным праз розныя адукацыйныя і кар'ерныя траекторыі.
- Рэзультаты навучання вызначаюцца праз тры катэгорыі - веды, навыкі і кампетэнцыі. Гэта сведчыць пра тое, што кваліфікацыі, у розных іх камбінацыях, ахопліваюць шырокі дыяпазон рэзультатаў навучання, у тым ліку тэарэтычныя веды, практычныя і тэхнічныя навыкі і сацыяльныя кампетэнцыі ў тых сферах дзейнасці, дзе ўменне працаваць з людзьмі мае вырашальнае значэнне.

Розныя цыклы рамкі кваліфікацыяў QF-EHEA звязаныя з узроўнямі рамкі EQF-LLL наступным чынам:

- Кваліфікацыі кароткага цыклу адпавядаюць узроўню 5
- Кваліфікацыі першага цыклу адпавядаюць узроўню 6
- Кваліфікацыі другога цыклу адпавядаюць узроўню 7
- Кваліфікацыі трэцяга цыклу адпавядаюць узроўню 8

Нацыянальныя сістэмы адукацыі могуць уключаць розную колькасць узроўняў (акрамя ўзроўняў, уключаных ва ўсеабдымныя рамкі кваліфікацыяў), паколькі нацыянальныя рамкі суадносяцца з еўрапейскімі рамкамі QF-EHEA і EQF і афіцыйна зацвярджаюцца кожнай краінай індывідуальна. Так, напрыклад, рамка EQF уключае 8 узроўняў, між тым як колькасць узроўняў у рамках нацыянальных праграм у цяперашні час вагаецца ад 7 да 12. Такім чынам, кароткі кваліфікацыйны цыкл уключаны у Рамку кваліфікацыяў QF-EHEA, што не абавязвае краіны ўключаць апісаныя ў ёй кваліфікацыі ў свае адукацыйныя сістэмы. Аднак, заслужвае ўвагі той факт, што многія нацыянальныя рамкі сапраўды ўключаюць кароткі кваліфікацыйны цыкл у свае праграмы.

Усеабдымныя кваліфікацыйныя рамкі, якія прапануюць QF-EHEA і EQF-LLL, павінны быць суаднесеныя з нацыянальнымі і інстытуцыйнымі рамкамі і дэскрыптарамі.

Нацыянальныя рамкі звычайна больш падрабязныя, чым вышэйпазначаныя усёабдымныя рамкі, і адлюстроўваюць увесь спектр кваліфікацыяў вышэйшай адукацыі, якія прапануюцца ў азначанай краіне.

ВНУ, якія прымяняюць ECTS у якасці сістэмы крэдытаў, павінны мець інстытуцыйную рамку, суадносную з нацыянальнымі і міжнароднымі рамкамі кваліфікацыяў. Інстытуцыйная рамка вызначае, якім чынам павінны выкарыстоўвацца крэдыты ECTS. Гэта адбываецца, як правіла, праз усталяванне мінімальнай колькасці крэдытаў для адукацыйнага кампанента ў мэтах палягчэння распрацоўкі між-/мульцідысцыплінарных праграм, якія ствараюцца шляхам аб'яднання адукацыйных кампанентаў, абраных з цэлага спектра дысцыплін. Еўрапейскія і нацыянальныя рамкі кваліфікацыяў адлюстроўваюць узровень выніковай кваліфікацыі. Такім чынам, навучальныя ўстановы прызнаюць, што не ўсе крэдыты, атрыманыя ў працэсе засваення кваліфікацыі, адпавядаюць аднаму і таму ж узроўню ведаў і навыкаў (рэзультаты навучання,

дасягнутыя, напрыклад, на трэцім годзе навучання на ступень бакалаўра, будуць, звычайна, больш высокімі, чым рэзультаты першага года навучання на тую ж ступень). Адначасова з гэтым, адукацыйныя ўстановы могуць усталёўваць прамежкавыя ўзроўні засваення крэдытаў з адпаведнымі дэскрыптарамі, якія, нароўні з правіламі перавода на наступны курс, будуць дапамагаць студэнтам рухацца па ўласнай траекторыі навучання.

Да пачатку дэталёвай распрацоўкі адукацыйнай праграмы і для вызначэння колькасці крэдытаў, праграму неабходна разгледзець у кантэксце заяўленых місіяў факультэта і кафедры і адукацыйнай арганізацыі, прафесійных спецыфікацыяў (адпаведных палажэнняў і патрабаванняў) і інстытуцыйнай акадэмічнай рамкі.

Для вызначэння попыту на праграму, таксама рэкамендуецца правесці аналіз патрэбаў грамадства на яе і пракансультавацца з зацікаўленымі бакамі (працадаўцамі, выпускнікамі, грамадствам у цэлым).

### 3.2 Профіль праграмы

Профіль дадзенай праграмы прэзентуе яе адметныя характарыстыкі (Lokhoff, і іншыя аўтары, 2010 г.). Ён пазначае вобласць (-і) вывучэння (якая (-я) можа (-гуць) быць выражана (-ыя) у кодах Міжнароднай стандартнай класіфікацыі адукацыі ISCED-F), узровень праграмы, яе асноўны накірунак, ключавыя рэзультаты, якіх чакаецца дасягнуць па заканчэнні навучання, навучальнае асяроддзе і асноўныя віды дзейнасці ў галіне навучання, выкладання і ацэнкі. Надежным чынам распрацаваны профіль праграмы прапануе студэнтам і зацікаўленым бакам выразнае разуменне таго, якія агульныя і прадметныя кампетэнцыі яны набудуць і які патэнцыял праграмы з пункту гледжання магчымасцяў працаўладкавання выпускнікоў. Для гэтага рэкамендуецца карэктаваць профіль праграмы сумесна з адпаведнымі зацікаўленымі бакамі (напрыклад, экспертамі з акадэмічнай супольнасці, сацыяльнымі партнёрамі, працадаўцамі, выпускнікамі і прадстаўнікамі студэнцкай супольнасці) і прэзентаваць профіль у яснай і дасціпнай форме.

Профіль павінен быць часткай апісання праграмы, якое ўваходзіць у Каталог курсаў.

**Nota Bene**

На Еўрапейскай прасторы вышэйшай адукацыі, тэрміны "рэзультаты навучання" і "кампетэнцыі" выкарыстоўваюцца з рознымі сэнсавымі адценнямі і ў часткова адрозных сістэмах каардынат.

Для дадзенага Кіраўніцтва:

**Кампетэнцыя** азначае "пацверджаную здольнасць выкарыстоўваць веды, навыкі і асобасныя, сацыяльныя і/або метадычныя здольнасці дзейнічаць ў працоўных або навучальных кантэкстах і для прафесійнага і асобаснага развіцця. У кантэксце Еўрапейскай рамкі кваліфікацыяў, кампетэнцыя апісваецца з пункту гледжання адказнасці і самастойнасці" (Рэкамендацыя 2008/C 111/01). Кампетэнцыі могуць быць агульнымі ці вузка прафесійнымі. Развіццё кампетэнцыяў з'яўляецца мэтай працэсу навучання і адукацыйнай праграмы.

**Рэзультаты навучання** адлюстроўваюць узровень кампетэнцыі, засвоенай студэнтам і пацверджаны адзнакай. Гэта "апісанне таго, што навучэнец будзе ведаць, разумець і быць здольным рабіць пасля паспяховага завяршэння працэсу навучання"(там жа). Яны фармулююцца акадэмічным персаналам пры ўдзеле студэнтаў і іншых зацікаўленых бакоў. У інтарэсах ацэнкі гэтыя апісанні павінны паддавацца праверцы.

### 3.3 Рэзультаты навучання па праграме

Рэзультаты навучання па праграме грунтуюцца на профілі праграмы і апісваюць веды, разуменні і навыкі, якія студэнт атрымае па завяршэнні праграмы.

**Nota Bene**

**Фармуляванне рэзультатаў навучання па праграме**

Значную ўвагу неабходна звяртаць на фармуляванне рэзультатаў навучання. У наступным няпоўным спісе прыведзены няпоўны пералік кіруючых прынцыпаў, якія ўжо пацвердзілі сваю эфектыўнасць.

- Рэзультаты навучання павінны адэкватна адлюстроўваць кантэкст, узровень, аб’ём і змест праграмы.
- Фармуляванні рэзультатаў навучання павінны быць сціслымі і не занадта падрабязнымі.
- Рэзультаты навучання павінны быць узгодненыя паміж сабой.
- Рэзультаты навучання павінны быць зразумелымі і паддавацца праверцы ў тым, што датычыць выніковых дасягненняў студэнта.
- Рэзультаты навучання павінны быць дасягальнымі ў рамках названага аб'ёму працавыдаткаў.
- Рэзультаты навучання павінны быць звязанымі з адпаведнымі відамі навучальнай дзейнасці, метадамі і крытэрамі ацэнкі.
- Не існуе жорсткіх правіл адносна ідэальнай колькасці рэзультатаў навучання на пэўным узроўні праграмы. Досвед паказвае, што абгрунтаваным з'яўляецца пазначэнне 10 - 12 рэзультатаў навучання.
- Шырока распаўсюджаны спосаб фармулявання рэзультатаў навучання на аснове трох асноўных крытэраў:
    1. Выкарыстоўвайце актыўны дзеяслоў, каб выказаць верагодныя выніковыя веды і здольнасці студэнта (напрыклад, выпускнік можа "апісваць", "прымяняць", "абагульняць", "ацэньваць", "планаваць").
    2. Удакладняйце, да чаго адносіцца гэты рэзультат (да аб'екта, навыка: напрыклад, студэнт здольны растлумачыць “функцыю апаратных кампанентаў сістэмы"; можа прадставіць "праект дызайну гасцінай, зроблены ўручную").
    3. Удакладняйце, якім чынам можа быць прадэманстраванае дасягненне рэзультатаў навучання ("зрабіць кароткі агляд матэрыялаў, якія найбольш часта выкарыстоўваюцца ў электратэхніцы", "распрацаваць алгарытм даследавання з ужываннем сучасных навуковых метадаў ", і г.д.).

Рэзультаты навучання па праграме павінны быць уключаныя ў Каталог курсаў і ў Дадатак да дыплома.

### 3.4. Структура праграмы і размеркаванне крэдытаў

Профіль праграмы дзеліцца на адукацыйныя кампаненты, якія могуць складацца з аднаго або некалькіх модуляў, з розных відаў частак/раздзелаў курса, навучання на працоўным месцы і клінічнай практыкі, даследчых праектаў, лабараторных работ і іншых відаў навучальнай дзейнасці. Яны могуць таксама ўключаць у сябе сацыяльную і грамадскую дзейнасць (напрыклад, рэпетытарства, выкладанне практычных навыкаў маладому спецыялісту), калі яны адпавядаюць рэзультатам навучання па праграме і адлюстраваныя ў крэдытах.

Рэзультаты навучання, з адпаведнымі стратэгіямі і крытэрамі ацэнкі, павінны быць вызначаныя для кожнага адукацыйнага кампанента.

Рэзультаты навучання па праграме і па яе адукацыйных кампанентах часта фармулююцца так, каб прадэманстраваць іх узаемнае ўзмацненне. Многія адукацыйныя арганізацыі выкарыстоўваюць сістэму суаднясення рэзультатаў навучання па адукацыйнай праграме ў цэлым з рэзультатамі навучання па яе адукацыйных кампанентах.

**Nota Bene**

**Рэзультаты навучання для адукацыйных кампанентаў**

Прынцыпы фармулявання рэзультатаў навучання для адукацыйных кампанентаў такія ж, як для рэзультатаў навучання па праграме.

Не існуе абсалютных правілаў у адносінах да ідэальнай колькасці рэзультатаў навучання для аднаго адукацыйнага кампанента. Яна залежыць ад узроўню і сутнасці навучальнага раздзела, а таксама ад намінальных працавыдаткаў. Тым не менш, досвед паказвае, што іх колькасць павінна быць абмежаванай і што 6 - 8 рэзультатаў навучання могуць лічыцца аптымальнай колькасцю.

У дадатку да гэтага Кіраўніцтва прыведзены спіс рэкамендаванай літаратуры, якая змяшчае рэкамендацыі па апрацоўцы рэзультатаў навучання.

Пасля вызначэння састаўных частак праграмы, неабходна распрацаваць яе агульную структуру і вызначыць колькасць крэдытаў, якія будуць размяркоўвацца па кожным кампаненце, - на аснове рэзультатаў навучання і звязаных з імі працавыдаткаў, з улікам таго, што 60 крэдытаў адпавядаюць аднаму акадэмічнаму году навучання па поўнай форме.

Адукацыйныя кампаненты стандартнага аб'ёму (напрыклад, 5, 10, 15 крэдытаў) часта называюць "модулямі". У праграме, скампанаванай з модуляў (модульная структура), калі гэта апраўдана, могуць быць выкарыстаныя палавінныя значэнні крэдытаў (напрыклад, у выпадку 4 модуляў за семестр), аднак большага драбнення варта пазбягаць. Можа быць карысным вызначэнне адукацыйнай ўстановай базавага “кошту” аднаго крэдыта ў сэнсе мінімальнай колькасці крэдытаў для аднаго кампанента, што будзе спрыяць узаемасувязі прадметаў і здольнасцяў пры распрацоўцы навучальнай праграмы.

Усталяванне ў праграме “вокнаў мабільнасці” будзе спрыяць развіццю навучальнай мабільнасці. Вокны мабільнасці могуць быць строга акрэсленыя ў сэнсе зместу і часовых тэрмінаў, ці да кожнага студэнта могуць падбірацца свой змест і тэрмін выканання. Па магчымасці, вокны мабільнасці не павінны выкарыстоўвацца для паўтарэння таго, што ўжо вывучалася ва ўласнай адукацыйнай установе. Яны маюць на мэце даць студэнтам доступ да розных відаў адукацыйнага досведу ў іншым асяродку.

Патрабаванні да перахода на наступны курс/узровень павінны быць выразна сфармуляваныя, каб студэнты маглі паспяхова засвойваць праграму і атрымліваць жаданыя кваліфікацыі. Патрабаванні да перахода могуць уключаць у сябе, апроч іншага, рэкамендацыі, абавязковае праходжанне падрыхтоўчых курсаў і сумежных курсаў, паралельных асноўнаму. Патрабаванні да перахода на наступны курс могуць быць выражаныя ў колькасці крэдытаў або ў магчымым дыяпазоне крэдытаў, усталяваным для розных этапаў навучання ў рамках абранай праграмы (напрыклад, мінімальная колькасць крэдытаў, неабходных для пераходу з аднаго курса/семестра на наступны). Яны таксама могуць быць сфармуляваныя ў падрабязным спісе правіл адносна таго, якія кампаненты павінны і/або могуць быць засвоеныя на якім этапе і на якім узроўні (напрыклад, абавязковыя курсы, факультатывы і падрыхтоўчыя курсы).

Студэнты, якія самастойна прыступаюць да навучання па праграме фармальнай адукацыі, павінны атрымаць адпаведныя кансультацыі і тлумачэнні, якія дапамогуць ім паспяхова засвоіць патрабаванні праграмы. Пры неабходнасці, у рамках кансультавання студэнтам павінны быць растлумачаныя магчымасці прызнання раней атрыманага навучання і досведу. Гнуткая структура адукацыйных праграм дазваляе студэнтам рабіць выбар, у тым ліку за кошт доступу да новых форм навучання і выкладання.

## 3.5 Навучанне, выкладанне і ацэнка

Адукацыйныя арганізацыі вышэйшай адукацыі павінны самастойна ставіць задачы ў галіне навучання і выкладання ў кантэксце сваіх праграм навучання і спосабаў іх рэалізацыі і ацэнкі.

**Агульныя прынцыпы навучання, выкладання і ацэнкі**

Незалежна ад формы навучання і выкладання, пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы варта ўлічваць агульныя прынцыпы, якія тычацца навучання, выкладання і ацэнкі.

**Адкрыты дыялог і ўдзел студэнтаў**

Падыход, арыентаваны на студэнта, патрабуе адкрытага дыялогу і асэнсаванай зваротнай сувязі паміж студэнтамі, выкладчыкамі і адміністрацыйным персаналам, у працэсе чаго могуць быць выказаныя і абмеркаваныя патрэбы і пажаданні студэнтаў. Усе зацікаўленыя бакі павінны быць залучаныя ў канструктыўнае абмеркаванне распрацоўкі і рэалізацыі праграмы. Прадстаўнікі студэнтаў павінны ўдзельнічаць у такіх дыскусіях з поўным правам удзелу ў галасаванні.

**Празрыстасць і надзейнасць**

Каталог курсаў павінен забяспечваць студэнтаў надзейнай, актуальнай і якаснай інфармацыяй пра праграмы і асобныя навучальныя кампаненты. Ён павінен змяшчаць падрабязнае апісанне праграмы, якая прыводзіць да атрымання ступені, у тым ліку такія яе аспекты, як: структура, кампаненты, рэзультаты навучання, працавыдаткі, падыходы да навучання і выкладання, метады і крытэры ацэнкі і правілы пераходу на наступны курс/узровень.

**Узгодненасць**

Выкладчыкі, адказныя за рэалізацыю праграмы і яе кампанентаў, павінны забяспечыць узгодненасць паміж рэзультатамі навучання, заяўленымі ў праграме, навучальнай дзейнасцю і выкладаннем, а таксама працэдурамі ацэнкі. Гэтая канструктыўная узаемасувязь (гл.Бібліяграфію: Дж.Бігз, 2003 г.) паміж рэзультатамі навучання, навучальнай дзейнасцю і ацэнкай з'яўляецца найважнейшым патрабаваннем да адукацыйных праграм.

**Гнуткасць**

Гнуткая структура праграмы неабходная для ўліку выбару студэнтаў і задавальнення іх патрэбаў і чаканняў. Напрыклад, павінна быць прадастаўлена магчымасць выбару індывідуальных траекторыяў навучання, прапанаваныя дадатковыя віды навучальнай дзейнасці. Гнуткая арганізацыя навучання, выкладання і ацэнкі, у тым ліку гнуткі расклад і шырэйшы выбар магчымасцяў для самастойнага навучання важныя з пункту гледжання розных стыляў навучання. Гэта пашырае выбар матэрыялаў для студэнтаў і выкладчыкаў і відаў навучальнай дзейнасці, адкрывае новыя магчымасці студэнтам з рознымі характарыстыкамі або патрэбамі (напрыклад, людзям, якія даглядаюць за іншымі людзьмі, ці людзям з абмежаванымі магчымасцямі). Інтэграцыя лічбавых тэхналогіяў у забеспячэнне вышэйшай адукацыі аказвае значны ўплыў на падыходы да навучання і

выкладання. Размеркаванне крэдытаў па рэзультатах навучання, якія былі засвоеныя дзякуючы новым формам рэалізацыі праграм, даступных праз новыя тэхналогіі, грунтуецца на тых жа прынцыпах, што і размеркаванне крэдытаў па рэзультатах навучання за традыцыйныя адукацыйныя кампаненты.

**Належная ацэнка дасягненняў**

Крэдыты прысвойваюцца, калі адпаведная працэдура ацэнкі пацвярджае дасягненне ўстаноўленых рэзультатаў навучання на адпаведным узроўні. Калі студэнт не дасягнуў рэзультатаў навучання, крэдыты не прысвойваюцца. Колькасць крэдытаў, якія прысвойваюцца студэнту, які прадэманстраваў дасягненне зададзеных рэзультатаў навучання, роўна колькасці крэдытаў, якія прысвойваюцца навучальнаму кампаненту.

Метады ацэнкі ўключаюць у сябе ўвесь спектр пісьмовых, вусных і практычных тэстаў/іспытаў, праектаў і партфоліо, якія выкарыстоўваюцца для ацэнкі прагрэсу студэнта і пацверджання дасягнення ім рэзультатаў навучання ў рамках элемента курса ці модуля, у той час як крытэры ацэнкі апісваюць аб'ём работ студэнта, неабходны для дэманстрацыі дасягнення рэзультатаў навучання.

Каб эфектыўна выконваць сваю задачу, метады і крытэры ацэнкі, абраныя для адукацыйнага кампанента, павінны адпавядаць рэзультатам навучання, вызначаным для яго, і адпаведным відам навучальнай дзейнасці.

**Nota Bene**

**Адукацыя для атрымання ступені доктара навук** знаходзіцца на стадыі змяненняў: павялічваецца колькасць шляхоў атрымання доктарскай ступені, і ўсё шырэй прызнаецца прынцып, згодна з якім атрыманне адукацыі высокага ўзроўню спрыяе развіццю агульных (узаемазаменных) і прадметных кампетэнцыяў трэцяга адукацыйнага цыклу. У некаторых краінах і навучальных установах, ECTS таксама выкарыстоўваецца на трэцім цыкле. Крэдыты ECTS вызначаюцца для ўсёй адукацыйнай праграмы на атрыманне ступені або для яе часткі/усіх кампанентаў (напрыклад, для элементаў курса).

У выпадку прымянення сістэмы ECTS, павінны выконвацца палажэнні Кіраўніцтва для карыстальнікаў ECTS з улікам асаблівасцяў доктарскай праграмы. Адпаведная інфармацыя павінна быць уключана ў Каталог курсаў.

Вызначэнне рэзультатаў навучання на канкрэтных этапах навучання трэцяга цыкла можа, у некаторых выпадках, дазволіць кандыдатам, якія перарываюць навучанне, сертыфікаваць (зафіксаваць) свае дасягненні на дадзены момант. Гэта можа быць таксама карысным для дэманстрацыі будучым працадаўцам высокага ўзроўню агульных і прадметных кампетэнцыяў.

### 3.6 Маніторынг размеркавання крэдытаў

Маніторынг праграмы праводзіцца для ўсталявання магчымасці дасягнення студэнтамі зададзеных рэзультатаў навучання і намінальных працавыдаткаў, а таксама іх адпаведнасці мэтам праграмы. Маніторынг можа ажыццяўляцца рознымі спосабамі: з дапамогай анкетавання, фокус-групаў, інтэрв'юіравання або шляхам маніторынгу рэзультатаў. Незалежна ад метаду, зваротная сувязь ад студэнтаў, супрацоўнікаў і, дзе гэта дарэчы, ад зацікаўленых бакоў павінна стаць важным элементам праверкі і перагляду размеркавання крэдытаў. Таксама павінны быць выкарыстаныя дадзеныя пра тэрмін завяршэння праграмы і рэзультаты ацэнкі праграмы і яе кампанентаў.

Для забеспячэння дакладнасці адказаў і высокай ступені ўдзелу ў апытаннях студэнтаў і супрацоўнікаў важна інфармаваць іх пра мэты і спосабы правядзення маніторынгу. Калі сабраная інфармацыя выяўляе неадпаведнасць паміж запланаванымі працавыдаткамі і тэрмінамі, фактычна выдаткаванымі большасцю студэнтаў на дасягненне зададзеных рэзультатаў навучання, неабходна перагледзець працавыдаткі, крэдыты, рэзультаты навучання або метады навучання і выкладання і віды навучальнай дзейнасці. Рэвізія можа таксама ўключаць у сябе перагляд праграмы і яе адукацыйных кампанентаў. Перагляд неабходна ажыццяўляць як мага хутчэй, без стварэння перашкодаў для студэнтаў дадзенай праграмы. Інфармацыя аб пераглядзе павінна быць даведзена да ведама тых, хто прымаў удзел у маніторынгу, для фарміравання ў адукацыйнай установе культуры непарарыўнай кааператыўнай зваротнай сувязі.

## Раздзел 4. ECTS для праграм мабільнасці. Прызнанне крэдытаў

*Дадзены раздзел прысвечаны пераносу і прызнанню крэдытаў у цэлым - працэсах, якія маюць месца пры мабільнасці ў рамках праграм, якія вядуць да атрымання ступеняў, і ў рамках крэдытнай (акадэмічнай) мабільнасці.*

Паспяховая акадэмічная мабільнасць патрабуе акадэмічнага прызнання і пераносу крэдытаў. Прызнанне крэдытаў - гэта працэс, з дапамогай якога адукацыйная арганізацыя пацвярджае, што рэзультаты навучання, дасягнутыя і ацэненыя іншай адукацыйнай арганізацыяй, задавальняюць патрабаванням адной з праграм, якія рэалізуе дадзеная арганізацыя.

Улічваючы разнастайнасць праграм і ВНУ, малаверагодна, што крэдыты і рэзультаты навучання па адным адукацыйным кампаненце будуць ідэнтычныя ў двух розных праграмах. Гэта больш чым справядліва і для прызнання навучання ў іншых кантэкстах (напрыклад, у рамках прафесійна-тэхнічнай адукацыі і навучання). У сувязі з гэтым, рэкамендуецца выкарыстоўваць празрысты і гнуткі падыход да прызнання крэдытаў, атрыманых у іншым кантэксце, у тым ліку ў рамках навучальнай мабільнасці. Такі падыход павінен быць заснаваны на супастаўнасці рэзультатаў навучання, а не эквівалентнасці зместу курсаў. На практыцы прызнанне азначае, што колькасць крэдытаў, атрыманых за дасягненне супастаўных рэзультатаў навучання ў іншым кантэксце, замяшчае колькасць крэдытаў, размеркаваную па супастаўных рэзультатах навучання ў адукацыйнай установе, якая выдала дыплом.

Адукацыйныя арганізацыі павінны абвяшчаць пра сваю палітыку прызнання крэдытаў і забяспечваць доступ да інфармацыі пра яе.

### 4.1 Мабільнасць ў рамках праграм, якія вядуць да атрымання ступеняў

Праграмы, якія вядуць да атрымання ступеняў, могуць вар'іравацца па колькасці крэдытаў (гл. заўвагу “Nota Bene” у Раздзеле 3.1). Для прызнання кваліфікацыі ў мэтах далейшага навучання розніца ў колькасці крэдытаў ECTS, атрыманых пасля паспяховага завяршэння праграмы на атрыманне кваліфікацыі, не мае значэння. Галоўным фактарам, на які трэба зважаць, з'яўляюцца рэзультаты навучання па праграме. Гэта азначае, напрыклад, што для прыёму на магістарскія праграмы павінны прызнавацца супастаўныя ступені бакалаўра, незалежна ад таго, разлічана праграма на 180 або 240 крэдытаў.

**Nota Bene**

**Лісабонская канвенцыя аб прызнанні кваліфікацыяў вышэйшай адукацыі**
Лісабонская канвенцыя аб прызнанні кваліфікацыяў вышэйшай адукацыі, якая ўступіла ў сілу ў 1999 годзе, забяспечвае прававую аснову для акадэмічнага прызнання дакументаў аб адукацыі і (або) кваліфікацыяў

Канвенцыя абумоўлівае і ставіць умовай наступнае:

"36. Кваліфікацыі прыблізна роўнага ўзроўню могуць адрозніваецца па змесце, профілі, працавыдатках, якасці і рэзультатах навучання. Пры ацэнцы замежных кваліфікацыяў, гэтыя адрозненні павінны разглядацца ў індывідуальным парадку, і толькі істотная розніца з пункту гледжання мэты, для якой запытваецца прызнанне (напрыклад, акадэмічнае прызнанне або юрыдычнае пацверджанне фактычнай прафесіі), можа прывесці да частковага прызнання або непрызнання замежнай кваліфікацыі.

37. Замежныя кваліфікацыі павінны прызнавацца, калі не можа быць прадэманстравана істотная розніца паміж кваліфікацыяй, для якой запытваецца прызнанне, і адпаведнай кваліфікацыяй дзяржавы, у якой запытваецца прызнанне. Кіраўніцтва па Еўрапейскай зоне прызнання (EAR Manual, 2012) прапануе наступнае тлумачэнне для інтэрпрэтацыі паняцця істотнай розніцы: "Засяроджваючы ўвагу на пяці ключавых элементах, якія ў комплексе складаюць кваліфікацыю (узровень ведаў, працавыдаткі, якасць, профіль і рэзультаты навучання), і прымаючы да ўвагі істотныя адрозненні паміж імі, кампетэнтныя органы па акадэмічным прызнанні змянілі свой падыход. Яны засяродзілі ўвагу на самім факце прызнання на аснове прыняцця неістотных адрозненняў, замест выроўнівання ўзроўня і зместа замежных кваліфікацыяў і кваліфікацыяў уласных краін. Істотныя адрозненні паміж замежнай кваліфікацыяй і нацыянальнай кваліфікацыяй - гэта адрозненні, якія настолькі значныя, што яны, хутчэй за ўсё, не дазволяць заяўніку дамагчыся поспеху ў жаданай дзейнасці па далейшым навучанні, даследчай працы ці ў працаўладкаванні. Адказнасць за выяўленне істотнай розніцы ў кваліфікацыях ляжыць на кампетэнтным органе па акадэмічным прызнанні ў мэтавай краіне заяўніка і складаецца з наступных кіруючых прынцыпаў:

- не ўсе адрозненні павінны лічыцца "істотнымі";
- наяўнасць істотных адрозненняў не абавязкова мае вынікам адмову ў прызнанні замежнай кваліфікацыі;
- розніца павінна быць істотнай датычна назначэння кваліфікацыі і мэты, з якой запытваецца прызнанне". Больш падрабязна аб істотных адрозненнях гл.Бібліяграфію: Э. Стэфан Хант і Сюр Берган, 2010 г.

**Nota Bene**

**Прызнанне прафесійных кваліфікацыяў**

Дырэктыва ЕС 2013/55/ЕС уносіць дапаўненні ў Дырэктыву 2005/36/ЕС **па прызнанні прафесійных кваліфікацыяў.**

Яна дапускае выкарыстанне ECTS у якасці дадатковага сродка выражэння працягласці праграмы па поўнай форме навучання для сямі “галіновых” прафесіяў. Абавязковае выражэнне працягласці праграмы ў тэрмінах поўнага акадэмічнага года і агульнай колькасці гадзін захоўваецца для лекараў, медсясцёр агульнага профілю, стаматолагаў і акушэрак. Для ветэрынараў, фармацэўтаў і архітэктараў гэта абавязковае патрабаванне ахоплівае толькі гады вочнага навучання. Аналагічна, ECTS можа таксама выкарыстоўвацца на ўзроўнях D і E кваліфікацыйнай сеткі, якая выкарыстоўваецца ў **Агульнай сістэме**. Гэтая сістэма ахоплівае ўсе астатнія рэгламентаваныя прафесіі на аснове кваліфікацыяў у ЕС і ў Еўрапейскай адукацыйнай прасторы (ЕАП). Новая Дырэктыва пашырыла свой ахоп за кошт прызнання **стажыровак на працоўным месцы**, якія з'яўляюцца абавязковай умовай для атрымання рэгламентаванай прафесіі. Іх можна прайсці ў любой дзяржаве-члене ЕС/ЕАП (незалежна ад таго, у якой краіне была прысуджана кваліфікацыя), і яны цалкам прызнаюцца. Дэкларатыўная частка 27 Дырэктывы сцвярджае: “Прызнанне прафесійнай стажыроўкі, пройдзенай у іншай дзяржаве-члене ЕС/ЕАП, павінна грунтавацца на падрабязным пісьмовым апісанні мэтаў навучання і пастаўленых задач, вызначаных кіраўніком стажора ў мэтавай краіне заяўніка”. Артыкул 55а Дырэктывы патрабуе ад кампетэнтных органаў “публікаваць кіруючыя прынцыпы па арганізацыі і прызнанні прафесійных стажыровак, пройдзеных у іншай дзяржаве-члене ЕС/ЕАП або ў трэцяй краіне, і ў прыватнасці, па ролі кіраўніка стажыроўкі”. Нарэшце, новая Дырэктыва ўводзіць **агульныя рамкі навучання**, заснаваныя на "агульных наборах ведаў, навыкаў і кампетэнцыяў”, запатрабаваных у сістэмах адукацыі і навучання і ўжывальных не менш як у адной трэціны дзяржаў-членаў ЕС/ЕАП. Гэтыя агульныя навучальныя планы могуць быць прапанаваныя прадстаўнічымі прафесійнымі арганізацыямі, якія дзейнічаюць на ўзроўні ЕС або на нацыянальным узроўні, або кампетэнтнымі акадэмічнымі органамі. Яны павінны быць суаднесеныя з Еўрапейскай рамкай кваліфікацыяў і могуць прымяняць ECTS у поўным аб’ёме.

### 4.2 Крэдытная (акадэмічная) мабільнасць

ECTS была распрацавана для садзейнічання навучальнай мабільнасці паміж адукацыйнымі ўстановамі на кароткія навучальныя перыяды (крэдытная/акадэмічная мабільнасць). Як вынікае з яе назвы, сістэма ECTS была распрацаваная і прымяняецца з мэтай пераносу і назапашвання крэдытаў, аднак яна таксама адыгрывае важную ролю ў ажыццяўленні студэнцкай мабільнасці праз палягчэнне пераносу і прызнання дасягненняў мабільных студэнтаў.

У рамках ECTS дзейнічаюць наступныя дакументы, якія палягчаюць прызнанне крэдытаў у мэтах рэалізацыі мабільнасці:

- Каталог курсаў,
- Пагадненне пра навучанне,
- Акадэмічная даведка,
- Сертыфікат пра праходжанне стажыроўкі.

Гэтыя дакументы змяшчаюць інфармацыю пра дасягнутыя рэзультаты навучання, на падставе якіх адукацыйная арганізацыя, якая прысвойвае кваліфікацыю, можа прыняць рашэнне пра прызнанне і перанос крэдытаў (для дадатковай інфармацыі гл. Раздзел 7 Еўрапейскага кіраўніцтва па прызнанні для ўстановаў вышэйшай адукацыі, 2014 г. (European Recognition Manual for Higher Education Institutions). Гэты раздзел утрымлівае карысную блок-схему па прызнанні перыядаў навучання за мяжой.

**Nota Bene**

**Залатое правіла прызнання кароткатэрміновай мабільнасці ў рамках пагадненняў паміж адукацыйнымі арганізацыямі**

Усе крэдыты, заробленыя ў перыяд навучання за мяжой або падчас перыяду віртуальнай мабільнасці (згодна з Пагадненнем пра навучанне і Акадэмічнай даведкай), павінны быць неадкладна перанесеныя і залічаныя навучэнцу ў рамках засваення ім адукацыйнай праграмы без дадатковых заданняў або ацэньвання студэнта.

### 4.2.1 Напярэдадні крэдытнай (акадэмічнай) мабільнасці

Для палягчэння арганізацыі крэдытнай мабільнасці і прызнання яе рэзультатаў, тры зацікаўленыя бакі - студэнт, адукацыйная арганізацыя, якая яго накіравала на праграму мабільнасці, і арганізацыя/прадпрыемства, якая яго запрасіла, - павінны дамовіцца пра праграму навучання за мяжой. Яны павінны юрыдычна зацвердзіць гэтую дамову ў Пагадненні пра навучанне, якое падпісваецца трыма бакамі да пачатку перыяду мабільнасці. Пагадненне распрацаванае, каб забяспечыць пацвярджэнне студэнту прызнання крэдытаў, якія ён/яна атрымае ў перыяд мабільнасці.

Адукацыйныя кампаненты, якія будуць засвоеныя цягам перыяду мабільнасці, звычайна не павінны выбірацца на аснове іх эквівалентнасці асобным адукацыйным кампанентам, прапанаваным у адукацыйнай арганізацыі, якая накіроўвае студэнта. Рэзультаты навучання па ўсёй праграме навучання за мяжой павінны быць сумяшчальнымі з рэзультатамі навучання па асноўнай праграме адукацыйнай арганізацыі, якая накіроўвае студэнта, або дапаўняць іх. Яны падлягаюць прызнанню пасля перыяду навучання за мяжой. Гэта дазваляе прымяняць больш гнуткі падыход да замяшчэння крэдытаў па асноўнай праграме адукацыйнай арганізацыі, якая накіроўвае студэнта, эквівалентнай колькасцю крэдытаў у арганізацыі, якая запрашае студэнта. Акрамя таго, магчыма залічваць перыяд мабільнасці ў цэлым, а не яго кампаненты паасобку.

Пагадненне пра навучанне павінна вызначыць набор навучальных кампанентаў, якія будуць вывучацца студэнтам у адукацыйнай арганізацыі, якая яго запрашае, і тое, якім чынам яны будуць інтэграваныя ў асноўную праграму арганізацыі, якая яго накіроўвае на праграму. Колькасць крэдытаў, якія магчыма зарабіць у адукацыйнай арганізацыі, што запрашае студэнта, павінна быць супамерна часу навучання за мяжой. Чакаецца, што студэнт павінен засвоіць адукацыйныя кампаненты аб'ёмам 60 крэдытаў цягам аднаго акадэмічнага года па поўнай форме навучання.

Адукацыйная арганізацыя, якая запрашае студэнта, абавязаная зарэгістраваць студэнта для засваення ім запланаваных навучальных кампанентаў і пацвердзіць магчымасць засваення гэтых кампанентаў у перыяд мабільнасці.

Пасля падпісання Пагаднення ўсімі трыма бакамі, у далейшым у яго, пры неабходнасці, могуць быць унесеныя змены са згоды трох зацікаўленых бакоў.

**Nota Bene**

Новыя формы навучання з выкарыстаннем інфармацыйна-кампутарных тэхналогіяў адкрываюць студэнтам доступ і навучанне на курсах за межамі сваёй адукацыйнай арганізацыі ("**віртуальная мабільнасць**"). Такім студэнтам трэба прапанаваць адпаведную акадэмічную падтрымку, а студэнт і адукацыйная арганізацыя, якая яго накіроўвае, павінныя падпісаць Пагадненне пра навучанне. У **сумесных праграмах** узгодненыя зацікаўленымі бакамі схемы мабільнасці афіцыйна прымаюцца арганізацыямі-партнёрамі і ўключаюць у сябе правілы прызнання крэдытаў. Пагадненне пра навучанне ў такіх праграмах не абавязковае: крэдыты, атрыманыя ў арганізацыі-партнёра, прызнаюцца аўтаматычна, калі выкананыя ўзгодненыя правілы і ўмовы. Тым не менш, запланаваная траекторыя навучання павінна быць зразумелай студэнту, і ў сувязі з гэтым падпісанне Пагаднення пра навучанне з'яўляецца абгрунтаваным.

### 4.2.2 Перыяд пасля крэдытнай мабільнасці

Адукацыйная ўстанова, якая запрасіла студэнта на праграму мабільнасці, прадастаўляе ўстанове, якая яго туды накіравала, і студэнту Акадэмічную даведку, узгодненую паміж дзвюма арганізацыямі, у дастаткова кароткі тэрмін пасля абвяшчэння рэзультатаў студэнта адукацыйнай установай, якая яго запрасіла на навучанне.

Установа, якая накіравала студэнта на навучанне, павінна цалкам прызнаць узгодненую колькасць крэдытаў, перанесці іх у асноўную навучальную праграму студэнта і прымяніць для прысваення яму кваліфікацыі згодна з патрабаваннямі - пасля паспяховага засваення ім усіх адукацыйных кампанентаў, уключаных у Пагадненне пра навучанне і пацверджаных Акадэмічнай даведкай, выдадзенай адукацыйнай установай, якая запрасіла студэнта. Адукацыйная ўстанова, якая накіравала студэнта на праграму мабільнасці, павінна выразна прадэманстраваць, якім чынам адукацыйныя кампаненты, засвоеныя за мяжой, былі інтэграваныя ў асноўную праграму студэнта. Калі гэта прымяняльна, адзнакі канвертуюцца (гл. Раздзел 4.3). Уся гэтая інфармацыя павінна быць адлюстравана ў Акадэмічнай даведцы (або эквівалентным ёй дакуменце/базе дадзеных) і даступная для студэнта.

Для ацэнкі адукацыйных кампанентаў, не засвоеных студэнтам ва ўстанове, якая яго запрасіла на праграму мабільнасці, павінны быць усталяваныя інстытуцыйныя працэдуры. Такія працэдуры павінны быць даведзены да ведама студэнтаў загаддзя.

Дадатак да дыплома прызначаны для прадастаўлення выпускніку празрыстых звестак пра яго дасягненні. Такім чынам, адукацыйныя кампаненты, паспяхова засвоеныя за мяжой, адлюстроўваюцца ў Акадэмічнай даведцы, якая прыкладаецца да Дадатку да дыплома, з іх арыгінальнымі назвамі (і перакладам на мову (-ы), на якой (-іх) выдаецца Дыплом), пазначэннем адукацыйнай установы, дзе яны былі засвоеныя, і крэдытаў і прысуджаных адзнак.

У выпадку праходжання стажыроўкі за мяжой, перанос крэдытаў будзе занесены ў Сертыфікат пра праходжанне працоўнай стажыроўкі, у Дадатак да дыплома або ў пашпарт

мабільнасці студэнта “Еўрапас” (Europass). У выпадку нядаўняга праходжання працоўнай стажыроўкі выпускніком, настойліва рэкамендуецца выкарыстанне пашпарта мабільнасці “Еўрапас”, паколькі тажыроўка праходзіць пасля сканчэння навучання і іншыя дакументы, згаданыя вышэй, не з'яўляюцца для яе актуальнымі.

### 4.2.3 Інстытуцыйныя нормы і палажэнні

Станоўчы досвед паказвае, што прыведзеныя ніжэй прыклады паспяховай практыкі спрыяюць найлепшаму кіраванню акадэмічнай мабільнасцю і прызнаннем крэдытаў.

**Інстытуцыйныя абавязкі**

Неабходна распрацаваць канкрэтныя інстытуцыйныя правілы для прызнання іншага досведу навучання і забеспячэння назапашвання і пераносу крэдытаў, зарobленых у выніку розных відаў мабільнасці (у тым ліку, навучання ў якасці "свабодных слухачоў”), працоўнага досведу, віртуальнага навучання, папярэдне атрыманай адукацыі і спантаннага навучання.

Адукацыйная арганізацыя павінна дакладна вызначыць свае абавязкі па рэалізацыі і маніторынгу рэзультатаў навучання па крэдытнай мабільнасці і гарантаваць празрыстасць і справядлівасць прымянення працэдур падачы заявак і крытэраў адбору кандыдатаў на праграмы мабільнасці, а таксама наяўнасць механізму абскарджвання прынятых рашэнняў. Для кожнага падраздзялення/факультэта або кожнай прадметнай вобласці павінен быць прызначаны супрацоўнік, афіцыйна ўпаўнаважаны абмяркоўваць праграму мабільнасці з зацікаўленымі студэнтамі, а таксама зацвярджаць і падпісваць Пагадненне пра навучанне ад імя адукацыйнай арганізацыі, якая накіравала студэнта, да пачатку перыяду мабільнасці і Акадэмічную даведку - пасля заканчэння гэтага перыяду[5].

Студэнт не абавязаны абмяркоўваць пытанні прызнання крэдытаў з не ўпаўнаважанымі на тое супрацоўнікамі, ці з адукацыйнай камісіяй ні да, ні па сканчэнні перыяду мабільнасці, гэтаксама як студэнт не павінен здаваць дадатковыя іспыты або выконваць дадатковыя заданні пасля вяртання.

---

[5] Праграма “Эразмус+” (Erasmus+) прапануе ўзор Пагаднення пра навучанне, дзе патрабаванні да адказных асобаў вызначаюцца наступным чынам:

Адказная асоба адукацыйнай установы, якая накіравала студэнта на навучанне, - педагагічны работнік, які мае паўнамоцтвы зацвярджаць праграмы мабільнасці (Пагадненне пра навучанне) студэнта, які выязджае за мяжу, карэктаваць іх у выпадках выключнай неабходнасці, а таксама гарантаваць поўнае прызнанне такіх праграм ад імя структуры, адказнай за навучальную частку.

Адказная асоба адукацыйнай установы, якая запрасіла студэнта на навучанне, - педагагічны работнік, які мае паўнамоцтвы зацвярджаць праграмы мабільнасці замежнага студэнта і прапаноўваць яму/ёй усебаковую акадэмічную падтрымку цягам навучання ў адукацыйнай установе, якая яго/яе запрасіла.

**Выбар установаў - партнёраў**

Рэкамендуецца заключаць Пагадненні па абмене студэнтамі з адукацыйнымі ўстановамі:

- якія прапануюць празрыстыя апісанні сваіх праграм, у тым ліку рэзультатаў навучання, крэдытаў, падыходаў да навучання і выкладання і метадаў ацэнкі;
- чые працэдуры навучання, выкладання і ацэнкі могуць быць прыняты ўстановай, якая накіравала студэнта, без патрабаванняў па выкананні студэнтам любых дадатковых заданняў або здачы іспытаў;
- якія гарантуюць якасць навучання ў поўнай адпаведнасці з іх нацыянальнай адукацыйнай сістэмай.

Пагадненні могуць заключацца не толькі з адукацыйнымі ўстановамі, якія прапануюць праграмы, аналагічныя праграме суіскальніка, але і з тымі, чые праграмы дапаўняюць яго праграму.

**Інтэграцыя крэдытнай мабільнасці ў навучальныя праграмы**

Уключэнне крэдытнай мабільнасці ў структуру навучальных праграм палягчае прызнанне крэдытаў. Адукацыйныя арганізацыі могуць самастойна:

- вызначаць навучальны семестр або год, у праграму якога найлепшым чынам убудуецца перыяд навучання за мяжой (“акно мабільнасці”);
- размяркоўваць па семестрах/гадах адукацыйныя кампаненты і адпаведныя рэзультаты навучання, якія могуць быць лёгка засвоеныя за мяжой (напрыклад, міжнародныя або супастаўныя курсы, дадатковыя курсы/курсы па выбару, падрыхтоўка дысертацыі, моўныя курсы, стажыроўкі на працоўным месцы);
- вызначаць партнёрскія арганізацыі, у якіх могуць быць заробленыя крэдыты з супастаўнымі/узаемадапаўняльнымі рэзультатамі навучання.

**Nota Bene**

У рамках праграмы “Эразмус+”, падмуркам для рэалізацыі мабільнасці і прызнання крэдытаў з'яўляюцца такія дакументы, як Хартыя “Эразмус” для вышэйшай адукацыі (Інстытуцыйныя абавязкі), Еўрапейская хартыя якасці адукацыі ў сферы мабільнасці, Студэнцкая хартыя “Эразмус” (Еўрапейскі кодэкс пасяховай практыкі для студэнтаў Erasmus +).

### 4.3 Размеркаванне адзнак

З-за розных культурных і акадэмічных традыцыяў, еўрапейскія сістэмы адукацыі выпрацавалі не толькі розныя нацыянальныя шкалы ацэнак, але і розныя спосабы іх выкарыстання ў межах адной краіны, у розных прадметных галінах або адукацыйных установах. Істотна важна прызнаваць гэтыя адрозненні, а таксама зрабіць іх адкрытымі ў рамках Еўрапейскай прасторы вышэйшай адукацыі для таго, каб ацэнкі, атрыманыя ва ўсіх краінах, прадметных галінах або ўстановах, маглі быць належным чынам зразумелыя і карэктна супастаўленыя.

Студэнты, якія ўдзельнічаюць у праграмах мабільнасці, маюць права на справядлівыя адносіны да сябе і інфармаванне пра свае адзнакі ў рамках пераносу крэдытаў, паколькі ўзровень іх дасягненняў шмат у чым вызначае доступ да далейшага навучання, атрымання грантаў ці іншых перавагаў. Інфармаванне пра ўзровень дасягненняў у роўнай ступені важнае і для выпускнікоў, якія прэтэндуюць на працу на радзіме ці ў іншай краіне.

Для гарантавання адкрытай і ўзгодненай інфармацыі пра пасяховасць студэнтаў кожная адукацыйная ўстанова павінна мець, у дадатак да нацыянальнай/інстытуцыйнай шкалы адзнак і тлумачэнняў да яе, табліцу статыстычнага размеркавання здавальняючых адзнак, атрыманых студэнтамі ў рамках праграмы або прадметнай вобласці (далей - Табліца размеркавання адзнак). Табліца дэманструе, якім чынам на практыцы выкарыстоўваецца у праграме шкала адзнак.

Нават у тых выпадках, калі перанос адзнак не з'яўляецца неабходным у рамках акадэмічнай традыцыі адукацыйнай установы, разлік табліцы размеркавання адзнак будзе спрыяць справядлівым адносінам да мабільных студэнтаў пасля іх вяртання ў адукацыйную ўстанову, якая іх накіравала на праграму мабільнасці. Варта адзначыць, што добра сябе зарэкамендавала таксама выдача ўнутраным экзаменацыйным камісіям падрабязных статыстычных звестак па адзнаках за іспыты студэнта. Гэта спрыяе большай празрыстасці працэса ацэнкі і пераноса адзнак і выяўленню разыходжанняў у іх, што можа запатрабаваць больш падрабязнага разгляду.

У выпадку рэалізацыі сумесных праграм для атрымання ступеняў партнёры ў рамках акадэмічнага кансорцыума павінны загадзя дамовіцца, якім чынам яны будуць выстаўляць і канвертаваць адзнакі.

Табліца размеркавання адзнак паказвае, як дзеючая нацыянальная ці інстытуцыйная шкала адзнак ужываецца ў канкрэтнай адукацыйнай установе (і ці знаходзіцца яна ў адкрытым або абмежаваным доступе), а таксама дазваляе параўноўваць дадзеныя студэнтаў з паралельнай рэферэнтнай групы ў іншай арганізацыі з дапамогай статыстычнага размеркавання адзнак. Табліца ўяўляе сабой статыстычнае размеркаванне станоўчых адзнак (здавальняючых і вышэй) па кожнай прадметнай вобласці ў канкрэтнай адукацыйнай арганізацыі. Важна таксама забяспечыць дадатковую інфармацыю пра высокія адзнакі студэнта на тым жа ўзроўні аб’яднання ўстановаў, аднак гэтыя дадзеныя не павінны быць выкарыстаныя для пераносу адзнак.

Табліцы размеркавання адзнак павінны быць распрацаваныя ў *стандартызаваным* фармаце для рэферэнтных групаў студэнтаў, якія навучаюцца па адукацыйных праграмах

для атрымання ступеняў у адной прадметнай вобласці. Такія групы павінны быць супастаўныя з пункту гледжання колькасці студэнтаў і гадоў навучання.

Разлік Табліц размеркавання адзнак - задача, якую ў многіх адукацыйных установах плануецца ажыццяўляць на цэнтралізаваным узроўні. Распрацоўка Табліц не павінна выклікаць празмерных цяжкасцяў у адукацыйных арганізацыяў, паколькі неабходныя дадзеныя, звычайна, даступныя ў інфармацыйных сістэмах установаў, а разлік працэнтных суадносін можна атрымаць з дапамогай стандартнага праграмнага забеспячэння. Гэта патрабуе наступных крокаў:

1. Вызначыць рэферэнтныя групы ў мэтавай адукацыйнай арганізацыі на аснове аб'ектыўных і празрыстых крытэраў, якія павінны быць прыкладзеныя да распрацаванай Табліцы размеркавання адзнак. У адсутнасць метадаў, заснаваных на супастаўных рэзультатах навучання, рэкамендуецца выкарыстоўваць Міжнародную стандартную класіфікацыю адукацыі ISCED-F, якая прапануе стандартызаваную і іерархічную класіфікацыю абласцей вывучэння. Для атрымання досыць вялікіх рэферэнтных групаў для статыстычна значнага параўнання, рэкамендуецца выкарыстоўваць код ISCED-F для працы з "вузкімі" ці "дэталізаванымі" узроўнямі (Статыстычны інстытут ЮНЕСКА, 2014 г.).

2. Разлічыць абсалютную колькасць станоўчых адзнак, выстаўленых у кожнай рэферэнтнай групе, па меншай меры, за апошнія два гады. Памятайце, што інфармацыя пра ўзровень станоўчых адзнак можа давацца ў агульных рысах, але не ўлічваецца ў дадзеным разліку.

3. Разлічыць працэнтнае выражэнне размеркавання станоўчых адзнак, выстаўленых у рэферэнтнай групе, і вывесці сукупны працэнт. У выніку атрымаецца Табліца размеркавання адзнак у працэнтах і сукупным працэнтным размеркаванні адзнак для кожнай вызначанай рэферэнтнай групы.

Ніжэй прыведзена Табліца размеркавання адзнак.

| Адзнакі, якія выкарыстоўваюцца ва ўстанове (ад максімальнай да мінімальнай station станоўчай адзнакі)* | Колькасць станоўчых адзнак, выстаўленых у рэферэнтнай групе | Працэнт кожнай адзнакі ў адносінах да агульнага ліку станоўчых адзнак | Сукупны працэнт выстаўленых станоўчых адзнак |
|---|---|---|---|
| 10 | 50 | 5% | 5% |
| 9 | 100 | 10% | 15% |
| 8 | 350 | 35% | 50% |
| 7 | 300 | 30% | 80% |
| 6 | 200 | 20% | 100% |
| Усяго: | 1000 | 100% | |

* Прынцыпы і падыходы да размеркавання адзнак усталёўваюцца на нацыянальным узроўні.

Пры ўключэнні яе ў Акадэмічную даведку і ў Дадатак да дыплома, такая табліца будзе палягчаць інтэрпрэтацыю кожнай выстаўленай студэнту адзнакі без неабходнасці дадатковых падлікаў. Еўрапейскі праект па канверсіі сістэмы адзнак (EGRACONS), які знаходзіцца ў стадыі рэалізацыі, зараз распрацоўвае прыклады для візуальнага прадстаўлення табліц размеркавання адзнак.

**4.4 Канвертацыя адзнак**

Калі адукацыйныя ўстановы вырашаюць канвертаваць адзнакі сваіх студэнтаў па праграмах мабільнасці, адказны за перанос крэдытаў супрацоўнік павінен будзе параўнаць Табліцу размеркавання адзнак адпаведнай рэферэнтнай групы з аналагічнай табліцай, распрацаванай іншай адукацыйнай арганізацыяй для паралельнай рэферэнтнай групы. Пазіцыі абедзвюх адзнак у табліцах неабходна параўнаць і на аснове гэтага канвертаваць адзнакі мэтавых студэнтаў.

Звычайна, працэнтныя дыяпазоны адзнак перакрываюцца. І, паколькі мэтай супастаўлення з'яўляецца адкрытасць і празрыстасць рэзультатаў навучання, адукацыйная ўстанова, якая запрашае студэнта, павінна загаддзя вырашыць, ці будзе брацца мінімальная, сярэдняя або максімальная супастаўная адзнака з дыяпазонаў супастаўлення.

Дадатак 2 дэманструе прыклады канвертацыі адзнак.

## Раздзел 5. ECTS і навучанне на працягу ўсяго жыцця

*Гэты радзел апісвае тое, якім чынам ECTS спрыяе навучанню на працягу ўсяго жыцця, адкрывае новыя магчымасці ў навучанні і садзейнічае прызнанню папярэдне атрыманай адукацыі і практычнага досведу.*

### 5.1 Навучанне на працягу ўсяго жыцця - магчымасці адкрытага навучання

Сфера вышэйшай адукацыі змяняецца даволі хутка, з’яўляецца ўсё больш форм і метадаў навучання, гэтаксама як і магчымасцяў гнуткага навучання - уключаючы змешанае навучанне, новыя формы адкрытага віртуальнага навучання, масавыя адкрытыя онлайн-курсы (MOOC), адкрытыя адукацыйныя рэсурсы (OER), навучанне на працоўным месцы, самастойна рэгуляванае навучанне, індывідуальныя траекторыі навучання, бесперапыннае прафесійнае развіццё (гл.Раздзел 3). Павялічваецца колькасць навучэнцаў, якія самастойна засвойваюць адукацыйныя кампаненты або курсы, але не пераследуюць мэты атрымаць канкрэтную кваліфікацыю. Вышэйшыя навучальныя ўстановы сутыкаюцца з неабходнасцю задавальняць запытам разнастайных груп студэнтаў і прапаноўваць ім індывідуальныя траекторыі і выбар розных форм навучання.

Адпаведна, многія адукацыйныя ўстановы дыверсіфікуюцца і прапануюць студэнтам інавацыйныя формы навучання і выкладання адукацыйных кампанентаў, дзякуючы новым тэхналогіям і адкрытым адукацыйным рэсурсам.

Перавагай ECTS з'яўляецца тое, што гэтую сістэму можна выкарыстоўваць у розных кантэкстах навучання на працягу ўсяго жыцця, і прымяняць адзіныя прынцыпы для размеркавання крэдытаў, іх атрымання, назапашвання і пераносу. Крэдыты ў рамках адкрытага навучання і іншых відаў навучання на працягу ўсяго жыцця размяркоўваюцца гэтак жа, як яны размяркоўваюцца па розных кампанентах адукацыйных праграм. Такое размеркаванне грунтуецца на аб'ёме працавыдаткаў, неабходных для дасягнення зададзеных рэзультатаў навучання.

Арганізацыям, якія прапануюць вышэйшую адукацыю ў адкрытым фармаце, адпаведным патрабаванням фармальнай сістэмы забеспячэння якасці (г.зн. тым жа чынам і ў тым жа фармаце, што і традыцыйныя ВНУ), варта карыстацца ECTS праз апісаныя ў дадзеным Кіраўніцтве празрыстыя механізмы. Гэта значна палегчыць пераход ад адной формы навучання да іншай, да працэсу прызнання і пераносу крэдытаў, а таксама будзе спрыяць росту даверу да рэзультатаў адкрытай адукацыі з боку вучняў і зацікаўленых бакоў.

**Nota Bene**

Важнасць бесперапыннага павышэння кваліфікацыі (*CPD*) для прадстаўнікоў рэгуляваных прафесіяў усё больш расце, асабліва ў дачыненні да медыцынскіх спецыяльнасцяў. Бесперапыннае павышэнне кваліфікацыі носіць міжнародны характар. Як асабістае жаданне спецыяліста, ці ў якасці прафесійнага патрабавання, бесперапыннае павышэнне кваліфікацыі аднолькава лічыцца прафесіяналамі і пастаўшчыкамі адукацыі адным з відаў навучання на працягу ўсяго жыцця. Яно ўключае фармальнае, нефармальнае і спантаннае навучанне. У той час як элементы бесперапыннага павышэння кваліфікацыі могуць быць канвертаваныя ў кваліфікацыі другога цыкла вышэйшай адукацыі (магістратура) або кваліфікацыі прафесійнай доктарскай ступені (у залежнасці ад нацыянальнага заканадаўства), CPD з'яўляецца выключна прафесійнай адукацыяй і мае своеасаблівы характар: яно можа быць кантралявацца самастойна і рэцэнзавацца калегамі роўнага ўзроўню. Аднак, пытанні працаўладкавання, права на далейшую прафесійную дзейнасць, адпаведнасці патрабаванням сваёй прафесіі, аховы бяспекі грамадства і, у выпадку медыцынскіх прафесіяў, здароўя пацыентаў азначаюць, што павышэнне кваліфікацыі павінна паддавацца праверцы і вымярэнню і зацвярджацца ўпаўнаважанымі на тое органамі.

Дасягненне вышэйпазначаных мэтаў застаецца пытаннем, якое пастаянна абмеркоўваецца ўнутры прафесійных супольнасцяў. І Еўрапейскую сістэму крэдытаў для прафесійнай адукацыі і навучання (ECVET), і ECTS аднолькава зручна скарыстоўваць у бесперапынным прафесійным развіцці, паколькі ўзроўні CPD могуць суадносіцца з любым з 8-мі ўзроўняў Еўрапейскай рамкі кваліфікацыяў. Тым не менш, узаемадзеянне паміж дзвюма сістэмамі яшчэ не носіць настолькі ўзаемазамяшчальнага характару, паколькі розныя прафесіі маюць уласную культуру адносін і свае нацыянальныя асаблівасці. Аднак, абмеркаванне ўзаемадзеяння еўрапейскіх крэдытных сістэм працягваецца, і можна спадзявацца, што яно прывядзе да большай яснасці ў выкарыстанні крэдытаў у сістэме бесперапыннага прафесійнага развіцця. Адукацыйным арганізацыям, якія прапануюць адукацыйныя паслугі на 5-8-ым узроўнях Еўрапейскай рамкі кваліфікацыяў, рэкамендуецца разгледзець мэтазгоднасць выкарыстання крэдытаў ECTS у мэтах павышэння празрыстасці сваіх паслуг, прызнання крэдытаў, іх назапашвання і пераносу на аснове метадаў, выкладзеных у дадзеным Кіраўніцтве.

Крэдыты, зробленыя ва ўсіх відах вышэйшай адукацыі, уключаючы бесперапынную і прафесійную адукацыю, могуць прызнавацца, назапашвацца і прыводзіць ці не прыводзіць да прысваення кваліфікацыі, у залежнасці ад пажадання студэнта і/ці патрабаванняў, якія рэгулююць прысуджэнне кваліфікацыі. Некаторыя студэнты, якія навучаюцца самастойна, могуць быць зацікаўленыя выключна ў засваенні асобнага кампанента праграмы і не плануюць у далейшым атрымліваць кваліфікацыю. Аднак размеркаванне і залічванне крэдытаў можа дазволіць студэнтам пры жаданні выкарыстоўваць крэдыты ў будучыні.

Занатоўванне ўсіх навучальных дасягненняў і прысуджэнне адпаведнай колькасці крэдытаў ECTS на канкрэтным узроўні навучання садзейнічае прызнанню празрыстасці і аб'ектыўнасці гэтага навучання, у сувязі з чым зробленыя крэдыты будуць спрыяць атрыманню кваліфікацыі ў будучыні. Інструменты валідацыі і прызнання, якія выкарыстоўваюцца ў фармальнай адукацыі, павінны адаптавацца да больш разнастайных і арыентаваных на студэнта адукацыйных кантэкстаў. У сувязі з гэтым, неабходна прызнаць важнасць новых форм адкрытага навучання, спароджанага кампутарнымі тэхналогіямі. Карэктнае выкарыстанне ECTS значна палепшыць і палегчыць гэты працэс.

**5.2 Прызнанне папярэдняга навучання і досведу**

ВНУ павінны мець веды і досвед прызнання крэдытаў, зробленых у выніку навучання па-за межамі фармальнага кантэксту: у ходзе працоўнай дзейнасці, валанцёрства, удзелу у выкладанні і распрацоўцы праграм, самастойнага вывучэння прадмета пры ўмове, што гэтыя рэзультаты навучання задавальняюць патрабаванням кваліфікацыі або яе кампанентаў. Прызнанне рэзультатаў навучання, засвоеных у рамках нефармальнага і спантаннага навучання, павінна аўтаматычна прыводзіць да прысуджэння такой жа колькасці крэдытаў ECTS, што і за адпаведную частку праграмы фармальнай адукацыі.

Калі разглядаць ECTS у кантэксце фармальнай адукацыі, прысуджэнню крэдытаў павінна папярэднічаць ацэнка дасягненняў і рэзультатаў папярэдняга навучання. Метады і крытэры ацэнкі павінны быць распрацаваныя такім чынам, каб вымераць дасягненне студэнтам зададзенага ўзроўню рэзультатаў навучання, пры гэтым без арыентацыі на канкрэтныя віды навучання і працавыдаткі. Напрыклад, пры ацэнцы не будзе залічвацца "удзел у аўдыторным абмеркаванні зададзенай тэмы”, у той час як істотным будзе такі рэзультат навучання, як “распрацоўка аргументаў у рамках групавой працы”. На кожнае падраздзяленне або для кожнай прадметнай вобласці павінен быць прызначаны спецыяліст, афіцыйнымі паўнамоцтвамі якога будзе прысуджэнне крэдытаў за рэзультаты навучання, засвоеныя па-за межамі фармальнага навучальнага кантэкста. Падрыхтоўка спецыяліста павінна грунтавацца на празрыстых крытэрах прысуджэння крэдытаў, зацверджаных і абвешчаных дадзенай установай. Неабходна разумець, што гэтыя супрацоўнікі павінныя паведамляць пра прынятыя рашэнні па прызнанні досведу і занатоўваць іх у рэгулярных справаздачах адпаведнаму падраздзяленню /факультэту/дэканату ВНУ.

**Nota Bene**

Існуе шырокі спектр метадаў ацэнкі для прызнання **папярэдняга навучання і досведу.** Адным з інструментаў ацэнкі з'яўляецца метад партфоліо.

Партфоліо ўключае ў сябе дакументы, якія студэнт сабраў для дэманстрацыі асабістых навыкаў, набытых рознымі шляхамі. У партфоліо ўваходзяць таксама дакументы, якія пацвярджаюць навыкі і веды, набытыя ў межах папярэдняга нефармальнага або спантаннага навучання. Партфоліо змяшчае водгукі працадаўцаў і кіраўнікоў; у яго могуць уваходзіць ацэнкі працы заяўцы, рэзюмэ і іншыя дакументы. Пры выкарыстанні метаду партфоліо спецыяліст па прызнанні досведу аналізуе ўвесь спектр інфармацыі, прапанаванай навучэнцам. У працэсе падрыхтоўкі і збору матэрыялаў для партфоліо навучэнцы могуць мець патрэбу ў дапамозе і кансультацыі.

Адукацыйныя арганізацыі павінны распрацоўваць палітыкі ў сферы прызнання нефармальнага або спантаннага навучання. Гэтыя палітыкі павінны ўключаць у сябе такія элементы, як кансультаванне, зваротную сувязь з навучэнцамі па рэзультатах ацэнкі і магчымасць апеляцыі для навучэнцаў. Таксама адукацыйным арганізацыям прапануецца ствараць сродкі для абмеркавання, кансультавання і прызнання нефармальнага і спантаннага навучання, якія могуць рэалізоўвацца па-рознаму ў залежнасці ад нацыянальных і інстытуцыйных практык (напрыклад, яны могуць фармавацца ў адной ВНУ або як цэнтры на базе некалькіх арганізацыяў). Адукацыйная палітыка і дзейнасць адукацыйных арганізацыяў павінны публікавацца на вэб-сайтах установаў. Прызнанне нефармальнага і спантаннага навучання спрыяе сацыяльнай інклюзіі ВНУ. Пашырэнне магчымасцяў доступа навучэнцаў да прафесійнага жыцця, а таксама шэраг метадаў у нетрадыцыйных навучальных кантэкстах дапамагаюць спраўдзіць ідэю навучання на працягу ўсяго жыцця. Важна таксама, каб адукацыйныя ўстановы прызнавалі прафесійную тэхнічную адукацыю і навучанне.

**Nota Bene**

Працэс прысваення крэдытаў у нефармальным або спантанным навучанні складаецца з чатырох асноўных этапаў:

1. Першапачатковае кансультаванне і прадметная арыентацыя студэнта (тое, што будзе ўключаць навучанне, максімальную колькасць крэдытаў за нефармальнае/спантаннае навучанне, які кошт навучання, ролі і адказнасць навучэнца і выкладчыка/кансультанта; магчымыя траекторыі навучання, якія прыводзяць да атрымання кваліфікацыі).

2. Падтрымка (рэфлексія; разуменне рэзультатаў навучання; самастойнае вызначэнне ўласных рэзультатаў; збор і адбор сведчанняў).

3. Прызнанне/ацэнка (ацэнка дасягнення рэзультатаў навучання і крытэры ацэнкі).

4. Прысуджэнне крэдытаў (крэдыты, якія будуць прысуджацца ў ходзе гэтага працэсу, маюць той жа "кошт", што і крэдыты ў рамках праграм фармальнай адукацыі).

**Nota Bene**

Па рэкамендацыі Еўрапейскага парламента і Еўрапейскага савета (2009/С 155/02) была распрацавана Еўрапейская сістэма крэдытаў для прафесійнай адукацыі і навучання (ECVET). Сістэма ECVET прызначана для палягчэння пераносу, назапашвання і прызнання ўжо ацэненых рэзультатаў навучання асобаў, якія імкнуцца атрымаць кваліфікацыю ў сферы прафесійнай адукацыі і навучання (VET). Як і Еўрапейская сістэма пераносу і назапашвання крэдытаў, сістэма ECVET палягчае працэс назапашвання крэдытаў і дапамагае студэнтам у выбары індывідуальнай траекторыі навучання як у рамках адной адукацыйнай установы, так і ў межах розных установаў, краін, адукацыйных сістэм і кантэкстаў навучання (напрыклад, у рамках фармальнага, нефармальнага і спантаннага навучання) і дапамагае ім сфарміраваць індывідуальны стыль навучання і свой досвед. Як і ECTS, Еўрапейская сістэма крэдытаў заснаваная на паняцці 60 крэдытаў, аднак размеркаванне крэдытаў тут іншае. Часта ECVET выкарыстоўваецца для фіксавання і назапашвання ацэненых рэзультатаў навучання, але без іх канвертацыі ў крэдыты. Такім чынам, рэкамендуецца прызнаваць прафесійную адукацыю і навучанне на аснове дасягнутых рэзультатаў навучання, замест канвертацыі крэдытаў.

**Раздзел 6. ECTS і забеспячэнне якасці**

*У гэтым раздзеле змяшчаецца інфармацыя пра тое, якім чынам ECTS спрыяе павышэнню якасці навучання ў ВНУ, і даюцца прыклады ацэнкі практычнага прымянення ECTS.*

Асноўная адказнасць за забеспячэнне якасці адукацыі ляжыць на самой адукацыйнай установе, у адпаведнасці з дамовай міністраў адукацыі краін-удзельнікаў Балонскага працэса (Камюніке канферэнцыі міністраў вышэйшай адукацыі, Берлін, 19 верасня 2003 г.). Унутранае забеспячэнне якасці ўключае ў сябе працэдуры, якія рэалізуюцца ВНУ для адпаведнасці якасці іх праграм і спецыяльнасцяў усталяваным характарыстыкам і патрабаванням адпаведных органаў, такіх як агенцтваў па забеспячэнні якасці. Знешнія праверкі, якія ажыццяўляюцца агенцтвамі па забеспячэнні якасці, даюць зваротную сувязь адукацыйным арганізацыям і інфармацыю для зацікаўленых бакоў. Прынцыпы і працэсы забеспячэння якасці стасуюцца з усімі формамі навучання і выкладання (фармальнае, нефармальнае, спантаннае, новыя метады навучання, выкладання і ацэнкі). *Еўрапейская асацыяцыя забеспячэння якасці вышэйшай адукацыі (ENQA*, 2005 г.) падтрымлівае адпаведны ўзровень унутранага і знешняга забеспячэння якасці.

**Nota Bene**

"Еўрапейскія стандарты і кіруючыя прынцыпы (ESG)” - комплекс кіруючых прынцыпаў для ўнутранага і знешняга забеспячэння якасці вышэйшай адукацыі. ESG не з’яўляюцца стандартамі якасці, яны не апісваюць правільны метад ажыццяўлення працэсаў забеспячэння якасці. Яны даюць кіруючыя прынцыпы ў сферах, якія маюць першараднае значэнне для паспяховага забеспячэння якасці і для навучальнага асяроддзя вышэйшай адукацыі. ESG павінен разглядацца ў больш шырокім кантэксце, ахопліваючы рамкі кваліфікацыяў, ECTS і Дадатак да дыплома, што таксама спрыяе павышэнню празрыстасці і ўзаемадаверу ў сферы вышэйшай адукацыі ў EHEA". Стандарты 1.2, 1.3, 1.4 і звязаныя з імі кіруючыя прынцыпы датычацца сферы выкарыстання ECTS (у прыватнасці, распрацоўкі адукацыйных праграм, навучання, арыентаванага на студэнта, выкладання і ацэнкі, залічвання і пераходу студэнтаў на наступны курс, прызнання крэдытаў і іх сертыфікацыі.

Паспяховая практыка выкарыстання ECTS дапаможа ВНУ павысіць якасць праграм і магчымасцяў акадэмічнай мабільнасці. Такім чынам, выкарыстанне сістэмы прызнання крэдытаў ECTS павінна суправаджацца адпаведнымі працэдурамі забеспячэння якасці і адпаведнымі працэсамі ацэнкі (напрыклад, маніторынга, знешняй і ўнутранай праверкі якасці і зваротнай сувязі ад студэнтаў) і пастаяннага ўдасканалення якасці. Пры ацэнцы эфектыўнасці праграмы (у тым ліку, рэзультатаў навучання, працавыдаткаў і метадаў ацэнкі) будзе выкарыстаны шэраг мер, якія могуць уключаць у сябе высокі ўзровень першапачатковага адсеву студэнтаў, узровень правалаў на іспытах або занадта доўгая працягласць навучання. Праграма лічыцца эфектыўнай, калі яе мэты дасягаюцца ў прызначаны тэрмін, гэта значыць, калі студэнты дасягаюць устаноўленых рэзультатаў навучання, назапашваюць зададзеную колькасць крэдытаў і атрымліваюць адпаведную кваліфікацыю. Аднак варта надаваць асаблівую ўвагу крытычнаму аналізу розных кампанентаў праграмы, паколькі такі аналіз можа сведчыць пра неэфектыўнае планаванне або рэалізацыю праграмы, ці пра недастатковыя меры па падтрымцы студэнтаў.

Для ацэнкі якасці рэалізацыі ECTS могуць быць выкарыстаны наступныя паказчыкі:

- Адукацыйныя кампаненты выражаюцца ў тэрмінах, адпаведных рэзультатам навучання, і інфармацыя адносна ўзроўняў гэтых кампанентаў, крэдытаў, іх рэалізацыі і ацэнкі лёгка дасягальная;
- Навучанне завяршаецца ў афіцыйна прызначаныя для гэтага тэрміны (г.зн. працавыдаткі рацыянальна размеркаваныя па ўсёй працягласці навучальнага года, семестра, трыместра, або кожны кампанент курса даступны для выканання);
- Штогадовы маніторынг праграмы выяўляе любыя магчымыя змены ў траекторыях дасягнення яе рэзультатаў, што суправаджаецца належным пераглядам праграмы;
- Студэнтам даецца падрабязная інфармацыя і кансультацыі, каб яны маглі эфектыўна рухацца па траекторыі навучання, выбіраць розныя траекторыі і навучальныя кампаненты на ўзроўні, адпаведным іх кваліфікацыі;
- Студэнтам неадкладна паведамляюцца рэзультаты іх навучання.

Для прызнання крэдытаў па праграмах мабільнасці гэта азначае, што:

- Працэсы пераносу крэдытаў уключаюцца ў працэдуры маніторынгу, перагляду і валідацыі;
- Прызначаецца спецыяліст, адказны за прызнанне і перанос крэдытаў;
- Пагадненні пра навучанне заключаюцца ва ўсіх выпадках; іх рэалізацыя і любое наступнае змяненне і дапаўненне падлягаюць далейшай далікатнай і цвёрдай ацэнцы і, у выпадку станоўчага рашэння, ухвалення;
- Абітурыенты праграм мабільнасці выбіраюць адукацыйныя кампаненты з існуючага Каталога курсаў, а рэзультаты іх дасягненняў ацэньваюцца гэтак жа, як і рэзультаты іншых студэнтаў курса;
- Выдаюцца Даведкі пра навучанне, якія змяшчаюць інфармацыю пра прысуджаныя крэдыты і адзнакі;
- Прызнаюцца ўсе крэдыты, прысуджаныя за паспяхова засвоеныя кампаненты праграмы ў адпаведнасці з зацверджаным канчатковым варыянтам Пагаднення пра навучанне; дасягнутыя рэзультаты неадкладна выдаюцца і паведамляюцца студэнту;
- Існуюць адмысловыя табліцы для інтэрпрэтацыі выстаўленых адзнак; такім чынам, адзнакі, а не толькі крэдыты, адэкватна адлюстроўваюцца ва ўсіх прысуджаных кваліфікацыях.

Прадстаўнікі студэнтаў павінны прымаць актыўны ўдзел у працэсах забеспячэння якасці ECTS:

- Для ўнутранага забеспячэння якасці студэнты самі падаюць інфармацыю: праз удзел у рэгулярных апытаннях, фокус-групах, падрыхтоўцы справаздач па самаацэнцы адукацыйнай арганізацыі, актыўна ўдзельнічаюць у працы органаў, адказных за ўнутранае забеспячэнне якасці і за маніторынг размеркавання крэдытаў ECTS.
- Для знешняга забеспячэння якасці студэнты самі прымаюць удзел у экспертных камісіях па знешняй ацэнцы арганізацыяў і праграм вышэйшай адукацыі.

## Раздзел 7. Ключавыя дакументы ECTS

*Выкарыстанне ECTS грунтуецца на дакументах, заснаваных на прынцыпах, якія выкладзеныя ў дадзеным Кіраўніцтве. Дадзены раздзел прапануе асноўныя элементы, якія павінны быць уключаны ў вышэйпазначаныя дакументы. Гэтыя элементы ўяўляюць сабой распаўсюджаны і шырока прымяняльны спосаб перадачы інфармацыі, карысны для ўсіх студэнтаў (у тым ліку мабільных студэнтаў і студэнтаў, якія не ўдзельнічаюць у праграмах акадэмічнай мабільнасці), выкладчыцкага і адміністрацыйнага персаналу, працадаўцаў і іншых зацікаўленых бакоў*.

Для задавальнення патрэбаў студэнтаў, адукацыйныя арганізацыі павінны рэгістраваць іх дасягненні ў зразумелых і дасціпных справаздачах. Такім чынам, дадзенае Кіраўніцтва змяшчае пункты, якія павінны быць уключаныя ў ключавыя дакументы мабільнасці, з мэтай паляпшэння ўзаемапаразумення паміж рознымі ВНУ і рознымі краінамі, унутранымі і знешнімі зацікаўленымі бакамі.

### 7.1 Каталог курсаў

Каталог курсаў змяшчае падрабязную і зручную ў выкарыстанні інфармацыю, якая рэгулярна абнаўляецца, пра асяроддзе навучання ў адукацыйнай установе. Яна павінна быць даступная для студэнтаў перад паступленнем і на працягу ўсяго перыяду навучання, каб яны маглі зрабіць правільны выбар і найбольш эфектыўна выкарыстоўваць свой час. Гэтая інфармацыя можа ўключаць звесткі пра кваліфікацыю, што прысвойваецца па заканчэнні праграмы, працэс навучання, метады выкладання і працэдуры ацэнкі, узровень адукацыйных праграм, асобныя адукацыйныя кампаненты і навучальныя рэсурсы. Каталог курсаў павінен змяшчаць імёны кантактных асобаў з пазначэннем іх кантактных дадзеных, часу і месца працы.

Каталог курсаў павінен размяшчацца на вэб-сайце ўстановы, з пазначэннем назвы курсаў/прадметаў на нацыянальных/рэгіянальных мовах студэнтаў і на ангельскай мове, каб зрабіць інфармацыю пра курсы даступнай усім зацікаўленым бакам.

Каталог курсаў павінен быць апублікаваны на вэб-сайце з дастатковым запасам часу да пачатку курсаў, каб патэнцыяльныя студэнты паспелі зрабіць свой выбар.

Адукацыйная ўстанова мае права самастойна выбіраць фармат Каталога і паслядоўнасць выкладання інфармацыі ў ім. Аднак, у выпадку выбару агульнапрынятага фармата, Каталог лягчэй супастаўляць з каталогамі курсаў іншых устаноў, і яго структура лепш упарадкаваная. У любым выпадку, Каталог курсаў павінен уключаць агульную інфармацыю пра дадзеную адукацыйную арганізацыю, яе рэсурсы і паслугі, адукацыйныя праграмы і асобныя адукацыйныя кампаненты.

## Каталог курсаў

**Рэкамендаваныя пункты для ўключэння ў Каталог курсаў**

***Агульная інфармацыя***:

- найменне і адрас адукацыйнай арганізацыі
- апісанне адукацыйнай установы (уключаючы тып арганізацыі і яе статус)
- кіраўніцтва ўстановы
- акадэмічны каляндар
- пералік праграм, што рэалізуюцца ва ўстанове
- патрабаванні да паступлення, у тым ліку моўная палітыка, і працэдуры рэгістрацыі
- мерапрыемствы па прызнанні перыядаў мабільнасці і папярэдняга навучання (фармальнага, нефармальнага і спантаннага)
- палітыка размеркавання крэдытаў ECTS (інстытуцыйная крэдытная сістэма)
- мерапрыемствы па суправаджэнні навучання

***Рэсурсы і паслугі***:

- служба па працы са студэнтамі
- паслугі пражывання/размяшчэння студэнтаў
- харчаванне
- кошт пражывання
- фінансавая падтрымка студэнтаў
- медыцынскае абслугоўванне
- страхаванне
- сродкі абслугоўвання для студэнтаў з абмежаванымі магчымасцямі і асаблівымі патрэбамі
- матэрыяльныя сродкі навучання
- магчымасці ўдзелу ў міжнародных праграмах акадэмічнай мабільнасці
- практычная інфармацыя для абітурыентаў па праграмах мабільнасці
- моўныя курсы
- магчымасці стажыровак на працоўным месцы
- абсталяванне для заняткаў спортам і адпачынку

- студэнцкія асацыяцыі

***Інфармацыя па кожнай адукацыйнай праграме***:

- кваліфікацыя, якая прысвойваецца за яе
- працягласць праграмы
- колькасць крэдытаў, якія магчыма зарабіць за праграму
- узровень кваліфікацыі, якая прысуджаецца ў адпаведнасці з Нацыянальнай рамкай кваліфікацыяў і Еўрапейскай рамкай кваліфікацыяў
- сфера вывучэння (напрыклад, згода Міжнароднай стандартнай класіфікацыі адукацыі ISCED-F)
- канкрэтныя патрабаванні да абітурыентаў, калі гэта прымяняльна
- меры па прызнанні папярэдняга навучання (фармальнага, нефармальнага і спантаннага, калі гэта прымяняльна)
- кваліфікацыйныя патрабаванні і палажэнні, уключаючы патрабаванні да выпускнікоў установаў сярэдняй адукацыі, калі гэта прымяняльна
- профіль праграмы (гл.раздзел па Распрацоўцы праграмы)
- рэзультаты навучання па праграме
- структурная схема праграмы з улікам крэдытаў (60 крэдытаў ECTS за поўны акадэмічны год навучання па вочнай форме)
- формы навучання (вочная, вочна-завочная форма, онлайн-навучанне, і г.д.)
- палажэнні па правядзенні іспытаў і шкала адзнак
- абавязковыя ці дадатковыя вокны мабільнасці, калі гэта прымяняльна
- стажыроўкі на працоўным месцы, калі гэта прымяняльна
- навучанне на прадпрыемстве
- кіраўнік праграмы, ці раўназначная яму пасада
- прафесійныя профілі выпускнікоў
- магчымасці далейшага навучання

Да сумесных праграм *рэкамендуецца далучаць наступныя пункты*:

- інфармацыя па тыпу дакумента аб атрыманай адукацыі і Дадатка да яго (аб'яднаны/двайны дыплом, дыплом на некалькі спецыяльнасцяў)

- члены акадэмічнага кансорцыума і іх роля
- структура мабільнасці праграмы

***Інфармацыя па характарыстыках асобных адукацыйных кампанентаў***:

- код
- назва кампанента
- тып (абавязковы/факультатыўны)
- цыкл (кароткі/першы/другі/трэці)
- год вывучэння, калі гэта прымяняльна
- семестр або трыместр вывучэння, калі гэта прымяняльна
- колькасць зробленых крэдытаў
- імя і прозвішча лектара (-аў)
- рэзультаты навучання
- тып навучання (навучанне пад непасрэдным кіраўніцтвам выкладчыка/дыстанцыйнае навучанне, інш.)
- падрыхтоўчыя курсы і абавязковыя курсы, паралельныя асноўнаму, калі гэта прымяняльна
- змест курса
- рэкамендаваня або абавязковая літаратура, іншыя рэсурсы і сродкі навучання
- запланаваныя віды навучальнай дзейнасці і метады навучання
- метады і крытэры ацэнкі
- мова навучання

### 7.2 ECTS і суправаджальныя дакументы па акадэмічнай мабільнасці

Пагадненне пра навучанне афіцыйна ўсталёўвае ўзаемныя абавязкі паміж студэнтам, адукацыйнай арганізацыяй, якая накіроўвае яго на праграму мабільнасці, і арганізацыяй/установай/таварыствам, якая забяпечвае арганізацыю навучальнай дзейнасці студэнта.
Зацвярджэнне Пагаднення пра навучанне і любыя змены ў ім могуць ажыццяўляцца пасродкам лічбавых подпісаў або адсканаваных копіяў подпісаў, дасланых у электронным выглядзе, у адпаведнасці з правіламі дадзенай установы.

### 7.2.1 Пагадненне пра навучанне для праграм акадэмічнай мабільнасці

**Акадэмічная (крэдытная) мабільнасць**

***Рэкамендаваныя пункты для ўключэння ў Пагадненне пра навучанне для праграм акадэмічнай мабільнасці:***

- імя і прозвішча, кантактныя дадзеныя студэнта
- імёны, адрасы і пасады кантактных асобаў з ліку навучальнага і/ці адміністрацыйнага персаналу адукацыйнай установы, якая накіроўвае студэнта на праграму мабільнасці, і ўстановы, якая запрашае студэнта
- сфера вывучэння ў адукацыйнай установе, якая накіроўвае студэнта (коды Міжнароднай стандартнай класіфікацыі адукацыі ISCED-F)
- цыкл навучання (кароткі/першы/другі/трэці цыкл)
- перыяд навучання (з/па) у адукацыйнай установе, якая запрашае студэнта
- праграма навучання за мяжой: спасылка на Каталог курсаў у адукацыйнай установе, якая запрашае студэнта на навучанне, і спіс адукацыйных кампанентаў, якія плануецца вывучаць студэнту (з указаннем кодаў і колькасці крэдытаў ECTS)
- адукацыйныя кампаненты, ад якіх студэнт будзе вызвалены ў адукацыйнай установе, якая накіроўвае студэнта на праграму мабільнасці, пры ўмове паспяховага праходжання адпаведных дысцыплін у адукацыйнай установе, якая запрашае студэнта, або пры поўным прызнанні перыяду мабільнасці (напрыклад, у выпадку ўключэння вокнаў мабільнасці і атрыманых ступеняў у праграму, якая прадугледжвае абавязковы перыяд навучання за мяжой)
- подпісы трох зацікаўленых бакоў (студэнта, прадстаўнікоў адукацыйнай установы, якая накіроўвае студэнта на праграму мабільнасці, і ўстановы, якая яго запрашае).

### 7.2.2 Падпісанне Пагаднення пра навучанне для праходжання стажыроўкі на працоўным месцы

Пагадненне пра навучанне вельмі важна і для стажыровак на працоўным месцы, паколькі з’яўляецца абавязковым дакументам, які рэгулюе адукацыйную дзейнасць у рамках дадзенага кампанента адукацыйнай праграмы студэнта.

У абавязкі адукацыйнай арганізацыі, якая запрашае студэнта на стажыроўку, уваходзіць забеспячэнне якасных умоваў праходжання стажыроўкі ў адпаведнасці з індывідуальнай траекторыяй навучання студэнта і дакладна вызначанымі рэзультатамі навучання, а таксама выдача Сертыфіката пра праходжанне стажыроўкі пасля яе заканчэння. У абавязкі адукацыйнай арганізацыі, якая накіроўвае студэнта, уваходзіць забеспячэнне якасці і

актуальнасці праграмы стажыроўкі, маніторынг навучальнага прагрэсу студэнта і прызнанне крэдытаў у выпадку паспяховага завяршэння стажыроўкі.

Пагадненне пра навучанне ў рамках праходжання стажыроўкі павінна быць падпісана трыма бакамі: студэнтам, адукацыйнай арганізацыяй, якая накіроўвае ст удэнта на стажыроўку, і адукацыйнай арганізацыяй/таварыствам, якая запрашае студэнта.

**Стажыроўка на працоўным месцы**

***Рэкамендаваныя пункты для ўключэння ў Пагадненне пра навучанне для праходжання стажыроўкі:***

- імя і прозвішча, кантактныя дадзеныя студэнта
- імёны, адрасы і пасады кантактных асобаў адукацыйнай установы, якая накіроўвае студэнта на стажыроўку, і ўстановы/таварыства, якая запрашае студэнта
- сфера вывучэння ў адукацыйнай установе, якая накіроўвае студэнта на стажыроўку (коды Міжнароднай стандартнай класіфікацыі адукацыі ISCED-F)
- цыкл навучання (кароткі/першы/другі/трэці цыкл)
- тып арганізацыі/таварыства (прыватная, дзяржаўная ці інш.)
- перыяд навучання (з/па) у адукацыйнай установе, якая запрашае студэнта на стажыроўку, і колькасць крэдытаў ECTS, якія можа атрымаць студэнт
- рэзультаты навучання, якія павінен мець стажор пасля заканчэння стажыроўкі
- падрабязная праграма перыяду стажыроўкі, уключаючы пералік пастаўленых задач і рэзультатаў
- колькасць працоўных гадзін на тыдзень
- узровень моўнай кампетэнцыі для праходжання стажыроўкі, які студэнт мае або павінен мець да пачатку стажыроўкі, калі гэта прымяняльна
- мерапрыемствы па маніторынгу і план ацэнкі
- магчымасць унясення змяненняў у Пагадненне пра навучанне ў рамках праходжання стажыроўкі
- мерапрыествы па прызнанні крэдытаў у адукацыйнай установе, якая накіроўвае студэнта на стажыроўку
- подпісы трох бакоў (студэнта, прадстаўнікоў адукацыйнай установы, якая накіроўвае студэнта на стажыроўку, і ўстановы/таварыства, якая яго запрашае, у тым ліку яго кіраўніка).

### 7.3 Акадэмічная даведка

Акадэмічная даведка змяшчае актуальную інфармацыю пра навучальны прагрэс студэнта: колькасць засвоеных навучальных кампанентаў, атрыманых крэдытаў ECTS і прысуджаных за гэта адзнак.

Паколькі Акадэмічная даведка з'яўляецца істотным дакументам для сведчання прагрэсу ў навучанні і прызнання навучальных дасягненняў студэнта, вельмі важна вызначыць, хто нясе адказнасць за выдачу Даведкі, якая працэдура выдачы, і ў якім выглядзе яна будзе прадастаўлена. Большасць установаў выдаюць Даведку на базе ўласных базаў дадзеных. Важна мець на ўвазе, што Даведка можа быць у далейшым выкарыстана ў іншых кантэкстах, таму інфармацыя ў ёй павінна быць вычарпальнай, зразумелай і выразна сфармуляванай.

Для праграм акадэмічнай мабільнасці: адукацыйная ўстанова, якая запрашае студэнтаў на навучанне, выдае Даведку ўсім мабільным студэнтам пасля заканчэння іх перыяду навучання і дасылае ў адукацыйную арганізацыю, якая іх накіравала на навучанне, для афіцыйнага пацверджання выкананай працы, колькасці прысвоеных крэдытаў і адзнак, якія былі зробленыя на працягу перыяду мабільнасці. Даведка павінна быць дасланая ў дастаткова кароткі тэрмін пасля абвяшчэння выніковых рэзультатаў студэнта ў адукацыйнай установе, якая яго запрасіла (гл.раздзел па мабільнасці і прызнанні крэдытаў).

## Акадэмічная даведка

***Рэкамендаваныя пункты для ўключэння ў Даведку пра навучанне***:

- Імя і прозвішча студэнта
- Асабістыя і/або кантактныя дадзеныя студэнта, калі гэта прымяняльна
- Кантактныя дадзеныя навучальнай установы, дзе студэнт прайшоў курс
- Сфера вывучэння студэнта і/або назва праграмы
- Бягучы год навучання
- Адукацыйныя кампаненты, засвоеныя студэнтам у дадзенай адукацыйнай установе (з кодамі, зробленымі крэдытамі і выстаўленымі адзнакамі)
- Апісанне інстытуцыйнай шкалы выстаўлення адзнак
- Інфармацыя аб размеркаванні адзнак у рэферэнтнай групе
- Дата выдачы Даведкі і подпіс адказнай асобы

Адукацыйная арганізацыя, якая накіравала студэнта, павінна выдаць яму Даведку пра навучанне (або эквівалентны дакумент/базу дадзеных), без дадатковых патрабаванняў і ў

дастаткова кароткі перыяд часу. Гэта забяспечыць празрыстасць у прызнанні рэзультатаў навучання па праграме мабільнасці за мяжой.

Для рэалізацыі акадэмічнай мабільнасці, рэкамендуецца ўключаць у Даведку навучальныя кампаненты, якія былі замешчаныя ў праграме адукацыйнай арганізацыі, якая накіравала студэнта; колькасць крэдытаў, якія адпавядаюць дадзеным кампанентам; пераклад атрыманых студэнтам за мяжой адзнак, калі гэта прымяняльна. Калі тэрмін навучання прызнаецца ў цэлым, а не па асобных кампанентах, адукацыйная арганізацыя, якая накіроўвае студэнта, павінна проста зафіксаваць колькасць крэдытаў, мясцовыя адзнакі (дзе гэта прымянальна) і рэзультаты навучання, зададзеныя для ўсяго перыяду мабільнасці.

У выпадку стажыровак, Акадэмічная даведка з адукацыйнай арганізацыі, якая накіравала студэнта на стажыроўку, будзе змяшчаць, па меншай меры, інфармацыю, неабходную для выканання ўсіх дамоўленасцяў па прызнанні крэдытаў, узгодненых ў Пагадненні пра навучанне, такіх як заробленая колькасць крэдытаў, адзнакі і г.д.

### 7.4 Сертыфікат пра праходжанне стажыроўкі

Сертыфікат пра праходжанне стажыроўкі забяспечвае празрыстасць навучання і пацвярджае кампетэнцыі, засвоеныя студэнтам цягам стажыроўкі. Гэты дакумент выдаецца адукацыйнай арганізацыяй/прадпрыемствам, якое запрасіла студэнта на стажыроўку, пасля завяршэння стажыроўкі на працоўным месцы і можа быць дапоўнены іншымі дакументамі, такімі як, напрыклад, рэкамендацыйныя лісты.

**Сертыфікат пра праходжанне стажыроўкі**

Рэкамендаваныя пункты для ўключэння ў Сертыфікат пра праходжанне стажыроўкі:

- Імя і прозвішча студэнта
- Назва арганізацыі/прадпрыемства
- Кантактныя дадзеныя арганізацыі/прадпрыемства (вуліца, населены пункт, краіна, нумар тэлефона, адрас электроннай пошты, вэб-сайт)
- Тып арганізацыі/прадпрыемства (дзяржаўнае/прыватнае/трэцяга сектару/...)
- Даты пачатку і завяршэння стажыроўкі
- Падрабязная праграма стажыроўкі, спіс задач
- Засвоеныя веды, навыкі (інтэлектуальныя і практычныя) і набытыя кампетэнцыі (дасягнутыя рэзультаты навучання)
- Ацэнка працы студэнта
- Дата выдачы Даведкі, прозвішча, імя і подпіс адказнай асобы

**Удзячнасць**

Дадзенае Кіраўніцтва з'яўляецца рэзультатам вялікай працы, праведзенай за апошнія гады ў рамках Балонскага працэсу ў розных краінах. Было б немагчыма належным чынам падзякаваць усім арганізацыям і людзям, якія выканалі гэтую працу.

Асобна, Еўрапейская камісія хацела б падзякаваць членам Спецыяльнай рабочай групы, абранай прадстаўнікамі краін Еўрапейскай прасторы вышэйшай адукацыі, а таксама арганізацыям-удзельнікам за іх падтрымку ў падрыхтоўцы і ўдзел у падрыхтоўцы дадзенага Кіраўніцтва:

Ivan Babyn (Украіна)

Tim Birtwistle (Вялікабрытанія)

Regine Bolter (Аўстрыя)

Howard Davies (Еўрапейская асацыяцыя універсітэтаў/EUA)

Béatrice Delpouve (Францыя)

Roza Dumbraveanu (Малдова)

Luc François (Бельгія)

Volker Gehmlich (Германія)

Nerses Gevorgyan (Арменія)

Judit Hidasi (Венгрыя)

Maria Kelo (Еўрапейская асацыяцыя забеспячэння якасці вышэйшай адукацыі/ENQA)

Eliane Kotler (Францыя)

Sandra Kraze (Еўрапейская асацыяцыя ўстановаў вышэйшай адукацыі/EURASHE)

Janerik Lundquist (Швецыя)

Raimonda Markeviciene (Літва)

Lene Oftedal (Нарвегія)

John Reilly (Вялікабрытанія)

Maria Sticchi Damiani (Італія)

Anthony Vickers (Вялікабрытанія)

Nevena Vuksanovic (Еўрапейскі студэнцкі саюз/ESU)

Robert Wagenaar (Нідэрланды)

## Дадатак 1

## Гласарый

**Адкрытыя адукацыйныя рэсурсы/Open Educational Resources (OER)** - алічбаваныя матэрыялы, якія прапануюцца ў свабодным і адкрытым доступе для шматразовага выкарыстання з мэтамі навучання, выкладання і даследаванняў для выкарыстання выкладчыкамі, студэнтамі і асобамі, якія займаюцца самаадукацыяй. Дадзеныя рэсурсы ўключаюць у сябе літаратуру для вывучэння (змест навучання), інструменты праграмнага забеспячэння для распрацоўкі, выкарыстання і распаўсюджвання зместу, а таксама рэсурсы для ўкаранення, такія, як простыя ліцэнзіі. Да адкрытых адукацыйных рэсурсаў таксама адносяцца назапашаныя лічбавыя актывы, якія можна падладжваць пад розныя патрэбы і супольна карыстацца імі ў адкрытым доступе.

**Адукацыйны кампанент/Educational component** - цэласны і структураваны ў адпаведнасці з фармальнымі рамкамі досвед навучання (напрыклад, элемент/раздзел курса, модуль, стажыроўка).

**Адукацыйная праграма/Programme (educational)** - набор адукацыйных кампанентаў, якія прыводзяць да прысваення студэнту кваліфікацыі пасля паспяховага дасягнення ім зададзеных рэзультатаў навучання.

**Акадэмічная (крэдытная) мабільнасць /Credit mobility -** мабільнасць студэнта па абмене, які/якая пражывае за кошт і на тэрыторыі адукацыйнай арганізацыі, якая яго запрасіла, у перыяд, цягам якога ён/яна можа ажыццяўляць дзейнасць, за якую прысуджаюцца акадэмічныя крэдыты, якія ў далейшым прызнаюцца адукацыйнай арганізацыяй, якая накіравала студэнта.

**Акадэмічная мабільнасць (Мабільнасць студэнта )/Learning mobility** - пад мабільнасцю звычайна разумеецца фізічная мабільнасць, у рамках якой навучэнец/студэнт пераязджае ў адукацыйную ўстанову іншай краіны для вывучэння часткі ці ўсёй праграмы свайго навучэння. У большасці выпадкаў такая мабільнасць мае месца ў рамках спланаваных і арганізаваных праграм. Крэдыты па рэзультатах такой мабільнасці афіцыйна прызнаюцца адукацыйнай установай, якая накіравала студэнта на дадзеную праграму.

Акрамя таго, існуе досыць вялікі працэнт выпадкаў “свабоднай мабільнасці студэнтаў”, якая адбываецца па асабістай ініцыятыве навучэнцаў. Нароўні з фізічнай мабільнасцю студэнтаў, расце колькасць магчымасцяў для ўдзелу ў праграмах віртуальнай мабільнасці. Гэта таксама можа адбывацца ў рамках арганізаваных сумесных або агульных адукацыйных праграм, адкрытых універсітэтаў, адкрытых адукацыйных рэсурсаў, масавых адкрытых онлайн-курсаў (MOOCs) ці іншых онлайн-матэрыялаў.

**Акно мабільнасці/Mobility window** - перыяд часу, які спецыяльна выдзелены на праграму мабільнасці замежнага студэнта і ўбудоўваецца ў навучальны план асноўнай адукацыйнай праграмы (Ferencz і інш., 2013 г.).

**Бесперапыннае прафесійнае развіццё/Continuing Professional Development (CPD)** - адзін з відаў навучання на працягу ўсяго жыцця, які часам называецца бесперапыннай прафесійнай адукацыяй. CPD апісвае навыкі, веды і досвед, якія чалавек набывае ў рамках

фармальнага і нефармальнага навучання на асноўным месцы працы, на аснове базавай кваліфікацыі і навучання. Усё часцей у прафесійнай і працоўнай дзейнасці сустракаецца патрабаванне працягваць вучыцца і набываць новыя веды, навыкі і кампетэнцыі на працягу кар'еры, каб не адставаць ад новых тэндэнцыяў і тэхналогіяў і быць здольным працаваць прадуктыўна, у адпаведнасці з патрабаваннямі заканадаўства і бяспекі. Бесперапынная адукацыя, калі яна з'яўляецца прафесійным патрабаваннем, афіцыйна зацвярджаецца і, паколькі ўсё больш і больш працадаўцаў чакаюць ад сваіх работнікаў афіцыйнага, юрыдычна заверанага пацверджання праходжання CPD, у цяперашні час яно становіцца важным кампанентам адукацыйных курсаў.

**Валідацыя/Validation** - працэс пацверджання ўпаўнаважаным органам дасягнення студэнтам зададзеных рэзультатаў навучання, у адпаведнасці з усталяванымі стандартамі. Працэс валідацыі ўключае наступныя чатыры адасобленыя этапы:

1. **Вызначэнне** ўзроўня досведу студэнта падчас сумоўя;

2. **Занясенне** гэтага досведу ў базу;

3. Афіцыйная **ацэнка** гэтага досведу, і

4. Выдача **афіцыйнага пасведчання (сертыфіката**) па рэзультатах ацэнкі, якая можа прывесці да прысуджэння частковай або поўнай кваліфікацыі (Рэкамендацыя Савета ЕС 2012/C 398/01).

**Віртуальная мабільнасць/Virtual mobility** - віртуальнае міжнароднае навучанне, г.зн. навучанне студэнта ў рамках дыстанцыйных курсаў, якія рэалізуюцца замежнай ВНУ. Віртуальная мабільнасць садзейнічае дапаўненню навучання ў рамках фізічнай мабільнасці. Віртуальная мабільнасць можа адыгрываць важную ролю ў стратэгіі інтэрнацыяналізацыі адукацыйнай установы (Праект MAUNIMO, “Адлюстраванне на карце акадэмічнай мабільнасці адукацыйнага персанала і студэнтаў”, 2015 г.).

**Гнуткасць/Flexibility** - датычыцца мер, якія павышаюць гнуткасц і індывідуальны падыход да рэалізацыі вышэйшай адукацыі. Гэтая канцэпцыя заснаваная на ідэі, паводле якой вышэйшая адукацыя павінна стаць даступнай большай колькасці людзей і адаптавацца пад розныя жыццёвыя патрэбы разнастайных сучасных грамадстваў і суполак. Тое ж датычыць распрацоўкі праграм/курсаў/навучальных планаў і падыходаў да навучання і выкладання.

**Акадэмічная даведка/Transcript of Records** - самае актуальнае сведчанне акадэмічнай паспяховасці студэнта, укое ўключае спіс пройдзеных адукацыйных кампанентаў, колькасць назапашаных крэдытаў і атрыманыя за іх адзнакі. Гэта істотна важны дакумент для занатоўвання прагрэса студэнта і прызнання навучальных дасягненняў, уключаючы дасягненні ў рамках акадэмічнай мабільнасці. Большасць навучальных установаў выдаюць Даведкі на аснове сваіх унутраных базаў дадзеных.

**Дадатак да дыплома/Diploma Supplement** - дакумент, які дапаўняе Дыплом аб вышэйшай адукацыі і змяшчае стандартызаванае апісанне характару, узроўню, кантэксту, зместу і статуса навучання, атрыманага яго трымальнікам. Ён выдаецца ВНУ у адпаведнасці са стандартамі, узгодненымі Еўрапейскай камісіяй, Саветам Еўропы і ЮНЕСКА. Дадатак да

дыплома таксама з'яўляецца адным з інструментаў структуры забеспячэння празрыстасці “Еўрапас” (Europass).

Дадатак да дыплома мае наступныя восем раздзелаў:

- трымальнік кваліфікацыі
- кваліфікацыя
- яе ўзровень і функцыі
- змест кваліфікацыі і атрыманыя рэзультаты
- афіцыйнае пацверджанне Дадатку
- падрабязная інфармацыя аб нацыянальнай сістэме вышэйшай адукацыі, у рамках якой быў выдадзены Дыплом (прадастаўляецца Нацыянальнымі інфармацыйнымі цэнтрамі па акадэмічным прызнанні (NARICs))
- любая неабходная дадатковая інфармацыя

Выпускнікі ўсіх краін-удзельніц Балонскага працэса маюць права на атрыманне Дадатка да дыплома аўтаматычна, бясплатна і на асноўнай еўрапейскай мове.

**Дублінскія дэскрыптары/Dublin Descriptors** - дэскрыптары цыклаў/узроўняў, упершыню прадстаўленыя ў 2003 годзе і зацверджаныя ў 2005 годзе для апісання Рамкі кваліфікацыяў Еўрапейскай прасторы вышэйшай адукацыі. Яны прапануюць абагульненыя вызначэнні тыповых верагодных рэзультатаў датычна дасягненняў і здольнасцяў студэнтаў, звязаных з прысуджэннем ім ступеняў і кваліфікацыяў па завяршэнні кожнага адукацыйнага (Балонскага) цыкла/узроўню. Дэскрыптары сфармуляваныя ў тэрмінах узроўняў кампетэнцыяў, а не рэзультатаў навучання, і дазваляюць у агульным выглядзе праводзіць адрозненні паміж цыкламі. Кожны дэскрыптар узроўню ўключае ў сябе пяць кампанентаў:

- Веды і разуменне
- Прымяненне ведаў і разумення
- Аргументацыя і ўменне рабіць высновы
- Камунікацыя
- Навыкі навучання на працягу ўсяго жыцця

**Дэскрыптары цыклаў (узроўняў)/Cycle (Level) Descriptors** - абагульненае апісанне верагодных рэзультатаў навучання на кожным з трох цыклаў навучання студэнта. Добрым прыкладам дэскрыптараў агульных цыклаў/узроўняў з'яўляюцца т.зв. Дублінскія дэскрыптары, якія, нароўні з ECTS, сталі адным з падмуркаў для заснавання Рамкі кваліфікацыяў Еўрапейскай прасторы вышэйшай адукацыі.

**Забеспячэнне якасці/Quality assurance** - працэс ці комплекс працэсаў, прынятых на нацыянальным і інстытуцыйным узроўнях для забеспячэння якасці адукацыйных праграм і

прысуджаных кваліфікацыяў. Забеспячэнне якасці гарантуе наяўнасць адукацыйнага асяроддзя, у якім змест адукацыйных праграм, навучальных магчымасцяў і матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння адпавядаюць заяўленай мэце. Забеспячэнне якасці часта разглядаецца ў кантэксце цыкла бесперапыннага ўдасканалення (г.зн. дзейнасць па забеспячэнні і ўдасканаленні).

**Еўрапейская прастора вышэйшай адукацыі/EHEA** была запушчаная на дзесяцігоддзе запуска Балонскага працэса ў сакавіку 2010 года, падчас Канферэнцыі міністраў адукацыі (Будапешт-Вена). Зыходзячы з галоўнай мэты Балонскага працэса з моманту яго запуска (1999 год), EHEA мае мэтай забеспячэнне параўнальнасці, супастаўнасці, узгодненасці і прывабнасці сістэм вышэйшай адукацыі ў Еўропе.

**Еўрапейская рамка кваліфікацыяў для навучання на працягу жыцця/EQF-LLL** - агульная еўрапейская даведачная рамка, якая дазваляе краінам Еўрапейскага саюза суадносіць свае кваліфікацыйныя сістэмы. Был прынятая Еўрапейскім парламентам і Еўрапейскім саветам 23 красавіка 2008 года. Уключае ў сябе восем кантрольных узроўняў, заснаваных на рэзультатах навучання, вызначаных з пункту гледжання ведаў, навыкаў і набытых кампетэнцыяў. Гэта азначае перанос увагі з першапачатковых дадзеных (працягласць атрыманага навучання, тып ВНУ) на сапраўдныя веды і навыкі студэнта з пэўнай кваліфікацыяй. Такая змена падыхода да навучання спрыяе таму, што кваліфікацыі лягчэй прачытваюцца і хутчэй прызнаюцца ў розных краінах і сістэмах Еўрапейскага саюза.

**Еўрапейская сістэма крэдытаў для прафесійнай адукацыі і навучання/ECVET** - сістэма, прызначаная для пераносу, прызнання і назапашвання рэзультатаў навучання для атрымання кваліфікацыі. Гэта сістэма прадугледжвае добраахвотны ўдзел дзяржаў-членаў і зацікаўленых бакоў у сферы прафесійнага навучання, пры захаванні нацыянальнага заканадаўства і нацыянальных прававых норм і перадачай кожнай краіне ўсіх паўнамоцтваў па вырашэнні сваіх адукацыйных пытанняў. Дадзеная сістэма ўяўляе сабой метадалагічную рамку для апісання кваліфікацыяў у тэрмінах рэзультатаў навучання на базе навучальных курсаў/раздзелаў, што дазваляе размяркоўваць і пераносіць балы паміж дзяржавамі-членамі з рознымі адукацыйнымі і кваліфікацыйнымі рамкамі. ECVET заснаваная на партнёрскіх пагадненнях у тым, што датычыць празрыстасці кваліфікацыяў і ўзаемнага даверу паміж зацікаўленымі бакамі (ECVET, 2010 г.).

**Еўрапейская сістэма пераносу і назапашвання крэдытаў/ECTS** - арыентаваная на студэнта сістэма для назапашвання і пераносу крэдытаў, заснаваная на прынцыпе празрыстасці працэсаў навучання, выкладання і ацэнкі. Яе мэта - спрыяць планаванню, рэалізацыі і ацэнцы навучальных праграм і студэнцкай мабільнасці праз прызнанне дасягненняў у навучанні, кваліфікацыяў і перыядаў навучання.

**Камбінаваная (Аб’яднаная) праграма/Joint programme** - комплексная адукацыйная праграма, каардынаваная і рэалізаваная сумесна рознымі ВНУ, якая забяспечвае атрыманне аб’яднанага (двайнога) дыплома/дыплома на некалькі спецыяльнасцяў ці камбінаванай ступені (Еўрапейскі рэгістр забеспячэння якасці вышэйшай адукацыі, EQAR, 2015 г.).

**Камбінаваная (Аб’яднаная) ступень/Joint degree** - адзіны дакумент, які выдаецца ўстановамі вышэйшай адукацыі, у якіх рэалізуецца сумесная праграма, і прызнаецца на нацыянальных узроўнях у якасці афіцыйнага дакумента пра заканчэнне сумеснай праграмы (Еўрапейскі рэгістр забеспячэння якасці вышэйшай адукацыі, EQAR, 2015 г.).

**Кампетэнцыя/Competence** - кампетэнцыі вызначаюцца Еўрапейскай рамкай кваліфікацыяў як магчымасць выкарыстоўваць веды, навыкі і асобасныя, сацыяльныя навыкі і/або здольнасці структураваць інфармацыю, рабіць лагічныя высновы ў працоўных або навучальных сітуацыях, а таксама з мэтай прафесійнага і асабістага развіцця. У кантэксце Еўрапейскай рамкі кваліфікацыяў кампетэнцыя апісваецца ў тэрмінах адказнасці і самастойнасці.

Фарміраванне кампетэнцыяў з'яўляецца мэтай усіх адукацыйных праграм. Кампетэнцыі развіваюцца на ўсіх модулях курса і ацэньваюцца на розных стадыях рэалізацыі навучальных праграм. Некаторыя кампетэнцыі з'яўляюцца прадметнымі (адносяцца да канкрэтнай прадметнай вобласці), іншыя з'яўляюцца агульнымі (агульнымі для любой ступені любога курса). Як правіла, фарміраванне кампетэнцыяў ажыццяўляецца комплексна і цыклічна на працягу ўсіх навучальных праграм.

**Каталог курсаў/Course Catalogue** змяшчае падрабязную, зручную ў выкарыстанні і актуальную інфармацыю пра навучальнае асяроддзе адукацыйнай установы (агульную інфармацыю пра ўстанову, яе рэсурсы і службы, а таксама акадэмічную інфармацыю пра праграмы і адукацыйныя кампаненты). Гэта інфармацыя павінна быць даступная для студэнтаў перад паступленнем і на працягу ўсяго перыяду навучання, каб яны маглі зрабіць правільны выбар і найбольш эфектыўна выкарыстоўваць свой час. Каталог курсаў павінен размяшчацца на вэб-сайце ўстановы, з пазначэннем назвы курсаў/прадметаў на нацыянальных/рэгіянальных мовах студэнтаў і на ангельскай мове, каб зрабіць інфармацыю пра курсы даступнай усім зацікаўленым бакам.

Адукацыйная ўстанова мае права самастойна выбіраць фармат Каталога і паслядоўнасць выкладання інфармацыі ў ім. Каталог курсаў павінен быць выстаўлены на сайт з дастатковым запасам часу да пачатку курсаў, каб патэнцыяльныя студэнты паспелі зрабіць свой выбар.

**Кваліфікацыя/Qualification** - любая ступень, дыплом ці іншы афіцыйны дакумент/сертыфікат, выдадзены кампетэнтным органам, які сведчыць аб паспяховым завяршэнні прызнанай адукацыйнай праграмы.

**Крытэры ацэнкі/Assessment criteria** - апісанне таго, што і на якім узроўні студэнт павінен умець для дэманстрацыі рэзультатаў свайго навучання.

Метады і крытэры ацэнкі адукацыйных кампанентаў павінны адпавядаць і ўзгадняцца з зададзенымі для іх рэзультатамі навучання, а таксама з рэалізаванай навучальнай дзейнасцю.

**Крэдыт ECTS/Credits (ECTS)** выражае аб'ём навучання, заснаваны на зададзеных рэзультатах навучання і звязаных з імі працавыдаткамі. 60 крэдытаў ECTS адпавядаюць рэзультатам навучання і адпаведным працавыдаткам за поўны акадэмічны год навучання

па вочнай форме або яго эквівалента. Эквівалент звычайна ўключае ў сябе шэраг адукацыйных кампанентаў, за якія налічваюцца крэдыты на аснове рэзультатаў навучання і адпаведных працавыдаткаў. Крэдыты, як правіла, выражаюцца ў цэлых лічбах.

**Мабільнасць ў рамках праграм, якія вядуць да атрымання ступеняў/ Degree mobility** - акадэмічная мабільнасць з мэтай атрымання ступені, нават калі толькі частка навучальнай праграмы вывучаецца за мяжой; напрыклад, у праграмах, якія сумесна рэалізуюцца або за якія выдаецца сумесны дыплом (Праект MAUNIMO, "Адлюстраванне на карце акадэмічнай мабільнасці адукацыйнага персанала і студэнтаў", 2015 г.).

**Масавыя адкрытыя онлайн-курсы/Massive Open Online Courses (MOOCs)** - курсы са свабоднай падпіскай на іх, якія знаходзяцца ў адкрытым доступе і звычайна праводзяцца онлайн з дапамогай спецыяліста або аўтаматычнай сістэмы падтрымкі. Такія курсы звычайна маюць вялікую колькасць слухачоў.

**Метады ацэнкі/Assessment methods** - поўны набор пісьмовых, вусных і практычных тэстаў/іспытаў, праектаў, выступленняў, прэзентацыяў і партфоліо, якія выкарыстоўваюцца для ацэнкі прагрэсу навучэнца і зацверджання дасягнення ім рэзультатаў навучання па пэўным адукацыйным кампаненце (частцы курса/модуля).

**Модуль/Module** - элемент/частка/раздзел курса ў сістэме, у якой засваенне кожнага элемента/часткі/раздзела курса прыносіць аднолькавую колькасць крэдытаў або іх кратную колькасць.

**Навучанне, арыентаванае на студэнта/Student-Centred Learning** - падыход да навучання, характарызаваны інавацыйнымі метадамі выкладання і навучання, накіраваны на развіццё навучання праз кааперацыю выкладчыкаў і студэнтаў, у рамках якога студэнт разглядаецца як актыўны ўдзельнік працэсу навучання. Дадзены падыход спрыяе развіццю такіх важных навыкаў, як навыкі рашэння праблем, крытычнае і актыўнае мысленне (Еўрапейскі студэнцкі саюз/ESU, 2010 г.).

**Навучанне на працоўным месцы/Work-based learning** - навучанне, якое рэалізуецца ўніверсітэтам, каледжам ці іншым пастаўшчыком адукацыйных паслуг непасрэдна на працоўным месцы, звычайна пад кіраўніцтвам прадстаўніка дадзенай кампаніі, а таксама прафесійнага выкладчыка звонку (Шатландскі Савет па фінансаванні, 2015).

**Навучанне на працягу ўсяго жыцця/Lifelong learning** - уся навучальная дзейнасць, якая ажыццяўляецца на працягу жыцця з мэтай удасканалення ведаў, навыкаў і кампетэнцыяў з асабістымі, грамадзянскімі, грамадскімі і/або прафесійнымі мэтамі (Паведамленне Савета (2001) 678). Праграмы і паслугі, якія садзейнічаюць навучанню на працягу ўсяго жыцця ў рамках сектара вышэйшай адукацыі, могуць уключаць у сябе: найноўшыя адукацыйныя праграмы, бесперапыннае навучанне, вячэрнія заняткі, спецыяльныя праграмы няпоўнай формы навучання, доступ да бібліятэк/рэсурсаў ВНУ, дыстанцыйнае навучанне, трэнінгі, мэтавыя паслугі па прафарыентацыі і кансультаванню, і г.д.

**Навучэнец/Learner** - асоба, уключаная ў працэс навучання (фармальнай, нефармальнай або спантаннай адукацыі). Студэнты - гэта навучэнцы фармальнага навучальнага працэсу.

**Назапашванне крэдытаў/Accumulation of credits** - набор крэдытаў, прысуджаных за дасягненне рэзультатаў навучання па адукацыйных кампанентах ці за іншую навучальную дзейнасць, якая ажыццяўляецца ў нефармальным і спантанным кантэксце. Студэнт можа назапашваць крэдыты для атрымання кваліфікацыяў у адпаведнасці з патрабаваннямі адукацыйнай установы, якая выдае дыплом, або для занатоўвання асабістых дасягненняў з мэтай навучання на працягу ўсяго жыцця.

**Нацыянальная рамка кваліфікацыяў/National Qualifications Framework (NQF)** - інструмент для класіфікацыі кваліфікацыяў у адпаведнасці з наборам крытэраў для вызначаных засвоеных узроўняў навучання. Мае сваёй мэтай інтэграцыю і каардынацыю нацыянальных падсістэм кваліфікацыяў і павышэнне празрыстасці, даступнасці, якасці кваліфікацыяў і іх удасканаленне ва ўзаемасувязі з рынкам працы і грамадзянскай супольнасцю (Рэкамендацыя Савета ЕС 2012/С 398/01).
Нацыянальныя рамкі кваліфікацыяў ахопліваюць усе адукацыйныя кваліфікацыі - ці ўсё кваліфікацыі вышэйшай адукацыі, у залежнасці ад палітыкі дзяржавы - у адну адукацыйную сістэму. Яны дэманструюць, якія рэзультаты чакаюцца ад студэнта датычна яго/яе ведаў, разумення і навыкаў, на базе атрыманай кваліфікацыі (рэзультатаў навучання), а таксама паказваюць узаемасувязь кваліфікацыяў унутры адукацыйнай сістэмы адной краіны, г.зн. як студэнты могуць перамяшчацца паміж кваліфікацыямі ў сваёй адукацыйнай сістэме.

Нацыянальныя рамкі кваліфікацыяў распрацоўваюцца кампетэнтнымі дзяржаўнымі органамі кожнай краіны ва ўзаемадзеянні з шырокім колам зацікаўленых бакоў, уключаючы ВНУ, студэнтаў, супрацоўнікаў і працадаўцаў.

**Нефармальнае навучанне/Non-formal learning** - навучанне, якое адбываецца як запланаваная дзейнасць (з пункту гледжання мэтаў і часу навучання), пры наяўнасці любой формы падтрымкі ў навучанні (напрыклад, з дапамогай настаўніка). Яно можа ўключаць у сябе праграмы па фарміраванні прафесійных навыкаў, агульнай адукацыі і навучання дарослых людзей, якія не атрымалі сярэднюю адукацыю. Найбольш распаўсюджаныя варыянты нефармальнага навучання ўключаюць унутрыкарпаратыўныя трэнінгі, пры дапамозе якіх кампаніі паляпшаюць і ўдасканальваюць навыкі сваіх супрацоўнікаў (напрыклад, навыкі ў сферы інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогіяў), структураванае онлайн-навучанне (напрыклад, карыстанне адкрытымі адукацыйнымі рэсурсамі) і курсы арганізацыяў грамадзянскай супольнасці для сваіх членаў, мэтавых груп або шырокай грамадскасці (Рэкамендацыя Савета ЕС 2012/С 398/01).

**Пагадненне пра навучанне/ Learning Agreement** - афіцыйна заверанае пагадненне трох бакоў, якія ўдзельнічаюць у праграме мабільнасці: студэнта, адукацыйнай установы, якая яго накіроўвае на праграму, і адукацыйнай установы ці арганізацыі/таварыства, якое яго запрашае. Пагадненне заклікана палягчаць арганізацыю праграмы акадэмічнай мабільнасці і яе прызнанне. Яно падпісваецца трыма бакамі да пачатку перыяду мабільнасці і мае на мэце даць студэнту пацверджанне таго, што крэдыты, паспяхова ім засвоеныя ў перыяд мабільнасці, будуць прызнаныя.

**Пашпарт мабільнасці студэнта "Еўрапас"/Europass Mobility** уяўляе сабой камплект з пяці дакументаў (рэзюмэ, моўны пашпарт, пашпарт мабільнасці "Еўрапас", Дадатак да

сертыфіката і Дадатак да дыплома). Гэтыя дакументы спрыяюць таму, каб набытыя веды і кваліфікацыі студэнта лёгка прачытваліся і прызнаваліся па ўсёй Еўропе. Пашпарт мабільнасці засведчвае веды і навыкі, набытыя ў іншай еўрапейскай краіне, і запаўняецца адукацыйнымі арганізацыямі, якія ўдзельнічаюць у праграме мабільнасці студэнта (г.зн. адукацыйная арганізацыя, якая накіроўвае студэнта на навучанне, і арганізацыя, якая яго запрашае).

**Перанос (крэдытаў)/Transfer (of credits)** - працэс прызнання крэдытаў, прысуджаных у адным кантэксце (праграма, адукацыйная ўстанова), у іншым фармальным адукацыйным кантэксце з мэтай атрымання кваліфікацыі. Крэдыты, зробленыя студэнтамі ў адной праграмы, могуць быць перанесеныя з дадзенай адукацыйнай арганізацыі ў рамкі іншай для іх назапашвання ў той праграме, якая рэалізуецца гэтай жа або іншай адукацыйнай установай. Перанос крэдытаў - ключавы інструмент для паспяховай акадэмічнай мабільнасці. Навучальныя ўстановы, факультэты, падраздзяленні і кафедры могуць заключаць пагадненні, якія гарантуюць аўтаматычнае прызнанне і перанос крэдытаў.

**Перанос крэдытаў/Credit transfer** - працэс, які дазваляе прызнаваць і залічваць крэдыты, прысуджаныя адной ВНУ, у адпаведнасці з патрабаваннямі праграмы іншай ВНУ. Таксама гэты працэс дазваляе залічваць крэдыты, атрыманыя па адной праграме, для павышэння статуса студэнта ў іншай адукацыйнай праграме.

**Пераход на наступны курс/узровень/Progression** - працэс, які забяспечвае студэнта ведамі і навыкамі для перахода з аднаго кваліфікацыйнага этапа на наступны і забяспечвае доступ да адукацыйных праграм, якія прыводзяць да больш высокіх узроўняў кваліфікацыі.

**Правілы перахода на наступны курс/узровень/Progression rules** - комплекс правіл, якія вызначаюць для студэнтаў умовы перахода на наступны курс/узровень у рамках адной кваліфікацыі і ў кірунку іншых кваліфікацыяў.

**Працавыдаткі/Workload** - прыблізны разлік часу, які тыпова патрабуецца навучэнцу для выканання ўсіх відаў навучальнай дзейнасці, такіх як лекцыі, семінары, праекты, практычныя заданні, стажыроўкі, самастойная праца, якія патрабуюцца для дасягнення зададзеных рэзультатаў навучання ў фармальным навучальным кантэксце. Адпаведнасць працавыдаткаў аднаго года навучання па поўнай форме 60-ці крэдытам часта атрымлівае афіцыйнае замацаванне ў адпаведных нацыянальных нарматыўна-прававых актах. У большасці выпадкаў, працавыдаткі студэнтаў вар'іруюць ад 1500 да 1800 гадзін на адзін навучальны год, што азначае адпаведнасць аднаго крэдыту 25 - 30 гадзінам навучальнай працы. Варта ўдакладніць, што дадзеныя лічбы адлюстроўваюць тыповыя працавыдаткі, таму для кожнага навучэнца фактычны час дасягнення ім рэзультатаў навучання будзе розным.

**Прызнанне (акадэмічнае прызнанне)/Recognition (academic recognition)** - зацвярджэнне курсаў, кваліфікацыяў або дыпломаў адной (нацыянальнай або замежнай) адукацыйнай арганізацыі іншай адукацыйнай арганізацыяй з мэтай допуску студэнта да далейшага навучання. Мэтай акадэмічнага прызнання можа быць таксама працяг акадэмічнай кар'еры ў іншай адукацыйнай установе, а ў некаторых выпадках і доступ да рынка працы

(акадэмічнае прызнанне з прафесійнай мэтай). У рамках Еўрапейскай прасторы вышэйшай адукацыі разглядаюцца тры асноўныя ўзроўні прызнання, а таксама адпаведныя гэтым узроўням інструменты (згодна з Лісабонскай канвенцыяй аб прызнанні і з Балонскай дэкларацыяй):

1) прызнанне кваліфікацыяў, уключаючы папярэдняе навучанне і прафесійны досвед, якія дазваляюць паступаць/паўторна паступаць у ВНУ;

2) прызнанне кароткіх перыядаў навучання (акадэмічная мабільнасць), асноўным інструментам якіх з'яўляецца ECTS;

3) прызнанне поўных навуковых ступеняў, асноўным інструментам якіх з'яўляецца Дадатак да дыплома (Vlăsceanu і інш., 2004 г.).

**Прызнанне крэдытаў/Recognition of credits** - працэс, з дапамогай якога адукацыйная арганізацыя афіцыйна пацвярджае, што рэзультаты навучання, дасягнутыя і ацэненыя іншай адукацыйнай арганізацыяй, задавальняюць, цалкам або часткова, патрабаванням канкрэтнай праграмы, яе кампанента або кваліфікацыі.

**Прызнанне нефармальнага і спантаннага навучання/ Recognition of non-formal and informal learning** - працэс, у рамках якога адукацыйная ўстанова афіцыйна пацвярджае, што рэзультаты навучання, дасягнутыя і ацэненыя ў іншым кантэксце (нефармальным або спантанным), задавальняюць, цалкам або часткова, патрабаванням канкрэтнай праграмы, яе кампанента або кваліфікацыі.

**Прызнанне папярэдняга навучання і досведу/Recognition of prior learning and experience** - юрыдычнае зацвярджэнне рэзультатаў навучання, дасягнутых у рамках фармальнага, нефармальнага або спантаннага навучання да моманту звароту за юрыдычным зацвярджэннем (Рэкамендацыя Савета ЕС 2012/С 398/01).

**Прызнанне прафесійных кваліфікацыяў/Recognition of professional qualifications** - Дырэктыва 2005/36/ЕС усталёўвае для дзяржаў - членаў ЕС правілы пошуку ці заняткаў рэгуляванай прафесіяй пасля атрымання пэўных прафесійных кваліфікацыяў. Дырэктыва патрабуе ад дзяржаваў-членаў ЕС афіцыйнага прызнання прафесійных кваліфікацыяў, набытых іх уладальнікам у іншай дзяржаве-члене ЕС. Гэта дазваляе ўладальніку названых кваліфікацыяў займацца адпаведнай прафесійнай дзейнасцю ў дадзенай дзяржаве для пошука працы па прафесіі ці заняткаў прафесійнай дзейнасцю.
Прызнанне прафесійных кваліфікацыяў дзяржавамі-членамі ЕС дазваляе зацікаўленым бакам займацца сваёй прафесіяй ў дадзенай дзяржаве гэтак жа, як і ў дзяржаве, дзе была атрымана прафесія, і шукаць працу па прафесіі ў дадзенай дзяржаве, легальна і на тых жа ўмовах, што і яе грамадзяне.

**Прысуджэнне крэдытаў/Award of credits** - акт афіцыйнага прысваення студэнтам і іншым навучэнцам крэдытаў, якія адпавядаюць кваліфікацыі і/або яе часткам, калі студэнт дасягнуў пэўных рэзультатаў навучання. Нацыянальным уладам неабходна пазначаць установы, якія маюць права прысуджаць крэдыты. Крэдыты прысуджаюцца асабіста навучэнцам пасля завяршэння імі неабходных відаў навучальнай дзейнасці і дасягнення зададзеных рэзультатаў навучання, пра што сведчыць адпаведная адзнака. Калі студэнты і

іншыя навучэнцы дасягнулі рэзультатаў навучання ў іншым фармальным, нефармальным або спантанным адукацыйным кантэксце або ў іншыя тэрміны, крэдыты могуць быць прысуджаны шляхам ацэнкі і прызнання гэтых рэзультатаў навучання.

**Размеркаванне крэдытаў/Allocation of credits** - працэс прысваення кваліфікацыям, адукацыйным праграмам або асобным адукацыйным кампанентам пэўнай колькасці крэдытаў. Крэдыты размяркоўваюцца па цэласных кваліфікацыях або праграмах у адпаведнасці з нацыянальным заканадаўствам або практыкай, дзе гэта прымяняльна, і са спасылкай на нацыянальную і/або еўрапейскія рамкі кваліфікацыяў. Крэдыты прысуджаюцца за адукацыйныя кампаненты, такія як часткі курсаў/раздзелы, дысертацыі, навучанне і стажыроўкі на працоўным месцы. За аснову бяруцца 60 крэдытаў за адзін поўны год навучання па вочнай форме, адпаведна прыблізным працавыдаткам, неабходным для дасягнення зададзеных рэзультаў навучання па кожным кампаненце.

**Рамка кваліфікацыяў Еўрапейскай прасторы вышэйшай адукацыі/ Framework for Qualifications of the European Higher Education Area (QF-EHEA).** На Еўрапейскай прасторы вышэйшай адукацыі рамкі кваліфікацыяў дзейнічаюць на двух узроўнях. Усёабдымная рамка (QF-EHEA) была прынятая ў 2005 годзе, і ўсе краіны-члены абавязаліся распрацаваць нацыянальныя рамкі кваліфікацыяў, сумяшчальныя з ёй.

Нацыянальная рамка кваліфікацыяў вышэйшай адукацыі ахоплівае ўсе кваліфікацыі ў сістэме вышэйшай адукацыі. Яна адлюстроўвае верагодныя рэзультаты навучання для кваліфікацыі і тое, як навучэнцы могуць перамяшчацца паміж кваліфікацыямі.

Мэта дадзенай рамкі заключаецца ў аб'яднанні нацыянальных кваліфікацыяў вышэйшай адукацыі ва ўсеабдымную агульнаеўрапейскую рамку кваліфікацыяў. Унутры гэтай рамкі кваліфікацыі вызначаюцца ў адпаведнасці з ўзроўнямі складанасці (бакалаўр, магістр, дактарант). QF-EHEA вылучае чатыры асноўныя цыклы, якія апісаны ў Дублінскіх дэскрыптарах. Яны змяшчаюць абагульненыя вызначэнні тыповых верагодных дасягненняў і здольнасцяў, што суадносяцца са ступенню, якая прысуджаецца/дыпломам па завяршэнні кожнага цыклу. Кароткі, першы і другі цыклы таксама характарызуюцца дыяпазонамі крэдытаў.

**Рэзультат навучання/Learning outcome** - фармуліроўка ведаў, разумення і здольнасцяў навучэнца па завяршэнні працэсу навучання. Дасягненне рэзультатаў навучання павінна ацэньвацца згодна ўсталяваным працэдурам, заснаваным на дакладных і празрыстых крытэрах. Рэзультаты навучання прыпісваюцца канкрэтным адукацыйным кампанентам і праграмам у цэлым. Яны таксама выкарыстоўваюцца ў Еўрапейскай і нацыянальных рамках кваліфікацыяў для апісання ўзроўню індывідуальнай кваліфікацыі.

**Свабодны мабільны студэнт/Free mover** - студэнт, які ўдзельнічае ў акадэмічнай мабільнасці па-за межамі арганізаванай праграмы (напрыклад, праграмы “Эразмус+”). Свабодны мабільны студэнт сам/сама выбірае адукацыйную ўстанову, арганізуе запрашэнне ў яе і сваю праграму акадэмічнай мабільнасці ў гэтай установе.

**Сертыфікат пра праходжанне стажыроўкі/Work Placement Certificate** - дакумент, які выдаецца навучэнцу арганізацыяй/прадпрыемствам, дзе ён/яна праходзіў/-ла стажыроўку, па яе завяршэнні. Сертыфікат можа быць дапоўнены іншымі дакументамі,

такімі як рэкамендацыйныя лісты. Ён прызначаны для забеспячэння празрыстасці навучальнага працэса і пацверджання вартасці досведу, атрыманага студэнтам падчас стажыроўкі.

**Спантаннае навучанне/Informal learning** - навучанне, атрыманае ў выніку паўсядзённай дзейнасці, звязанай з працай, у сям'і, у вольны час. Такое навучанне не з'яўляецца арганізаваным або структураваным з пункту гледжання мэтаў, часу або навучальнага забеспячэння; яно можа быць нават ненаўмысным з пункту гледжання навучэнца. У якасці прыкладаў спантаннага навучання можна прывесці: навыкі, атрыманыя ў выніку жыццёвага і працоўнага досведу, навыкі ў галіне мэнэджмэнту праектаў, навыкі і веды інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогіяў, атрыманыя ў працэсе асноўнай працы; вывучаныя мовы і навыкі міжкультурнага ўзаемадзеяння, атрыманыя падчас пражывання ў іншай краіне; навыкі ў галіне IT, атрыманыя па-за межамі працы; навыкі, атрыманыя падчас валанцёрскай дзейнасці, заняткаў мастацтвам, культурнай дзейнасцю, спортам, працай з моладдзю і ў выніку выканання хатніх абавязкаў, напрыклад, догляду дзіцяці (Рэкамендацыя Савета ЕС 2012/С 398/01).

**Стажыроўка/Work placement** - перыяд запланаванага набыцця досведу па-за адукацыйнай арганізацыяй (напрыклад, на працоўным месцы), прызначаны для дапамогі студэнтам развіць пэўныя навыкі, веды або разуменне ў межах навучальнай праграмы.

**Студэнт/Student** - навучэнец, залічаны на фармальную адукацыйную праграму ў ВНУ. Калі ласка, звярніце ўвагу: пытанне пра тое, выкарыстоўваць у дадзеным Кіраўніцтве тэрмін “студэнт” ці “навучэнец”, падрабязна абмяркоўвалася ў Працоўнай групе і з зацікаўленымі бакамі. З-за агульнай тэндэнцыі да больш гнуткага падыходу ў забеспячэнні навучання, тэрмін "навучэнец" быў прызнаны найлепшым для ўжывання ў большасці кантэкстаў. Тым не менш, была дасягнутая дамоўленасць, што, паколькі ў большасці сістэм ВНУ па-ранейшаму арганізаваныя фармальныя праграмы з выразна акрэсленым кантынгентам студэнтаў, тэрмін "навучэнец" будзе выкарыстоўвацца для апісання ўсіх навучэнцаў вышэйшых навучальных установаў (вочнага ці дыстанцыйнага навучання, вячэрніх курсаў, навучання пры ўніверсітэце або на працоўным месцы, для атрымання кваліфікацыі або ў рамках самастойных адукацыйных кампанентаў або курсаў).

**Табліца размеркавання адзнак/Grade distribution table** - гэтая табліца дэманструе, якім чынам нацыянальная ці інстытуцыйная шкала адзнак прымяняецца ў пэўнай адукацыйнай установе - у адкрытым або абмежаваным доступе, і дазваляе параўноўваць статыстычнае размеркаванне адзнак з паралельнай рэферэнтнай групай іншай адукацыйнай установы. Табліца адлюстроўвае статыстычнае размеркаванне станоўчых адзнак (здавальняючых і вышэй) у кожнай прадметнай вобласці ў канкрэтнай ВНУ.

**Траекторыя навучання/ Learning pathway** - курс, абраны навучэнцам, які дазваляе яму/ёй назапашваць веды па нарастаючай ступені і набываць жаданы набор кампетэнцыяў. Траекторыя навучання можа быць “размечаная” з дапамогай інстытуцыйных кіраўніцтваў і інструкцыяў (уключаючы прызнанне папярэдняга навучання і досведу); розныя траекторыі навучання могуць у выніку прыводзіць да атрымання аднолькавай кваліфікацыі. Па сутнасці, канцэпцыя “траекторыі навучання” падкрэслівае выбар студэнта ў дасягненні жаданых адукацыйных мэтаў.

**Цыкл/Cycle** - адной з мэтаў Балонскай дэкларацыі ў 1999 годзе было “прыняцце сістэмы, якая грунтуецца на двух галоўных цыклах - базавым чатырохгадовым курсе (бакалаўрыяце) і наступным пасля бакалаўрыята курсе (магістратуры, аспірантуры)”. У 2003 годзе ў Балонскую структуру была ўключаная дактарантура, якую сталі называць “трэцім цыклам”. Такім чынам, Еўрапейская прастора вышэйшай адукацыі ўсталявала іерархію трох цыклаў вышэйшай адукацыі: першы, другі і трэці цыкл. Усе кваліфікацыі вышэйшай адукацыі ў рамках EHEA знаходзяцца ў межах гэтых трох цыклаў.

**Фармальнае навучанне/ Formal learning** - навучанне, якое звычайна рэалізуецца адукацыйнай установай, якая мае выразную структуру з пункту гледжання мэтаў і тэрмінаў навучання або навучальнага забеспячэння. Па завяршэнні навучання выдаецца афіцыйны дакумент ці сертыфікат. Фармальнае навучанне з'яўляецца наўмысным з пункту гледжання навучэнца.

**“Эразмус+”/ Erasmus+** - еўрапейская праграма па развіцці адукацыі, навучання, моладзі і спорту на 2014-2020 гады (Інструкцыя ЕС № 1288/2013).

## Дадатак 2

### Прыклады канвертацыі адзнак[6]

**1 - канвертацыя адзнак на аснове дзвюх Табліц размеркавання адзнак для двух рэферэнтных групаў, якія належаць да розных нацыянальных сістэм ацэнкі:**

**Рэферэнтная група А у Італіі** (*здавальняючыя адзнакі ад 18 да 30 (“выдатна”)*)

*Рэферэнтная група/вобласць вывучэння*: код Міжнароднай стандартнай класіфікацыі адукацыі ISCED 023, Мовы

**Рэферэнтная група Б у Францыі** (*здавальняючыя адзнакі ад 10 да 20)*

*Рэферэнтная група/вобласць вывучэння*: код ISCED 023, Мовы




- **Парыжскі ўніверсітэт, Францыя, код ISCED 023, Мовы**
- **Рымскі ўніверсітэт, Італія, код ISCED 023, Мовы**

У гэтым выпадку, працэнтныя дыяпазоны адзнак перакрываюцца. Адукацыйная ўстанова, якая запрасіла студэнта, павінна вырашыць загадзя, ці будзе яна прымаць мінімальнае, сярэдняе ці максімальнае значэнне параўнальнай адзнакі з дыяпазонамі, якія перакрываюцца. Такім чынам, калі Рымскі ўніверсітэт загаддзя вырашыў, што ў ім будзе выкарыстоўвацца мінімальнае або сярэдняе значэнне параўнальнай адзнакі, адзнака студэнта будзе 27; а калі ўніверсітэт вырашыў, што будзе выкарыстоўваць максімум, то адзнака студэнта будзе 28.

[6] Калі ласка, звяртайцеся да вэб-сайта Кіраўніцтва ECTS па далейшыя прыклады: http://ec.europa.eu/education/resources/european-credit-transfer-accumulation-system_en .

**2 - канвертацыя адзнак на аснове дзвюх Табліц размеркавання адзнак для двух рэферэнтных групаў, якія належаць да розных нацыянальным сістэм ацэнкі:**

**Адукацыйная ўстанова: Універсітэт прыкладных навук FHV (Fachhochschule Vorarlberg), Аўстрыя** (*здавальняючыя адзнакі ад 1 да 4)*

*Рэферэнтная група/вобласць вывучэння*: код ISCED 071, Машынабудаванне і інжынерныя выдаткі

**Адукацыйная ўстанова: Гентскі ўніверсітэт, Бельгія** (*здавальняючыя адзнакі ад 10 да 20*)

*Рэферэнтная група/вобласць вывучэння*: код ISCED 071, Машынабудаванне і інжынерныя выдаткі

**Універсітэт прыкладных навук FHV, Аўстрыя**

| 4 “Станоўча” 10% | 3 “Здавальняюча” 19% | 2 “Добра” 37% | 1 “Выдатна” 34% |
|---|---|---|---|

| 10 | 11 | 12 | 13 | 14 | 15 | 16 | 17 | 18 19 20 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 14,61% | 13,08% | 14,80% | 14,35% | 13,43% | 11,96% | 8,71 % | | |

**Гентскі ўніверсітэт, Бельгія**

| 100% | 90% | 80% | 70% | 60% | 50% | 40% | 30% | 20% | 10% | 0% |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|

**- Універсітэт прыкладных навук FHV, Аўстрыя, код ISCED-F 071, Машынабудаванне і інжынерныя выдаткі**

**- Гентскі ўніверсітэт, Бельгія, код ISCED-F 071, Машынабудаванне і інжынерныя выдаткі**

| | |
|---|---|
| **17 - 5,15%** | **19 - 1,10%** |
| **18 - 2,55%** | **20 - 0,26%** |

У гэтым прыкладзе адзнака 2 (“Добра”) ВНУ ў Аўстрыі будзе канвертавацца ў адзнаку 13 у бельгійскай ВНУ. Адзнака 11 з ВНУ у Бельгіі будзе канвертавацца ў адзнаку 3 (“Здавальняюча”) у Аўстрыі. У гэтым выпадку абедзве ўстановы вырашылі выкарыстаць сярэдняе значэнне парадўнальных адзнак у працэнтных дыяпазонах, якія перакрываюцца.

## Дадатак 3

## Бібліяграфія


**Дакументы па Балонскім працэсе:**

“Рамка кваліфікацыяў Еўрапейскай прасторы вышэйшай адукацыі”. Даклад Балонскай рабочай групы па рамках кваліфікацыяў, апублікаваны Міністэрствам навукі, тэхналогіяў і інавацыяў, Капенгаген, люты 2005 г.:

http://www.ond.vlaanderen.be/hogeronderwijs/bologna/ documents/050218_QF_EHEA.pdf

“Балонская канферэнцыя. Выкарыстанне рэзультатаў навучання”. Эдынбург, 1-2 ліпеня 2004 г.: http://www.ehea.info/article-details.aspx?ArticleId=119

Балонская рамка і атэстацыя, 2008 г.: http://www.ehea.info/Uploads/QF/Bologna_Framework_and_Certification_revised_29_02_08.pdf

Берлінскае камюніке. “Ажыццяўляючы Еўрапейскую прастору вышэйшай адукацыі”. Камюніке Канферэнцыі міністраў, адказных за сферу вышэйшай адукацыі, Берлін, 19 верасня 2003 г.: http://www.ehea.info/Uploads/ about/Berlin_Communique1.pdf

Бухарэсцкае камюніке. “Рэалізаваць большую частку нашага патэнцыялу: кансалідацыя Еўрапейскай прасторы вышэйшай адукацыі”. Камюніке Канферэнцыі міністраў, адказных за сферу вышэйшай адукацыі, Бухарэст, 26-27 красавіка 2012 г.): http://www.ehea.info/Uploads/(1)/Bucharest%20Communique%202012(1).pdf

Еўрапейскія стандарты і кіруючыя прынцыпы па забеспячэнні якасці ў Еўрапейскай прасторы вышэйшай адукацыі: http://www.ehea.info/news-details.aspx?ArticleId=355

Еўрапейскі падыход да забеспячэння якасці сумесных праграм: https://eqar.eu/projects/joint-programmes.html

Даклад Рабочай групы па структурных рэформах Назіральнай групе па Балонскім працэсе. Рабочая група па структурных рэформах, Страсбург, Брусэль, Ватыкан, Варшава, 8 снежня 2014 г.: http://www.ehea.info/Uploads/ SubmitedFiles/12_2014/154923.pdf

**Афіцыйныя дакументы Еўрапейскага саюза:**

Рэкамендацыя Савета ЕС (2012/С398/01) па валідацыі нефармальнага і спантаннага навучання ад 20 снежня 2012 г.: http://eur-lex.europa.eu/ LexUriServ/LexUriServ.do?uri=OJ:C:2012:398:0001:0005:EN:PDF

Паведамленне Камісіі ЕС (COM 2001 678) ад 21 лістапада 2001 г.: “Рэалізаваць мару пра Еўрапейскую прастору бесперапыннага навучання”: http://eur-lex. europa.eu/LexUriServ/LexUriServ.do?uri=COM:2001:0678:FIN:EN:PDF

Дырэктыва Еўрапейскага парламента і Савета (2005/36/ЕС) па прызнанні прафесійных кваліфікацыяў ад 7 верасня 2005 года: http://eur-lex.europa.eu/legal-content/EN/TXT/

PDF/?uri=CELEX:02005L0036-20140117&from=EN

Рэкамендацыя Еўрапейскага парламента і Савета ад 23 красавіка 2008 года па стварэнні Еўрапейскай рамкі кваліфікацыяў для бесперапыннага навучання: http://eur-lex.europa.eu/legal-content/EN/TXT/ PDF / = URI CELEX: 32008H0506 (01) і з = EN

Інструкцыя Еўрапейскага Парламента і Савета (ЕС № 1288/2013) ад 11 снежня 2013 года па стварэнні праграмы "Эразмус +": "Праграма ЕС па развіцці адукацыі, навучання, моладзі і спорту": http://eur-lex.europa.eu/LexUriServ/

LexUriServ.do?uri=OJ:L:2013:347:0050:0073:EN:PDF

**Вэбсайты і карысныя спасылкі:**

Сетка ENIC-NARIC: http://www.enic-naric.net/ (Сетка Еўрапейскіх інфармацыйных цэнтраў у Еўрапейскім рэгіёне і Нацыянальных інфармацыйных цэнтраў акадэмічнага прызнання ў Еўрапейскім саюзе: шлях да прызнання акадэмічных і прафесійных кваліфікацыяў)

Перыядычныя даклады па масавых адкрытых онлайн-курсах (MOOCs) Еўрапейскай асацыяцыі ўніверсітэтаў (EUA): http://www.eua.be/Libraries/Publication/MOOCs_Update_January_2014.sflb.ashx

"Даведайцеся больш пра ECVET: пытанні і адказы", Брусэль, 2011 г.: http://www.ecvet-team.eu/en/system/files/documents/14/questionsanswers-about-ecvet-21/04/2010.pdf

Гласарый Шатландскага Савета па фінансаванні: http://www.sfc.ac.uk/housekeeping/glossary/glossary.aspx

Еўрапейская сістэма крэдытаў для прафесійнай адукацыі і навучання (ECVET): http://ec.europa.eu/education/policy/vocational-policy/ecvet_en.htm

ЮНЕСКА, 2014 г., ISCED: Міжнародная стандартная класіфікацыя адукацыі: http://www.uis.unesco.org/Education/Pages/international-standardclassification-of-education.aspx

**Бібліяграфія:**


Bergan, S. (2007), Qualifications – Introduction to a concept (Council of Europe higher education series No.6): https://book.coe.int/eur/en/highereducation-and-research/3794-qualifications-introduction-to-a-conceptcouncil-of-europe-higher-education-series-no6.html

Bergan, S.; Rauhvargers, A. (eds.) (2005), Standards for recognition: the Lisbon recognition convention and its subsidiary texts (Council of Europe higher education series No. 3): http://www.coe.int/t/dg4/highereducation/ resources/heseries_en.asp

Biggs, J. (2003), Aligning teaching for constructing learning. Higher Education Academy: https://www.heacademy.ac.uk/aligning-teaching -constructing-learning

Bingham (1999), Guide to Developing Learning Outcomes

Cedefop (2009), European guidelines for Validating Non-formal and Informal learning; Luxembourg: http://www.cedefop.europa.eu/EN/ Files/4054_en.pdf

Cedefop (2011), Using learning outcomes: European Qualifications Framework Series: Note 4: http://www.cedefop.europa.eu/EN/Files/Using_ learning_outcomes.pdf

Colucci, E.; Davies, H.; Korhonen, J.; Gaebel, M. (2012): Mobility: Closing the gap between policy and practice; European University Association, Brussels: http://www.maunimo.be/images/Oslo/eua%20maunimo_web.pdf

Euridyce (2012), Recognition of Prior Non-Formal and Informal Learning in Higher Education. Overview: http://eacea.ec.europa.eu/education/eurydice/ documents/focus-on/152.pdf

Ferencz, L.; Hauschildt, K.; Garam, (eds.) (2013), Mobility Windows: From Concept to Practice, Bonn: Lemmens Medien GmbH (ACA Papers on International Cooperation in Education): http://www.aca-secretariat.be/fileadmin/aca_docs/images/members/ACA_2013_Mobility_windows.pdf

Gosling, D. and Moon, J. (2002), How to use learning outcomes and assessment criteria (Third Edition) London: (SEEC): http://www.aec-music. eu/userfiles/File/goslingmoon-learningoutcomesassessmentcriteria(2).pdf

Hunt, E. S.; Bergan, S. (eds.) (2010), Developing attitudes to recognition. Substantial differences in an age of globalisation (Strasbourg: Council of Europe Publishing. Council of Europe Higher Education Series No 13)

Lockhoff, J., Wegejis, B., Durkin, K., Wagenaar, R., González, J., Dalla Rosa, L., & Gobbi, M. (2011). A guide to formulating degree programme profiles. Including programme competences and programme learning outcomes. University of Deusto: http://core-project.eu/documents/Tuning%20G%20 Formulating%20Degree%20PR4.pdf

Moon, J. (2002), The Module and Programme Development Handbook, London: Kogan Page Limited: http://books.google.co.uk/ books?id=1uKQAgAAQBAJ&printsec=frontcover&source=gbs_ge_ summary_r&cad=0#v=onepage&q&f=false

Moon, J. (2004). Linking levels, learning outcomes and assessment criteria, Edinburgh: http://www.ehea.info/Uploads/Seminars/040701-02Linking_ Levels_plus_ass_crit-Moon.pdf

Moon, J. (2004). Some thoughts on learning outcomes – their roles and use in higher education in the UK; Presentation slides from the 'Using Learning Outcomes' Conference, Edinburgh: http://www.ehea.info/Uploads/ Seminars/04070102Moon.pdf

Vlăsceanu L., et al. (2004), Quality Assurance and Accreditation: A Glossary of Basic Terms and Definitions, Papers on Higher Education, UNESCO- CEPES: http://siteresources.worldbank.org/INTAFRREGTOPTEIA/Resources/ UNESCO_Glossary_of_QA_and_Accreditation.pdf

**Рэзультаты праектаў:**

Кампетэнцыі ў галіне адукацыі і акадэмічнага прызнання (CoRe): http://www.core-project.eu/

EAR Manual - Праект Еўрапейскай зоны прызнання:

http://www.eurorecognition.eu/emanual/

Інструменты якасці ў мабільнай праграме “Эразмус” (праект EMQT), фінансаваны сумесна з Праграмай ЕС па навучанні на працягу жыцця: https://lirias.kuleuven.be/handle/123456789/403903

Еўрапейскі праект па канверсіі сістэмы адзнак (EGRACONS), фінансаваны сумесна з Праграмай ЕС па навучанні на працягу жыцця: http://egracons.eu/

Еўрапейскі даведнік па акадэмічным прызнанні для вышэйшых навучальных установаў: http://eurorecognition.eu/Manual/EAR%20HEI.pdf

Праект “Камбінаваныя (аб’яднаныя) акадэмічныя ступені ад А да Я”, фінансаваны сумесна з праграмай ЕС “Эразмус Мундус”: http://www.nuffic.nl/en/expertise/jdaz

Праект MAUNIMO, “Адлюстраванне на карце акадэмічнай мабільнасці адукацыйнага персанала і студэнтаў”, 2015 г.:

http://www.maunimo.eu/index.php/the-maunimo-project

Партал па сумесных праграмах Еўрапейскага кансорцыума па акрэдытацыі вышэйшай адукацыі (ECA), фінансаваны сумесна з праграмай ЕС “Эразмус Мундус”: http://ecahe.eu/w/index.php/Portal:Joint_programmes

Практычнае кіраўніцтва па распрацоўцы акадэмічных праграм для атрымання ступеняў з комплексным падыходам да міжнацыянальнай мабільнасці. Праект MOCCA (Мадэль для асноўных курсаў навучання з комплексным падыходам да міжнацыянальнай мабільнасці), фінансаваны сумесна з адукацыйнай ініцыятывай ЕС “Праграма “Сакрат””.

Інструментарый для навучання, арыентаванага на студэнтаў, распрацаваны для супрацоўнікаў, студэнтаў і ўстановаў вышэйшай адукацыі. Праект Еўрапейскага студэнцкага саюза, фінансаваны сумесна з Праграмай ЕС па навучанні на працягу жыцця, Брусэль: http://www.esu-online.org/

Праект Акадэміі рэгулявання (Рэгуляванне і паляпшэнне функцыянавання структураў вышэйшай адукацыі ва ўсім свеце): http://tuningacademy.org/

## Дадатак 4

### Прыклады профіляў навучальных праграм і фармуляванне рэзультатаў навучання

Прыведзеныя ніжэй прыклады дэманструюць розныя спосабы апісання профіляў адукацыйных праграм і/або асобных частак/раздзелаў курсаў. Яны не з'яўляюцца адзіна магчымымі мадэлямі апісанняў, а прыведзеныя ў якасці ўзораў, у якіх выконваюцца ўсе рэкамендацыі Кіраўніцтва па ECTS.

### Прыклад I

**Апісанне адукацыйнай праграмы першага цыкла па спецыяльнасці “Інжынер па абслугоўванню вылічальнай тэхнікі” і рэзультаты навучання па частцы/раздзеле курса “Фізіка 1”**

**Профіль адукацыйнай праграмы**

Праграма падрыхтоўкі бакалаўраў па спецыяльнасці “Інжынер па абслугоўванню вылічальнай тэхнікі” рыхтуе студэнтаў з глыбокім узроўнем ведаў, заснаваных на майстэрстве ў розных машынабудаўнічых абласцях і вялікім досведзе ў сферы кампутарных тэхналогіяў. Дадзены курс прызначаны для фарміравання навыкаў і ведаў распрацоўкі, устаноўкі і падтрымкі кампутарных сістэм і сетак, праграмнага забеспячэння, прамысловых сістэм вытворчасці, інфармацыйных сістэм мэнэджмэнту, комплексных сістэм апрацоўкі і кіравання дадзенымі. Выпускнік па спецыяльнасці “Інжынер па абслугоўванню вылічальнай тэхнікі”, у першую чаргу, з'яўляецца інжынерам, а таксама добрым спецыялістам у сферы IT.

**Асноўныя рэзультаты навучання**

Выпускнікі адукацыйнай праграмы першага цыкла па спецыяльнасці “Інжынер па абслугоўванню вылічальнай тэхнікі” будуць здольныя распрацоўваць, усталёўваць і падтрымліваць кампутарныя сістэмы і сеткі, праграмнае забеспячэнне, прамысловыя сістэмы вытворчасці, інфармацыйныя сістэмы кіравання, комплексныя сістэмы апрацоўкі і кіравання дадзенымі.

**Прафесійны профіль выпускнікоў**

Выпускнікі з дадзенай ступенню маюць кваліфікацыю для працы ў кампаніях інфармацыйных тэхналогіяў, якія спецыялізуюцца на вытворчасці апаратнага і праграмнага забеспячэння, на прадпрыемствах, звязаных з прамысловымі сістэмамі вытворчасці, а таксама на ўсіх відаў прадпрыемстваў, якія выкарыстоўваюць інфармацыйныя сістэмы і кампутарныя сеткі для працэсаў унутранай вытворчасці і мэнэджмэнту. Яны таксама змогуць працаваць як фрылансеры або незалежныя падрадчыкі (у асноўным, для распрацоўкі лічбавых сістэм кіравання асобнымі кампутарнымі праграмамі). Акрамя таго, дадзеная праграма прадаставіць студэнтам усе неабходныя веды і навыкі для далейшага акадэмічнага росту ў галінах кампутарнай і вылічальнай тэхнікі і аўтаматызацыі.

## Асобная частка/раздзел курса

**Частка/раздзел курса: Фізіка №1**

**Рэзультаты навучання**

Студэнты, якія паспяхова прайшлі дадзены курс, будуць здольныя засвоіць асноўныя паняцці фізікі, ад механікі Ньютана да класічнай тэорыі электрамагнетызму. Выпускнік будзе здольны прадэманстраваць грунтоўныя веды законаў захавання энергіі і ўраўненняў Максвелла, што дазволіць яму/ёй вырашаць базавыя праблемы дынамікі механічных сістэм і канфігуравання палёў у тэорыі электрамагнетызму.

**Метады і крытэры ацэнкі**

***Метады ацэнкі***

- Выніковы пісьмовы іспыт
- Выніковы вусны іспыт

Здача пісьмовага іспыту з'яўляецца абавязковай умовай для доступу да выніковага вуснага іспыту. Адзнака 15 з 30 магчымых балаў - прахадны бал для пісьмовага іспыту. Каля 70% выніковай адзнакі залежыць ад здачы вуснага іспыту.

***Крытэры ацэнкі***

Студэнт будзе ацэньвацца па здольнасці прадэманстраваць разуменне асноўнага зместу курса і па ўменні прымяняць атрыманыя веды для вырашэння канкрэтных задач. Падчас пісьмовага іспыту (3 гадзіны, 2 задачы) студэнты павінны прадэманстраваць здольнасць прымяніць асноўныя паняцці для знаходжання правільнага рашэння тыповых задач, кожная з якіх уключае па тры пытанні. Падчас вуснага іспыту (0,5 гадзіны) студэнты павінны прадэманстраваць здольнасць прымяняць атрыманыя веды на практыцы, а таксама прымяніць на практыцы, з крытычным іх асэнсаваннем, важнейшыя законы фізікі, разгледжаныя ў рамках дадзенага курсу.

**Прыклад II**

## Апісанне адукацыйнай праграмы першага цыкла па спецыяльнасці “Гісторыя” і рэзультаты навучання па частцы/раздзеле курса "Сучасная гісторыя”

### Профіль адукацыйнай праграмы на атрыманне ступені

Праграма падрыхтоўкі спецыялістаў па накірунку “Гісторыя” мае на мэце практычную падрыхтоўку спецыялістаў у галіне гістарычных даследаванняў, дзякуючы грунтоўным ведам ключавых гістарыяграфічных тэм і практыкі тэматычных дыскусіяў, а таксама на аснове валодання метадалогіяй апрацоўкі і інтэрпрэтацыі гістарычных крыніц і здольнасці выкарыстоўваць у гістарыяграфічных дыскусіях выразны і дасціпны тэматычны лексікон. Працэс навучання арганізаваны ў выглядзе цыкла лекцыяў, семінараў, практычных і лабараторных заняткаў. Акрамя гэтага, студэнты могуць наведваць канферэнцыі, семінары і тэматычныя сустрэчы з мэтай удзелу ў навуковых дыскусіях на нацыянальным і міжнародным узроўні. Дадзеная праграма мае чатыры спецыялізацыі: Антычная гісторыя, гісторыя Сярэднявечча, гісторыя Новага часу і Найноўшая гісторыя.

### Ключавыя рэзультаты навучання

Выпускнікі адукацыйнай праграмы першага цыкла па спецыяльнасці “Гісторыя” змогуць прадэманстраваць крытычнае разуменне сувязі сучаснасці з мінулым, веданне і ўменне выкарыстоўваць асноўныя метады гістарычнага даследавання, здольнасць выяўляць істотную навуковую літаратуру, бібліяграфічныя і іншыя інфармацыйныя крыніцы пры вырашэнні гістарыяграфічнай задачы, здольнасць па-рознаму прадстаўляць рэзультаты даследаванняў у залежнасці ад мэтавай аўдыторыі. Выпускнікі павінны будуць прадэманстраваць веды і здольнасць выкарыстоўваць асноўныя інструменты іншых сацыяльных, гуманітарных і гістарычных навук, валодаць трывалымі ведамі па адной з гістарычных эпох (Антычнасці, Сярэднявеччы, Новай або Найноўшай гісторыі). Таксама выпускнік павінен валодаць мінімум адной мовай ЕС, у дадатак да італьянскай, а таксама базавымі навыкамі ў галіне інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогіяў - для пошуку і апрацоўкі гістарыяграфічных тэкстаў і дадзеных.

### Прафесійны профіль выпускнікоў

Выпускнікі з дыпломам першага цыкла па гісторыі змогуць займацца, у рамках працы ў дзяржаўных і прыватных арганізацыях, рознымі відамі дзейнасці, звязанай з каардынацыяй і правядзеннем гістарычных даследаванняў, аховай і ацэнкай культурнай спадчыны, асабліва ў дачыненні архіваў, бібліятэк і аб'ектаў матэрыяльнай культуры. Таксама сюды ўваходзіць дзейнасць у розных кантэкстах, звязаных з гістарычнай культурай і яе папулярызацыяй, праца ў выдавецкай сферы і ў журналістыцы, у сферы дзяржаўнага кіравання і міжнародных культурных адносін. Выпускнікі могуць паступіць на праграмы падрыхтоўкі выкладчыкаў літаратуры і гісторыі. Яны могуць прэтэндаваць на працу ў дзяржаўным сектары ў сферы адукацыі, у сферы кіравання архівамі, у бібліятэках і музеях, працу з парламенцкай дакументацыяй і з інфармацыйнымі паслугамі, дыпламатычную дзейнасць.

## Асобная частка/радзел курса

**Сучасная гісторыя**

**Рэзультаты навучання**

Студэнт, які паспяхова завяршыў дадзены курс, зможа прадэманстраваць грунтоўныя веды ў ключавых працэсах і падзеях еўрапейскай і сусветнай гісторыі, з часоў першых геаграфічных адкрыццяў да перыяду напалеонаўскіх войнаў. Акрамя таго, студэнт будзе ў стане прадэманстраваць самыя сучасныя і канкрэтныя веды па гісторыі заваявання Іспанскай імперыі ў Міжземнаморскім і Атлантычным рэгіёнах, а таксама звязаных з імі гістарыяграфічных пытанняў. Выпускнік зможа чытаць і аналізаваць тэксты і дакументы гэтага перыяду.

**Метады і крытэры ацэнкі**

***Метады ацэнкі***

- Выніковы вусны іспыт
- Рэгулярныя пісьмовыя тэсты

Студэнты, якія рэгулярна наведваюць лекцыі і бяруць удзел у тэматычных дыскусіях і аналізе гістарычных дакументаў, могуць быць ацэненыя з дапамогай рэгулярных пісьмовых іспытаў у форме эсэ, якія звычайна складаюцца з пісьмовых адказаў на пытанні па тэме курсу. Іх вынікі будуць ацэньвацца і прымацца ў разлік пры выстаўленні адзнак на выніковым вусным іспыце. Тыя, хто не зможа наведваць лекцыі, будуць ацэньвацца толькі праз выніковы вусны іспыт.

***Крытэры ацэнкі***

Тэрміны і форма пісьмовых іспытаў абмяркоўваюцца са студэнтамі, якія наведваюць лекцыі, падчас саміх лекцыяў. Выніковы вусны іспыт заклікапы выявіць здольнасці студэнтаў прадэманстраваць веданне матэрыялу курса і крытычна і ўсебакова абмяркоўваць абраныя манаграфіі.

## Прыклад III
## Апісанне адукацыйнай праграмы першага цыкла па спецыяльнасці “Бізнес-адміністраванне”

**Назва праграмы**: Бізнес-адміністраванне

**Узровень праграмы**: Прафесійная праграма падрыхтоўкі на ступень бакалаўра

**Кваліфікацыя, якая прысвойваецца**: Мэнэджэр на прадпрыемствах і ўстановах

**Узровень кваліфікацыі:**

Пасля паспяховага засваення праграмы выпускнік атрымлівае прафесійны дыплом бакалаўра і кваліфікацыю па спецыяльнасці “Мэнэджэр на прадпрыемствах і ўстановах”, што адпавядае пятаму прафесійнаму кваліфікацыйнаму ўзроўню і шостаму ўзроўню Латышскай рамкі кваліфікацыяў (LQF), а таксама шостаму ўзроўню Еўрапейскай рамкі кваліфікацыяў (EQF).

**Канкрэтныя патрабаванні да паступлення:**

Залічэнне на навучанне па праграме ажыццяўляецца ў адпаведнасці з Палажэннем аб прыёме на курс, якое зацвярджаецца Сенатам перад пачаткам кожнага навучальнага года.

**Працэдуры прызнання папярэдняга навучання:**

10 студзеня 2012 года Кабінет міністраў прыняў "Правілы і працэдуры прызнання рэзультатаў папярэдняга навучання або прафесійнага досведу", № 36 у якасці прававой асновы для прызнання нефармальнага і спантаннага навучання, якое заклікана прасоўваць і ўкараняць канцэпцыю навучання на працягу жыцця. Працэсуальныя дакументы былі распрацаваныя вышэйшай школай і ўхваленыя Сенатам. Для развіцця навучання на працягу ўсяго жыцця распрацоўваюцца мерапрыемствы і адукацыйныя праграмы на аснове рэзультатаў навучання, што забяспечвае празрыстасць і параўнальнасць рэзультатаў. Сістэма ECTS ужываецца для навучання на працягу ўсяго жыцця. Агульныя працэдуры прызнання нефармальнага і спантаннага навучання падрабязна тлумачацца ў "Правілах і працэдурах прызнання папярэдняга навучання”, ухваленых Сенатам у 2012 годзе. “Правілы і працэдуры..” змяшчаюць тлумачэнні самога працэсу, крытэраў і прынцыпаў прызнання папярэдняга навучання.

**Прыклад III**
**Кваліфікацыйныя патрабаванні і палажэнні:**

Для атрымання прафесійнай ступені бакалаўра і адпаведнай кваліфікацыі, студэнт павінен выканаць наступныя патрабаванні праграмы:

• Дасягнуць агульных і прадметных рэзультатаў навучання па курсе

• Дасягнуць дадатковых/факультатыўных рэзультатаў навучання па курсе

• Прайсці стажыроўку ў кампаніі

• Падрыхтаваць і абараніць дыпломную працу на ступень бакалаўра

**Профіль адукацыйнай праграмы**:

Адукацыйная праграма забяспечвае студэнтаў ведамі, навыкамі і здольнасцямі, неабходнымі кампетэнтным мэнэджэрам у зменлівых сацыяльна-эканамічных умовах. Студэнты павінны ўмець прымяняць свае веды ў кіраванні працэсамі, для вырашэння канкрэтных праблем і ў прыняцці рашэнняў. Прысуджэнне кваліфікацыі пацвярджае, што выпускнікі здольныя вызначыць і сфармуляваць асноўныя прынцыпы дзейнасці свайго прадпрыемства, планаваць і кіраваць працай персаналу ў адпаведнасці з мэтамі дзейнасці прадпрыемства, працаваць з людзьмі і ўмець адаптавацца да хуткіх зменаў у сферы менеджменту. Дадзеныя здольнасці і навыкі адпавядаюць прысуджэнню 5-ай катэгорыі прафесійнага кваліфікацыйнага ўзроўню прафесійнага стандарта “Мэнэджэр на прадпрыемствах і ўстановах”, які адпавядае шостаму ўзроўню Латвійскай рамкі кваліфікацыяў і шостаму ўзроўню Еўрапейскай рамкі кваліфікацыяў. Навучэнцы могуць зарабіць 240 (160 латвійскіх) крэдытаў ECTS падчас навучання ў кантэксце міжнароднага адукацыйнага асяродзя. Таксама студэнты могуць прайсці навучанне па праграме міжнароднага абмену “Эразмус+”, вучыцца ў высокапрафесійных выкладчыкаў міжнароднага ўзроўню з універсітэтаў-партнёраў. Арганізацыя і кіраванне стажыроўкамі ўваходзіць у праграму.

### Прыклад III

**Асноўныя рэзультаты навучання:**

У рамках дадзенай праграмы вызначаныя наступныя рэзультаты навучання:

- Здольнасць засвойваць заканамернасці эканамічнага развіцця, працэсы ў нацыянальнай эканоміцы і тлумачыць іх, прымаць удзел у змястоўных дыскусіях і прымаць рашэнні з улікам зменлівых абставін.
- Здольнасць прымяняць атрыманыя веды ў вобласці кіравання прадпрымальніцкай дзейнасцю адпаведна практычным і стратэгічным мэтам, адсочваць працэс рэалізацыі пастаўленых задач, прымаць рашэнні і карэктаваць працу для аптымізацыі практычнай і стратэгічнай дзейнасці.
- Здольнасць прафесійна займацца прадпрымальніцтвам, фармуляваць і аналізаваць інфармацыю і сумежныя праблемы, знаходзіць рашэнні ў рамках прафесіі, выкарыстоўваючы навуковы падыход.
- Здольнасць дзейнічаць згодна этычным прынцыпам, браць адказнасць за ўплыў прафесійнай дзейнасці на навакольнае асяроддзе і грамадства.
- Здольнасць асэнсавана і з задавальненнем браць на сябе адказнасць падчас працы ў камандзе і дэлегіравання паўнамоцтваў іншым яе членам, каардынаваць выкананне задач, эфектыўна планаваць і арганізоўваць працу іншых членаў каманды, а таксама спраўляцца з канфліктнымі сітуацыямі.

**Прафесійны профіль выпускнікоў з прыкладамі:**

Выпускнікі дадзенай праграмы працуюць як у дзяржаўных, так і ў прыватных кампаніях і ўстановах, у кампаніях малога і сярэдняга бізнэсу на пасадзе мэнэджэраў і кіраўнікоў аддзелаў.

**Доступ да працягу навучання:**

Выпускнікі праграмы падрыхтоўкі прафесійных бакалаўраў маюць права працягваць навучанне па праграме падрыхтоўкі магістраў.

## Асобная частка/радзел курса

**Спажывецкія паводзіны на сусветных рынках**

**Рэзультаты навучання:**

- Студэнт здольны тлумачыць і прымяняць ключавыя тэрміны, азначэнні і канцэпцыі спажывецкіх паводзін.
- Студэнт можа аналізаваць тэндэнцыі спажывецкіх паводзінаў і прымяняць іх да канкрэтнага спажывецкага рынка.
- Студэнт здольны апісаць фактары, якія ўплываюць на рашэнне спажыўца па набыцці прадукта.
- Студэнт здольны ацаніць эфектыўнасць разнастайных рэкламных аб'яваў і іншай дзейнасці па прамоцыі прадуктаў, а таксама іх уплыў на спажывецкія паводзіны.

**Прыклад IV**

**Апісанне адукацыйнай праграмы другога цыкла па спецыяльнасці "Перадавыя метады спектраскапіі ў хіміі" і рэзультаты навучання па частцы/раздзеле курса "Масс-спектраскапія"**

**Профіль адукацыйнай праграмы**

Праграма падрыхтоўкі магістраў забяспечвае студэнтаў неабходнымі ведамі і навыкамі для таго, каб стаць экспертамі ў сваёй вобласці і сфарміраваць навыкі, якія прызнаюцца ва ўсім свеце і падрыхтуюць іх да паступлення ў дактарантуру і/або да прафесійнай кар'еры ў вобласці хімічнага аналізу і вызначэння параметраў структуры матэрыялаў. Дзякуючы праграмам мабільнасці, студэнты змогуць засвоіць агульную базавую праграму ў розных ВНУ Еўропы, у дадатак да высокага ўзроўню спецыялізацыі і магчымасці выкарыстання найноўшых тэхналогіяў.

**Асноўныя рэзультаты навучання:**

Студэнты атрымаюць базавыя навыкі ў:

• хімічным аналізе

• вызначэнні параметраў структуры матэрыялаў

• стварэнні і мадэляванні малекул

• вызначэнні хуткіх рэакцыяў

• кантролі якасці

• ведах хімічных якасцяў матэрыялаў

Студэнты атрымаюць роднасныя навыкі ў:

• правядзенні даследчых праектаў

• прыняцці рашэнняў у сферы кіравання працэсамі

• засваенні замежных моваў (прэзентацыі навуковага праекта на ангельскай мове, у вуснай і пісьмовай форме)

• правядзенні праектаў на міжнародным узроўні

• геаграфічнай мабільнасці

## Асобная частка/радзел курса

**Перадавая спектраскапія ў хіміі**

Назва: Масс-спектраскапія (**прафесар XY**).

Код: ASC 01 - Ll - 1 семестр

ECTS: 5 крэдытаў

Абавязковая папярэдняя адукацыя: ступень бакалаўра па хіміі або эквівалент

**Апісанне курса**:

Курс ахоплівае аспекты малекулярнай масс-спектраметрыі, уключаючы самыя апошнія тэндэнцыі ў сферы распрацоўкі прылад, тэхнік і разумення масс-спектральных працэсаў. Праграма курса ўключае ў сябе вывучэнне метадаў прадстаўлення аналітычных пробаў, а таксама перавагі і недахопы кожнага з іх. У курсе таксама вывучаюцца розныя тыпы масс-спектрометраў, іх рабочыя прынцыпы і тэхнічныя характарыстыкі, апісваюцца сучасныя праграмныя прадукты і онлайн-метады аналізу, залежнага ад дадзеных. Прыводзяцца прыклады прымянення метадаў масс-спектраметрыі ў розных хімічных абласцях.

**Задачы**:

Задачы дадзенага курса:

- Пашырыць і развіць веды асноваў тэарэтычных і інструментальных паняццяў, вывучаных у рамках праграмы бакалаўрыяту.
- Сфарміраваць кампетэнцыі і трывалыя веды ў вобласці масс-спектраметрыі.
- Выявіць сучасныя дасягненні ў прыборабудаванні і тэхніках масс-спектраметрыі.
- Вызначыць належны інструментар для працы з канкрэтнымі праграмамі.

## Асобная частка/радзел курса

**Рэзультаты навучання**:

Па завяршэнні дадзенага курса студэнт павінен умець:

- Вычарпальна і пераканаўча абмяркоўваць метады прадстаўлення пробаў у масс-спектрометр.
- Вызначаць метады іянізацыі, іх перавагі і недахопы.
- Крытычна ацэньваць і выбіраць лепшы з усіх наяўных тыпаў масс-спектрометраў.
- Абмяркоўваць выкарыстанне праграмнага забеспячэння для атрымання і аналізу дадзеных масс-спектраметрыі.
- Вызначаць найбольш прыдатны інструментар для канкрэтных прыкладанняў і апісваць узровень і абмежаванні дадзеных, атрыманых з іх дапамогай.
- Інтэрпрэтаваць дадзеныя масс-спектраметрыі і прадстаўляць высновы ў пісьмовай і вуснай форме.
- Тлумачыць неспецыялістам магчымасці выкарыстання масс-спектраметрыі для забеспячэння каштоўнаснай інфармацыі ў розныя вобласці хіміі і сумежных дысцыплін.

**Віды навучальнай дзейнасці**

- Лекцыі і калоквіўмы: 40 гадзін
- Навучанне, арыентаванае на студэнта: 90 гадзін
- Агульныя працавыдаткі студэнта: 130 гадзін

**Крытэры ацэнкі**

- Пісьмовы або вусны іспыт па заканчэнні навучання (кожны іспыт можа паўплываць на агульны рэзультат у памеры 100%).

**Бібліяграфія**:


- Е. Хофман, В. Струбан - Масс-спектраметрыя. Прынцыпы і прымяненне, Е.дэ Хофман і В.Строобант, Вілей, Чычэстар, 2001 г.

## Дадатак 5

### Прыклады рэзультатаў навучання

**Разбор узораў рэзультатаў навучання**

**Апісанне рэзультатаў навучання па праграме другога цыклу (прасунуты ўзровень, ступень магістра) па спецыяльнасці “Маркетынгавы аналіз/Аналіз рынкаў”**

**Рэзультат навучання 1. Кампетэнцыі ў аналізе рынкаў**

**РН 1.1.** Распрацоўка мадэляў складаных маркетынгавых рашэнняў на аснове тэорыяў кіравання ўзаемаадносінамі са спажыўцамі

**РН 1.2.** Інтэграцыя сістэм маркетынгавых рашэнняў у рэальным кантэксце арганізацыі

**РН 1.3.** Самастойны і крытычны аналіз сфераў, сумежных з бізнэсам, з выкарыстаннем глыбіннага аналізу дадзеных і інфарматыкі

**РН 1.4** Творчае прымяненне найноўшых метадаў глыбіннага аналізу дадзеных у сферах, сумежных з бізнэсам

**РН 1.5.** Творчае прымяненне найноўшых перадавых метадаў маркетынгавых даследаванняў у сферах, сумежных з бізнэсам

**Рэзультат навучання 2. Даследчыя кампетэнцыі**

**РН 2.1.** Выбарка і ацэнка метадаў глыбіннага аналізу дадзеных і статыстычных метадаў для найлепшага мадэлявання складаных рынкавых праблем

**РН 2.2.** Перавод складаных рынкавых праблем у сферу навуковага даследвання

**РН 2.3.** Прымяненне рэзультатаў вывучэння міжнароднай рэцэнзаванай навуковай літаратуры (часопісаў) для вырашэння складаных рынaчных праблем

**РН 2.4.** Ацэнка рэзультатаў уласных даследаванняў праз вывучэнне навуковай літаратуры ў сферы маркетынгу

**РН 2.5** Выкарыстанне структуры комплексных дадзеных

**Рэзультат навучання 3. Інтэлектуальныя кампетэнцыі**

**РН 3.1.** Засваенне розных моваў праграмавання і інструментаў праграмнага забеспячэння ў якасці сродкаў стварэння мадэляў складаных маркетынгавых рашэнняў

**РН 3.2.** Неперарыўнае развіццё ўласных кампетэнцыяў у сферы структурнага аналізу

**РН 3.3.** Самастойны выбар правільных рашэнняў адносна складаных маркетынгавых праблем

**РН 3.4.** Узгадненне меркаванняў розных зацікаўленых бакоў для прыняцця адзінага маркетынгавага рашэння

**Рэзультат навучання 4. Кампетэнцыі супрацоўніцтва і камунікацыі**

**РН 4.1.** Навукова выверанае рашэнне для справаздачы па істотных рэзультатах уласных маркетынгавых даследаванняў

**РН 4.2.** Выкананне рэальнага бізнес-праекта ў складзе міжнароднай паміждысцыплінарнай каманды з рознымі узроўнямі досведу

**РН 4.3.** Падрыхтоўка прафесійнай пісьмовай справаздачы па складаных маркетынгавых пытаннях і іх вырашэнні

**РН 4.4.** Падрыхтоўка прафесійнай вуснай справаздачы па складаных маркетынгавых пытаннях і іх вырашэнні

**РН 4.5.** Прадстаўленне маркетынгавых рашэнняў прафесіяналам і неспецыялістам на ангельскай мове

**РН 4.6.** Уласны істотны ўнёсак у рэальны бізнэс-праект

**Рэзультат навучання 5. Сацыяльныя кампетэнцыі**

**РН 5.1.** Занясенне рэзультатаў найноўшых распрацовак у інфармацыйны фонд

**РН 5.2.** Адаптацыя мадэляў рашэнняў да абмежаванняў і задач бізнесу

**Больш інфармацыі па ўсіх тэмах, датычных Еўрасаюза, можна знайсці па Інтэрнэт-адрасе: http://europa.eu**

**Люксембург, Выдавецкая служба ЕС, 2015 г.**
**Праграма “Эразмус +”**

**Даведайцеся больш па адрасе:**

ec.europa.eu/education/tools/

ects_en.htm